Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

10 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
СЕРАДА
№ 193
(26058)
Кошт 440 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага: «прамая лінія»

ПЕНСІЙНАЯ «РАСКЛАДКА»

Як і калі праводзіцца перараразлік пенсій, хто мае права на надбаўкі і павышэнні, што чакае пенсіянераў-датэрміноўшчыкаў, якія змяненні могуць адбыцца ў пенсійным заканадаўстве, а таксама асаблівасці вылічэння стажу і заробку — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» «Звязды» з удзелам **начальніка Галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.**

Такім чынам, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» адбудзецца **сёння з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8017) 292 38 21 і 292 38 92.**

Падпіска-2008

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (у рублях)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**8800**	**26400**	**52800**
63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8300**	**24900**	**49800**
63858 (ведамасны)	**14000**	**42000**	**84000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**12800**	**38400**	**76800**

ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» «Да запатрабавання» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)

63850 (індывідуальны)	**7460**	**22380**	**44760**
63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**6990**	**20970**	**41940**
63858 (ведамасны)	**9938**	**29814**	**59628**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**9431**	**28293**	**56586**

Беларускія банкі ў студзені—верасні прадаставілі Br4,8 трлн інвестыцыйных крэдытаў

Аб гэтым 9 кастрычніка праінфармаваў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч.

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, Прэзідэнту было даложана аб выкананні Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі за 9 месяцаў 2007 года.

У студзені—верасні банкаўская сістэма краіны выканала ўсе запланаваныя паказчыкі, забяспечана фінансавая стабільнасць і стабільнасць нацыянальнай валюты. Так, абменны курс беларускага рубля да долара ЗША на 1 кастрычніка склаў Br2149 за 1 долар ЗША, знізіўшыся за студзень—верасень на 0,4 працэнта, што знаходзіцца ў запланаваных межах.

Пётр Пракаповіч таксама паведаміў, што апераджальнымі тэмпамі ў рэспубліцы ідзе крэдытаванне банкамі рэальнага сектара эканомікі. За 9 месяцаў гэтага года аб'ём выдадзеных банкамі крэдытаў перасягнуў прагнозны паказчык па году, у тым ліку па інвестыцыйных крэдытах. У прыватнасці, планавалася, што ўсяго ў гэтым годзе банкі прадаставяць Br3,9 трлн інвестыцыйных крэдытаў, але ўжо па выніках студзеня—верасня гэты паказчык дасягнуў Br4,8 трлн Актыўна ідзе крэдытаванне па іншых напрамках.

Акрамя таго, Прэзідэнту было даложана аб тым, што ўсе дзяржаўныя праграмы крэдытуюцца ў поўным аб'ёме.

Гаворачы аб працэнтнай палітыцы Нацыянальнага банка, Пётр Пракаповіч адзначыў, што на працягу апошніх чатырох месяцаў галоўная банкаўская ўстанова краіны штомесяц зніжала стаўку рэфінансавання. У выніку з 1 кастрычніка 2007 года яна складае 10 працэнтаў гадавых. Гэта дасць магчымасць у далейшым змяншаць стаўкі па крэдытах для насельніцтва і прадпрыемстваў, а таксама забяспечваць прывабнасць умоў для захоўвання ў банках зберажэнняў у нацыянальнай валюце.

Залатавалютныя рэзервы Беларусі ў студзені—верасні 2007 года ўзраслі на $1,4 млрд і склалі ў нацыянальным вызначэнні на 1 кастрычніка $3,15 млрд. Нарошчванне золатавалютных рэзерваў будзе прадаўжацца і ў далейшым, каб у 2010 годзе давесці іх аб'ём да $6 млрд.

Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу забяспечыць да канца года выкананне ўсіх паказчыкаў, закладзеных у Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на 2007 год, а таксама прыняць меры і стварыць перадумовы для паспяховай работы банкаўскай сістэмы ў наступным годзе.

ПУП на працягу года будуць аплачваць камунальныя паслугі па тарыфах для насельніцтва

Прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы, зарэгістраваныя па дамашнім адрасе сваіх заснавальнікаў, будуць аплачваць тэхнічнае абслугоўванне і камунальныя паслугі па тарыфах для насельніцтва на працягу каляндарнага года з моманту рэгістрацыі. Адпаведнае распараджэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў № 1255 «Аб унясенні змянення ў пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 1999 года № 1332».

Як растлумачылі карэспандэнту БЕЛТА ў Апараце Саўміна, гэта распараджэнне прынята з мэтай стварэння спрыяльных умоў для пераходу індывідуальных прадпрымальнікаў у прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы. Пасля заканчэння каляндарнага года з моманту рэгістрацыі ПУП яны будуць плаціць за тэхабслугоўванне і камунальныя паслугі па іх нарматыўнаму сабекошту, што зацвярджаецца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам.

Фота Анатоля КЛЁШЧУКА.

Вадасховішча Дуброўскае, Смалявіцкі раён.

Ва ўрадзе

ТРЫ БОЛЕВЫЯ КРОПКІ «БЕЛЛЕГПРАМА»...

Пачынаючы ўчарашняе пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, на якім разглядалася праца канцэрна «Беллегпрам» па стабілізацыі фінансава-гаспадарчай дзейнасці падведамасных арганізацый і рэалізацыі імі інвестыцыйных праектаў, першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка адзначыў, што сёлетні год канцэрн пачаў нядрэнна — у першым паўгоддзі ім былі выкананы практычна ўсе прагнозныя паказчыкі. Аднак у другім паўгоддзі на шэрагу валаўтвараль-ных прадпрыемстваў пачаўся спад вытворчасці. Зразумела, што апошняя тэндэнцыя не можа не клапаціць урад, аб чым прама і заявіў Уладзімір Сямашка. У канцэрна зараз ёсць тры відавочныя болевыя кропкі — «Аршанскі льнокамбінат», ААТ «Дываны Брэста» і пінскае ААТ «Палессе», якія і цягнуць паказчыкі «Беллегпрама» ўніз. Адпаведна канцэрну неабходна неадкладна прымаць захады да вырашэння праблем на згаданых прадпрыемствах. Разам з тым старшыня канцэрна «Беллегпрам» Эдуард Нарышкін, які трымаў справаздачу на пасяджэнні Прэзідыума, паведаміў, што ўзровень рэнтабельнасці рэалізаванай прадпрыемствамі прадукцыі за студзень—ліпень гэтага года склаў 8,9 працэнта пры заданні 8,5 працэнта.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Твае правы

ПАПРАЦАВАЦЬ. І АДПАЧЫЦЬ

Плённа працуе той, хто добра адпачывае. Таму зусім не выпадкова: асаблівасці чаргавання перыядаў работы і вольнага часу дакладна рэгламентаваны ў нашым заканадаўстве. Ці магчыма адпрацаваць дзве змены запар, хто ў пэўных варунках абавязаны выходзіць на сваё месца па выхадных, якой можа быць максімальная працягласць звышурочных і які працоўны дзень напярэдадні святаў? Аб усім гэтым і не толькі наша сённяшняя гутарка з галоўным інспектарам працы Рэспубліканскага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Соф'яй Васільеўнай ГРЫШУЦІНАЙ.

У НЯДЗЕЛІ «АСАБЛІВЫ СТАТУС»

Не сакрэт, што адны арганізацыі практыкуюць работу па пяцідзённаму тыдню з двума выхаднымі, тады як іншыя — «шасцідзёнку». Прычым нейкіх агульных рэкамендацый тут няма. «Фармат» тыдня павінен вызначацца самастойна наймальнікам па ўзгадненню з прафкамам. Адно, што сума гадзін работы як пры пяцідзённым, так і пры шасцідзённым мусіць адпавядаць разліковай норме працоўнага часу кожнага каляндарнага года, якая вызначаецца ўрадам. І, да прыкладу, калі пры пяцідзённым сума гадзін работы атрымліваецца менш за тыднёвую норму, то «недапрацоўка» па меры яе назапашвання кампенсуецца ў асобныя тыдні за кошт выхадаў на работу ў дні, якія звычайна з'яўляюцца выхаднымі. Аднак падобную «кампенсацыю» нельга планаваць на нядзелі.

Нялішне заўважыць, што незалежна ад пяцідзённі ці шасцідзённі агульным выхадным днём у Беларусі з'яўляецца менавіта нядзеля. І толькі ў выключных выпадках яна становіцца працоўнай. Скажам, гэта можа адбыцца па рашэнню кіраўніка дзяржавы.

— Другі выхадны пры пяцідзённым рабочым тыдні вызначаецца правіламі ўнутранага працоўнага распарадку ці графікам зменнасці, пры гэтым два выхадныя звычайна даюцца адначасова, — кажа Соф'я Грышуціна. — Аднак можа ўзнікнуць сітуацыя, калі з'яўляецца дапушчальным перанос наймальнікам вызначанага выхаднога на наступны тыдзень. Разам з тым заканадаўства патрабуе: даваць выхадны наймальнік абавязаны не пазней чым праз шэсць дзён работы запар.

ІНШЫ ДЗЕНЬ. АБО АПЛАТА?

Як правіла, просьба кіраўніка папрацаваць у выхадны павінна «падмацоўвацца» згодай работніка. Але не заўсёды. Выйсці на работу нават пры адсутнасці згоды давядзецца ў выпадках ліквідацыі катастроф, вытворчых аварый, стыхійных бедстваў, для папярэджання няшчасных выпадкаў, аднаўлення камунікацый, аказання тэрміновай медыцынскай дапамогі.

— У любым выпадку прыцягненне да работы ў выхадны афармляецца загадам ці распараджэннем наймальніка з выкананнем вызначаных гарантый, у залежнасці ад дамоўленасці, гаворка тут ідзе аб іншым дні адпачынку ці павышанай аплаце, — працягвае Соф'я Грышуціна. — Прычым калі прыцягненне да работы ў выхадны з'яўляецца абавязковым, а дамовіцца наконт кампенсацыі бакі так і не здолелі, то даецца менавіта іншы выхадны дзень. Аднак у гэтым правіле могуць быць выключэнні. Скажам, калі запіс аб павышанай аплаце зроблены ў калектыўным дагаворы, то для гэтай канкрэтнай арганізацыі такая норма — закон.

Што да работы ў дзяржаўныя святы і святочныя дні, то тут варыянт кампенсацыі толькі адзін — аплата ў павышаным памеры. Да таго ж калі гэта работа выконвалася звыш нормы працоўнага часу за месяц, то супрацоўніку, па яго жаданню, апроч павышанай аплаты павінен давацца і іншы дзень адпачынку.

БОЛЬШ ЦІ МЕНШ. ГАЛОЎНАЕ — У СУМЕ

Сітуацыя, тыповая для сельскай гаспадаркі і некаторых іншых галін. Працягласць рабочага дня ўлетку дасягае 12 гадзін. А вось узімку яна скарачаецца ці напалову. Ці адпавядае такі варыянт нашаму заканадаўству?

— У нашым заканадаўстве існуе такое паняцце, як сумяраванне працоўнага часу па пэўных уліковых перыядах, скажам, за год, за паўгоддзе, квартал ці за месяц, — тлумачыць Соф'я Грышуціна. — Таму сапраўды, у асобныя дні працягласць работы можа перавышаць, а ў асобныя — не дасягаць стандартных 8 гадзін. Галоўнае, каб у рэшце рэшт работнік выйшаў на норму гадзін адпрацоўкі за ўліковы перыяд у цэлым.

МІНІМУМ ДЗВЕ ЗМЕНЫ ПЕРАПЫНКУ

Таксама папулярнае пытанне — як чаргуюцца змены? І які перапынак павінен быць паміж імі?

— Парадак зменнасці вызначаецца графікам, пры гэтым самі змены павінны чаргавацца раўнамерна, — заўважае Соф'я Грышуціна. — Аднак існуе правіла: мінімальны перапынак ад заканчэння работы і да наступнага выхаду не можа быць меншым за двайную працягласць папярэдняй змены. І, дарэчы, новымі зменамі ў Працоўны кодэкс, што пачнуць дзейнічаць з 26 студзеня, уведзена абмежаванне работы ў змену — не больш за 12 гадзін.

ГАДЗІНА МІНУС

Напярэдадні дзяржаўных святаў і святочных дзён працягласць работы скарачаецца на адну гадзіну. Пры гэтым калі скарачэнне працягласці штодзённай работы ці змены напярэдадні святаў па ўмовах вытворчасці немагчыма, то работнікам павінен давацца дадатковы дзень адпачынку — па меры назапашвання гадзін перапрацоўкі.

— Варта памятаць, што артыкул 117 Працоўнага кодэкса прадугледжвае гадзіннае скарачэнне работы ці змены з адпаведным скарачэннем працоўнага тыдня і яшчэ ў адным выпадку — калі супрацоўнік выходзіць у начную змену, — зазначае Соф'я Грышуціна. — І, да слова, паводле Працоўнага кодэкса, начным у нас лічыцца час з 22 гадзін вечара і да 6 гадзін ранку.

УСЁ, ШТО БОЛЬШ, У ЖОРСТКІХ РАМКАХ

Асобная размова аб звышурочных работах. Трэба падкрэсліць, што ў заканадаўстве вызначаны своеасаблівы «мараторый» на прыцягненне да такіх работ цяжарных жанчын і жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 3 гадоў, моладзі ва ўзросце да 18 гадоў, работнікаў, якія маюць медыцынскія проціпаказанні, а таксама работнікаў, што навучаюцца без адрыву ад вытворчасці ў агульнаадукацыйных ці прафесійна-тэхнічных навучальных установах у дні заняткаў.

Што да ўсіх астатніх катэгорый, то галоўная ўмова звышурочнай работы для іх — асабістая згода. Аднак у выключных выпадках наймальнік згоды можа і не спытаць. У прыватнасці, да такіх выпадкаў зноў-такі адносяцца неабходнасць папярэджання катастрофы, вытворчай аварыі, тэрміновай ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў, папярэджання няшчасных выпадкаў, аказання экстраннай медыцынскай дапамогі, а таксама неабходнасць правядзення грамадска значных работ па аднаўленні водазабеспячэння, газазабеспячэння, ацяплення, асвятлення, транспарту і сувязі.

— Без уліку «асаблівых выпадкаў» максімальная працягласць звышурочных для кожнага работніка не павінна перавышаць чатырох гадзін на працягу двух дзён запар і 120 гадзін — у цэлым за год, — нагадвае Соф'я Грышуціна. — Прычым наймальнік абавязаны весці дакладны ўлік звышурочных. А таксама, па патрабаванні, прадастаўляць інфармацыю аб іх колькасці непасрэдна работніку.

Сяргей ГРЫБ.

Жыллё

На сталічным рынку кватэр — цэнавая стабільнасць

У верасні на другасным рынку жыллёвай нерухомасці сталіцы пачало назірацца невялікае ажыўленне. Паводле інфармацыі пастаяннага эксперта нашага выдання дырэктара Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалая Прасталупава, калі летам агенцтвы нерухомасці наведвалі амаль выключна прадаўцы ўласнага жылля, то зараз да спецыялістаў гэтага сегмента рынку пачалі звяртацца патэнцыяльныя пакупнікі.

Менавіта ў першы месяц восені кліенты не толькі цікавяцца цэнамі на жыллё, але і пачалі заключаць рэальныя здзелкі. На якой цане сёння ў сталіцы набываюцца кватэры? Нягледзячы на амаль нулявы попыт на кватэры ў ліпені—жніўні, цэны на жыллёвую нерухомасць за летні сезон узугуле не змяніліся. Разам з тым трэба адзначыць, што зараз ужо бадай усе тыпы кватэр (акрамя чатырохпакаёвых) пераадолелі свой новы псіхалагічны бар'ер у 2 тысячы долараў за квадратны метр агульнай плошчы. Сёння сталічны рынак «немаладога» жылля знаходзіцца на стадыі цэнавай стабілізацыі. Прадаўцы падчас рэальных здзелак сёння больш ахвотна згаджаюцца крыху скідваць цану, але гэта ўступка застаецца вельмі маленькай і ніяк не паўплывае на агульнарынкавыя тэндэнцыі кошту жылля ў сталіцы.

Сітуацыя на кватэрным рынку сёлета выглядае не зусім тыповай, бо прапанова жылля на продаж значна перавышае попыт. У гэтым выпадку пакупнікі і прадаўцы паводзяць сябе вельмі асцярожна. Першыя яшчэ разлічваюць на магчымае патанненне жылля, а апошнія спадзяюцца, што бліжэй да зімы кватэры зноў пачнуць даражэць.

Улічваючы гэты псіхалагічны фактар, сталічныя рыэлтары і спецыялісты другаснага рынку нерухомасці мяркуюць, што ў найбліжэйшы час істотных цэнавых змен на кватэрную нерухомасць у Мінску не будзе. Мікалай Прасталупаў лічыць, што да істотнага патаннення жыллёвай нерухомасці не падрыхтаваны псіхалагічна прадаўцы, з другога боку, без павелічэння колькасці сур'ёзных пакупнікоў хуткае падарожанне кватэр таксама немагчыма.

Сяргей КУРКАЧ.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

АЦЯПЛЕННЕ Ў ЖЫЛЫМ СЕКТАРЫ МОЖА ПАЧАЦЦА НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

У Беларусі ўключэнне ацяплення ў жылым сектары можа пачацца на наступным тыдні. Аб гэтым паведаміў вядучы інжынер прадпрыемства «АДУ» ГВА «Белэнерга» Уладзімір Кардуба.

Рашэнне аб уключэнні ацяплення прымаюць мясцовыя органы ўлады зыходзячы з тэмпературы вонкавага паветра — на працягу пяці сутак сярэдняя тэмпература павінна быць 8 градусаў цяпла і ніжэй. Пакуль яна не дасягнула такой адзнакі і ў пачатку гэтага тыдня склала 8,6 градуса. Аднак к канцу тыдня яна можа панізіцца, і пачнецца паэтапнае ўключэнне ацяплення ў дамах. На аб'ектах сацыяльнай сферы гэта адбудзецца раней.

P.S. *Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт дазволіў з 9 кастрычніка ўключэнне ацяплення ў дзіцячых дашкольных установах, лячэбна-прафілактычных установах, дзіцячых дамах, спальных карпусах школ-інтэрнатаў, інтэрнатаў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, дамах састарэлых, агульнадаступных лазнях, Беларускім дзяржаўным харэаграфічным каледжы, Мінскім дзяржаўным музычным вучылішчы, будынках архіваў і музеяў, бібліятэк, басейнах, будынках дыпламатычных прадстаўніцтваў, Мінскім заапарку.*

БЕЛТА.

ХОЛАД І ГАЛАЛЁД

У сувязі з рэзкім пахаладаннем і прагнознымі 10 кастрычніка замаразкамі, Дзяржаўтаінспекцыя краіны звяртаецца да вадзіцеляў з просьбай быць асцярожнымі на дарогах.

Як падкрэслілі ва ўпраўленні ДАІ МУС Беларусі, на праезнай частцы магчымы галалёд, таму аўтааматарам варта пазбягаць рэзкіх манеўраў, захоўваць дыстанцыю і бакавы інтэрвал руху. А яшчэ «даішнікі» нагадваюць кожнаму кіроўцу аб неабходнасці праверыць тэхнічны стан транспартнага сродку. Прычым асаблівую ўвагу трэба звярнуць на тармазную сістэму, светлавыя прылады і зношанасць пратэктараў шын.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

МУС ІНІЦЫЮЕ ЎСТАНАЎЛЕННЕ АДМІНІСТРАЦЫЙНАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗА РАСПІЦЦЁ ПІВА І СЛАБААЛКАГОЛЬНЫХ НАПОЯЎ НА ВУЛІЦЫ

Праектам дакумента прапаноўваецца ўстанавіць адміністрацыйную адказнасць за дадзенае правапарушэнне ў выглядзе адміністрацыйнага штрафу ў памеры да 10 базавых велічынь (1 базавая велічыня — Br31 тысяча).

У МУС ПРЫНЯЛІ РАШЭННЕ АБ ЗАМАЦАВАННІ ЗА КОЖНЫМ УЧАСТКАМ ДАРОГ СУПРАЦОЎНІКА МІЛІЦЫІ

Аб гэтым на прэс-канферэнцыі заявіў намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ МУС Беларусі Ігар Ваніцкі.

Мера накіравана на ўзмацненне кантролю за дарожным рухам і на павышэнне ўзроўню бяспекі. Прычым да работы прыцягваюцца не толькі супрацоўнікі ДАІ, міліцыя грамадскай бяспекі, але і, па меры магчымасці, аператыўныя работнікі. Сутнасць мерапрыемства ў тым, што кожны супрацоўнік міліцыі павінен ведаць, якія прадпрыемствы, арганізацыі, навучальныя ўстановы знаходзяцца ў зоне яго адказнасці, хто абслугоўвае гэты ўчастак дарогі. Як адзначыў Ігар Ваніцкі, у адпаведнасці з патрабаваннем кіраўніцтва МУС 50 працэнтаў службовага часу супрацоўнікі міліцыі павінны ўдзяляць прафілактычнай дзейнасці. Таму яны будуць праводзіць растлумачальную работу ў арганізацыях і ўстановах. Таксама ў іх абавязкі ўваходзіць абследаванне стану дарогі, наяўнасць знакаў і выпрацоўка адпаведных рэкамендацый па ўстараненні недахопаў. У той жа час яны абавязаны кантраляваць дарожную абстаноўку і спыняць парушэнні.

БЕЛТА.

МІНСЕЛЬГАСХАРЧ ПРАПАНУЕ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ЗАКУПАЧНЫЯ ЦЭНЫ НА МАЛАКО

Мінсельгасхарч прапануе павялічыць закупачныя цэны на малако. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў галоўным упраўленні эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі.

Паводле слоў спецыялістаў, такая прапанова перададзена ўсім зацікаўленым міністэрствам і ведамствам. У выпадку станоўчага рашэння будзе прынята пастанова Савета Міністраў. Неабходнасць павелічэння закупачных цэнаў на малако звязана з ростам затрат на яго вытворчасць. Нягледзячы на прынятыя меры па зніжэнні сабекошту, без уліку надбавак да закупачных цэнаў вытворчасць малака мае адмоўную рэнтабельнасць. Неабходнасць павышэння закупачных цэнаў на малако абумоўлена і цэнавым фактарам на гэты від прадукцыі ў сумежных дзяржавах. Павышэнне закупачных цэнаў на малако ў пэўнай ступені паўплывае на фарміраванне цэнаў на натуральнамалочную прадукцыю. Аднак малако, смятана і кефір адносяцца да сацыяльна значнай прадукцыі, і падаражанне магчыма толькі ў межах устаноўленага індэкса росту цэнаў. Таму калі павелічэнне цэнаў і стане магчымым, то яно прадугледжваецца невялікім, таму што будзе ўлічвацца, перш за ўсё, пакупная здольнасць сярэдніх слаёў насельніцтва, лічаць спецыялісты. У гэтым годзе закупачныя цэны на малако павялічваліся двойчы — у студзені і верасні — у абодвух выпадках на 5 працэнтаў.

ВЯРХОЎНЫ СУД БЕЛАРУСІ ВЫНЕС СМЯРОТНЫЯ ПРЫГАВОРЫ ДВУМ ЧЛЕНАМ «МАРОЗАЎСКАЙ» ЗЛАЧЫННАЙ ГРУПОЎКІ

Яшчэ чацвёра членаў групоўкі прыгавораны да розных тэрмінаў пазбаўлення волі.

С. Марозаў прызнаны вінаватым у кіраўніцтве бандай, наўмысных забойствах, замахах на наўмыснае забойства, учыненых спосабам, небяспечным для жыцця вялікай колькасці людзей. С. Марозаў канчаткова прыгавораны да найвышэйшай меры пакарання — расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. І. Данчанка прызнаны вінаватым ва ўчыненні наўмыснага забойства, у замаху на забойства і прыгавораны да найвышэйшай меры пакарання — расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці.

ПА ЛЕСЕ — З ВЕТРЫКАМ?

Жыхар Жлобінскага раёна паехаў у грыбы. Пакуль збіраў тыя лісічкі, яго легкавушкі і след прастыў. Ён было ўжо страціў надзею знайсці яе, як нечакана пашанцавала: на аўто ён выпадкова натрапіў... праз два кіламетры ад таго месца, дзе яе пакідаў. І нічога ў машыне парушана не было. Здавалася б, можна і супакоіцца. Але гаспадар легкавушкі заявіў аб здарэнні ў міліцыю, і тая ўстанавіла асобу ўгоншчыка, які, бачыце, хацеў праехаць з ветрыкам па лесе...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЮШЧАНКА ПРАПАНУЕ ЯНУКОВІЧУ ПАСАДУ СПІКЕРА?

Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка гатовы прапанаваць пасаду кіраўніка парламента лідару Партыі рэгіёнаў Віктару Януковічу, перадае ИТАР-ТАСС. У той жа час блок «Наша Украіна — Народная самаабарона» вылучыў на гэту пасаду старшыню палітсавета блока Вячаслава Кірыленку.

Такі захад Юшчанкі эксперты расцэньваюць як спробу звязаць патэнцыяльную апазіцыю і большасць, прадаставіўшы меншасці некаторыя рэальныя рычагі ўлады. Акрамя таго, як мяркуецца, прэзідэнт можа аддаць рэгіяналам некалькі ключавых камітэтаў у Вярхоўнай радзе. У замен на гэта Юшчанка можа разлічваць на канструктыўную работу прадстаўнікоў Партыі рэгіёнаў у плане прыняцця змяненняў у Канстытуцыю, новай рэдакцыі закона аб урадзе, законаў аб апазіцыі і інш. Пасада прэм'ер-міністра да фарміравання парламенцкай кааліцыі не абмяркоўваецца, хоць палітыкі перакананыя, што яе зойме Юлія Цімашэнка. Пакуль жа ў панядзелак Юшчанка даў пяць дзён усім пераможцам парламенцкіх выбараў для кансультацый адносна стварэння кааліцыі.

АКРУАШВІЛІ РАЗАМ З СЯМ'ЁЙ ПАКІНУЎ ГРУЗІЮ

Экс-міністр абароны Грузіі Іраклій Акруашвілі, вызвалены ўчора ў 4 гадзіны раніцы з тбіліскай турмы пасля адмовы ад абвінавачанняў у адрас прэзідэнта Грузіі і пасля выплаты залогу каля 6 млн долараў, разам з сям'ёй пакінуў краіну.

Пакуль няма інфармацыі, куды накіраваўся апальны палітык. Па адной з версій, Акруашвілі выехаў з Грузіі па дазволу следства, але афіцыйна гэта не пацверджана. Таксама невядома, ці бралася з экс-міністра падпіска аб нявыездзе.

ЦЭНЫ НА ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ ЎТВАРЫЛІ «САЦЫЯЛЬНУЮ НАПРУЖАНАСЦЬ» У РАСІІ

Дзярждума Расіі звярнулася да прэм'ер-міністра РФ з прапановай распрацаваць комплекс мераў, неабходных для стабілізацыі цэнаў на харчовым рынку. Напярэдадні на рост цэнаў міністрам указаў Уладзімір Пуцін. А расіяне лічаць зніжэнне цэнаў асноўнай задачай новага ўрада, ад выканання якой будзе залежаць ацэнка работы Зубкова.

У верасні—пачатку кастрычніка істотна выраслі цэны на асноўныя харчовыя тавары. Так, істотна падаражэлі малако, макаронныя і хлеба-булачныя вырабы, малочныя прадукты, алей і цэлы шэраг іншых тавараў. Абнародаваныя Расстатам звесткі пра вераснёўскі рост індэкса спажывецкіх цэнаў аказаліся горшымі з 2000 года. З пачатку года цэны выраслі на 7,5 працэнта, але прадукты харчавання падаражэлі значна больш.

УКРАІНА АДДАСЦЬ ДОЎГ «ГАЗПРАМУ»... ГАЗАМ



Міністр паліва і энергетыкі Украіны Юрый Байко дамовіўся з кіраўніком расійскага газавага манапаліста Аляксеем Мілерам, што ўкраінскі бок выплаціць канцэрну частку доўга ў памеры 1,3 мільярда долараў грашамі, а яшчэ частку «Газпрам» атрымае ў выглядзе газу, які зараз знаходзіцца ў падземных газасховішчах Украіны.

Паводле інфармацыі расійскіх СМІ, пяць мільярдаў кубаметраў газу коштам 650 мільёнаў долараў будуць вернуты «Газпраму» і яшчэ 650 мільёнаў выплацяць грашамі. Прапорцыя можа мяняцца. Нагадаем, першага кастрычніка расійскі канцэрн заявіў, што ўкраінскія спажыўцы завінаваціліся швейцарскаму пасрэдніку Rosukrenergo (50 працэнтаў у «Газпрама») і прыгразілі скараціць пастаўкі, калі доўг не вернуць за месяц.

АМЕРЫКАНСКІ ПАЛІЦЭЙСКІ РАССТРАЛЯЎ ШЭСЦЬ ЧАЛАВЕК

Паліцэйскі Тайлер Петэрсан у доме сваёй былой дзяўчыны трыццаццю стрэламі з вінтоўкі AR-15 застрэліў шэсць чалавек. Паводле слоў блізкага сябра злачынцы, гэта адбылося пасля таго, як дзяўчына адмовілася з ім мірыцца, а яе госці назвалі паліцэйскага «нікчэмнай свіннёй».

Самай малодшай з шасці ахвяраў намесніка шырыфа стала 14-гадовая дзяўчына. Яшчэ адзін чалавек цяжка паранены і знаходзіцца ў бальніцы. У ходзе аперацыі па яго затрыманні Петэрсан загінуў.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 07193 >

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 019,78
1 латвійскі лат	4 281,59
1 літоўскі літ	874,02
1 чэшская крона	109,95
1 польскі злоты	803,83
1 расійскі рубель	85,80
1 украінская грыўня	426,84

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,0597
10 UAH	49,6655
1000 BYR	11,6388
EUR	35,1788

Курс у гандлёвых кампаніях (на 9.10.2007 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісана на чаголіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «СБЕРЕГАТЕЛЬНЫЙ БАНК «БЕЛАРУСБАНК», **расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,** *сообщает о проведении 18 октября 2007 года*

ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

в заочной форме со следующей повесткой дня:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении Положения о порядке начисления и выплаты дивидендов по акциям Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк».
3. О внесении изменений в Устав ОАО «АСБ Беларусбанк».

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 16 октября), а также с решениями, принятыми внеочередным общим собранием акционеров банка (после 18 октября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней — 15 октября 2007 г.

Телефоны для справок: (8017) 218 84 38, 218 84 04.

АБАРАНЯЦЬ СВАЮ ЗЯМЛЮ

Камандна-штабное вучэнне Узброеных Сілаў Беларусі ўступіла ў заключную фазу. Яго ўдзельнікі ўжо выконваюць задачы другога этапу, мэта якога — адпрацоўка выкарыстання сілаў і сродкаў у ваенны час ва ўмовах процідзеяння дэсантна-дыверсійным сілам і незаконным узброеным фарміраванням. Вучэбна-баявыя задачы вырашаюцца ў самых розных раёнах нашай краіны. У адхіленні паветраных ударaў з рэальнымі палётамі авіяцыі задзейнічаны экіпажы 61-й і 927-й знішчальных авіяцыйных баз ВПС і ППА. Пытанні медыцынскага забеспячэння баявых дзеянняў на 227-м агульнавайсковым палігоне адпрацоўвае медыцынскі атрад спецыяльнага назначэння.

Гатоўнасць і ўменне выконваць любыя пастаўленыя вучэбна-баявыя задачы ўжо даказаў асабовы склад падраздзялення Тэрытарыяльных войскаў. Гэта адзначыў кіраўнік вучэння, начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сілаў Беларусі, генерал-лейтэнант Сяргей Гурулёў. Першы намеснік міністра абароны нашай краіны днямі азнаёміўся з арганізацыяй аховы аб'ектаў Астравецкага раёна тэрытарыяльнай абароны і ўзнагародзіў гадзіннікамі ваеннаслужачых запасу: камандзіра стралковай роты капітана Віктара Трафімава, камандзіра аддзялення старшага сяржанта Сяргея Сапегу, стралкоў малодшага сяржанта Вячаслава Доўляша і радавога Мікалая Леўкаўца.

— Тэма гэтых вучэнняў актуальная ў кантэксце развіцця ваеннага будаўніцтва, — заявіў Сяргей Гурулёў. — Улічваюцца ўсе перадавыя погляды, вынікі і вопыт ваенных канфліктаў, развіццё нашай беларускай ваеннай школы. У нас выпрацавана стройная сістэма рашэння задач. Зараз жа мы падымаем яе на больш высокі ўзровень. Падраздзяленні і часці Узброеных Сілаў Беларусі вартыя паспяхова ўзаемадзейнічаць з падраздзяленнямі органаў пагранічнай службы, унутранымі войскамі, органамі выканаўчай улады краіны ў арганізацыі тэрытарыяльнай і грамадзянскай абароны. Афіцэры і салдаты запасу падраздзяленняў тэрытарыяльных войскаў усведамляюць сур'ёзнасць задач, якія на іх усклалі, і з задавальненнем вучацца абараняць сваю зямлю.

Ірына ПРЫМАК.

ДЗВЕРЫ Ў ЗБОРНУЮ АДКРЫТЫ ДЛЯ ЎСІХ

Гульня № 1

Аднак Кульчы і Булыга ў спісе Штанге ўжо не значацца

У бліжэйшую суботу 13 кастрычніка нацыянальная зборная Беларусі па футболе ўпершыню правядзе афіцыйны матч не на мінскім «Дынама», а на стадыёне «Гомеля». Сапернікам адборачнай сустрэчы да Еўра-2008 стане каманда Люксембурга.

Гульню з аўтсайдарам групы «G» галоўны трэнер нашай дружыны Бернд Штанге аднёс да шэрагу тых матчаў, які абавязкова трэба выйграваць, а наконт змены поля сказаў так: «Мінскія балельшчыкі бачылі ў сталіцы дастаткова добрых матчаў, настаў час парадаваць і гамяльчан». Нямецкі спецыяліст паведаміў, што за тыдзень да матча зборная згубіла двух нападаючых. Калі адсутнасці ў складзе каманды Віталя Кутузава наўрад ці варта здзіўляцца (ён сам папрасіў не выклікаць сябе на матчы з Люксембургам і Ізраілем, спаслаўшыся на нараджэнне дзіця і сваю патрэбнасць клубу), то вылет з абоймы наймацнейшага форварда нацыянальнага чэмпіянату Рамана Васілюка стаў сюрпрызам. Завадатар атак «Гомеля» прапусціць два матчы з-за траўмы, якую атрымаў у мінулым туры першынства Беларусі ў гульні з «Віцебскам». Што ж датычыцца форварда італьянскай «Пізы», то Штанге паабяцаў выклікаць Кутузава і надалей на сустрэчы з Албаніяй і Галандыяй.

Дарэчы, двум галеадорам Бернд Штанге ўжо знайшоў нечаканую замену — гэта 18-гадовы Андрэй Варанкоў з дубля кіеўскага «Дынама». Што ж, немец толькі пацвярджае свае абяцанні, якія раздаваў яшчэ на сваёй першай прэс-канферэнцыі: «У зборную адкрыты дзверы для ўсіх. Трэба даваць дарогу маладым». Ён таксама падзяліўся сваімі планамі: Штанге будзе і далей наведваць матчы чэмпіянатаў, дзе выступаюць беларусы, каб прагледзець кандыдатаў у зборную. Цікава, што калі бачыць Кутузава Штанге будзе яшчэ рады, то аб існаванні гульцоў «Тамі» (Кульчы і Булыга) ён ужо запамятаваў. «Гэта розныя выпадкі, — растлумачыў трэнер. — У Кутузава асабістая прычына (нараджэнне дзіця), да якой мы ставімся гуманна. Калі ж мы дазволім гульцам вырашаць, ці прыязджаць ім у зборную, бо яны патрэбны свайму клубу, трэба падымаць белы сцяг. Тады Арсен Венгер папросіць не запрашаць Глеба, таму што «Арсеналу» трэба гуляць супраць «Манчэстар Юнайтэд» і г.д.

— Было б цудоўна, каб ужо да матча з Галандыяй сфармаваліся контуры каманды, якая будзе змагацца ў наступным адборачным цыкле, — рэзюмаваў трэнер. — У ідэале было б добра мець на кожнай пазіцыі па два гульцы. Праўда, замену такому майстру, як наш капітан Аляксандр Глеб, знайсці цяжка.

Перад матчам з Люксембургам варатар зборнай Юрый Жаўноў сказаў, што знаходзіцца ў добрым настроі і спартыўнай форме. Абаронца наватроіцкай «Носты» Дзмітрый Молаш падзяліўся сваёй тактыкай на гульню: «Я імкнуся больш біць па варотах, а там ужо як атрымаецца». На пытанне, ці значыць гэта, што бранябойная «пушка» Молаша захавалася яшчэ з таго часу, як ён выступаў за БАТЭ, адказаў Юрый Жаўноў: «Усё ў яго з «пушкай» у парадку. Мы летам гулялі, дык я спытаў пасля гульні ў Дзімы, навошта было біць так моцна?». Сам ігрок «Носты» толькі дадаў, што не разумее, чаму некаторыя людзі не ўспрымаюць сур'ёзна яго каманду: «У нас вельмі сур'ёзнае кіраўніцтва. Уладальнік клуба — Алішэр Усманаў, які набывае акцыі лонданскага «Арсенала», а трэніруе каманду Сяргей Падпалы (у 2003-м ён прывёў «Гомель» да залатых узнагарод у чэмпіянаце Беларусі)».

P.S. *Калі вярстаўся нумар, стала вядома, што абаронца мінскага «Дынама» Кірыл Паўлючак пакінуў зборную з-за траўмы.*

Ірына ПРЫМАК.

Беларусы за мяжой

«Мы без вас няпоўныя...»

Напрыканцы верасня ў Кішынёве адбыўся Другі фестываль беларусаў Малдовы «Беларусь — мая Радзіма». Ён быў арганізаваны намаганнямі членаў беларускай суполкі пры актыўным садзейнічанні пасольства Рэспублікі Беларусь у Малдове.

— Тут, на малдаўскай зямлі, жыве каля 20 тысяч нашых землякоў, — расказвае Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Малдове Васіль Саковіч. — І хоць многія з іх жывуць тут ужо не адно дзесяцігоддзе, яны не забываюць сваёй этнічнай Радзімы, імкнуцца ўсяляк падтрымліваць у сваім асяроддзі агеньчык беларускасці — ладзяць творчыя вечарыны, сумесна адзначаюць нацыянальныя святы. Летась у нас нарадзілася ідэя мерапрыемства больш значнага, больш маштабнага, чым звычайны канцэрт. Мерапрыемства, якое стала б падзеяй не толькі для нашых суайчыннікаў, але і для карэнных жыхароў. Так быў арганізаваны Першы фестываль беларусаў Малдовы. Няхай не ўсё з задуманага ўдалося, аднак фестываль сапраўды меў шырокі грамадскі рэзананс, і мы вырашылі, што яго трэба зрабіць традыцыйным і правядзіць штогод, менавіта ў верасні — як працяг Дня беларускага пісьменства.

Сёлета фестываль прайшоў у другі раз. Па просьбе пасольства Беларусі ў Малдове група беларускіх літаратараў, работнікаў мастацтва, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый прыехала ў Кішынёў. У першы ж дзень беларускую дэлегацыю прымалі ў Парламенце Рэспублікі Малдова. Юрый Яромін, кіраўнік парламенцкай групы дружбы з Беларуссю, расказаў, што ён і яго калегі зацікаўлены ва ўстанаўленні трывалых кантактаў з нашай краінай. Дзеля гэтага малдаўскія парламентарыі імкнуцца бываць у Беларусі, а беларускія — у Малдове. Узаемнымі візітамі абменьваюцца і прадстаўнікі дзелавых колаў. Сустрэчы прыносяць плён: толькі за апошнія два гады ў Кішынёве адкрыты гандлёвыя прадстаўніцтвы такіх вядомых беларускіх прадпрыемстваў, як «Керамін», «Мілавіца» і іншыя. Створана сумеснае прадпрыемства па выпуску мінскіх трактароў у Малдове.

Намеснік дырэктара Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, сустаршыня Беларуска-га саюза жанчын Антаніна Морава праінфармавала малдаўскіх калег аб дасягненнях у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі, падкрэсліўшы важную і надзвычай актыўную ролю ў гэтым беларускіх жанчын. Вельмі цёплая сустрэча адбылася з прадстаўнікамі Асацыяцыі жанчын Малдовы, Саюза дзелавых жанчын, кіраўніцтвам таварыства дружбы «Малдова—Беларусь». Гаворка тут ішла аб сацыяльнай абароненасці людзей. Малдаўскіх сяброў моцна ўразіла беларуская практыка — фінансавая дапамога маладым сем'ям, сістэма льготных крэдытаў на жыллё, меры барацьбы з беспрацоўем, пенсійнае забеспячэнне і іншае.

Госці з Беларусі завіталі таксама ў Кішынёўскую гарадскую бібліятэку імя М.В. Ламаносава. І не з пустымі рукамі — аддзелу беларускай літаратуры быў падораны не адзін дзесятак цудоўных альбомаў, якія расказваюць пра нашу краіну, а таксама кнігі беларускіх класікаў і сучасных аўтараў.

Шматлікія чытачы (а гэта былі не толькі нашы землякі, але і рускія, украінцы, малдаване), якія прыйшлі на сустрэчу, з вялікай цікавасцю распытвалі гасцей пра сённяшнюю сітуацыю ў Беларусі. Дырэктар Інстытута літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Валерый Максімовіч пазнаёміў прысутных з найбольш значнымі літаратуразнаўчымі працамі апошніх гадоў, распавёў таксама аб жыцці і творчасці слынных песняроў — Янкі Купалы і Якуба Коласа. Галоўны рэдактар часопіса «Гаспадыня», член Саюза пісьменнікаў Беларусі Зіновій Прыгодзіч расказаў аб арганізацыі кнігавыдавецкай справы ў краіне, аб сістэме сродкаў масавай інфармацыі, прававых і маральных асновах іх функцыянавання. Паэтка Ала Канапелька падзялілася ўражаннямі ад сустрэч у сонечнай Малдове, прачытала некалькі сваіх вершаў. А ў Цэнтральнай бібліятэцы горада Цірасполя была арганізавана спецыяльная літаратурная гасцёўня, дзе чыталі свае вершы паэты-беларусы ў Малдове Вікторыя Пілецкая, Наталля Сож і іншыя. Сямейная пара Валянціна і Мікалай Бугаёвы цудоўна выканалі папулярную песню «Ручнікі».

Начальнік упраўлення культуры Ціраспальскага гарвыканкама Дзмітрый Дарадур, які сардэчна вітаў гасцей з Беларусі, зазначыў, што нягледзячы на ўведзеныя межы, паміж нашымі народамі існуюць неблагія эканамічныя і культурныя сувязі: ціраспальцы штогод бяруць удзел у «Славянскім базары» ў Віцебску, а віцебскія мастацкія калектывы рэгулярна выступаюць на зямлі Прыднястроўя.

У рамках фестывалю прайшлі таксама творчыя сустрэчы і выступленні ансамбля народнай песні і танца «Радзімічы», дэманстраваліся фотавыставы «Квітней, Беларусь!» у Кішынёве і «Сучасная Беларусь» у Цірасполі, а таксама выставы работ мастакоў — этнічных беларусаў, членаў Саюза мастакоў Малдовы Вячаслава Ігнаценкі і Аляксея Кузьменкі.

Кульмінацыяй свята стаў сумесны гала-канцэрт беларускіх і малдаўскіх артыстаў, прафесійных і самадзейных. Яго адкрылі спікер парламента Рэспублікі Малдова Марыян Лупу, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Малдове Васіль Саковіч і старшыня Таварыства дружбы «Малдова—Беларусь» заслужаная артыстка Малдовы Маргарыта Івануш. Канцэрт доўжыўся больш за дзве гадзіны і пакінуў надзвычай яркія ўражанні. Больш за 800 гледачоў, якія запоўнілі вялікую канцэртную залу філармоніі, мелі ўнікальную магчымасць перагарнуць старонкі сімвалічнай кнігі, што адмысловымі мастацкімі сродкамі расказвала пра найбольш яркія эпізоды беларускай гісторыі.

Але, бадай, самыя хвалюючыя моманты гледачы перажылі тады, калі беларуская спявачка Таццяна Ліпская пранікнёна выконвала малдаўскую народную песню, а малдаўскія хлопчыкі і дзяўчынкі захоплена спявалі па-беларуску — гэта было самым яскравым сімвалам яднання дзвюх нацыянальных культур, двух народаў і кранала да слёз!

…Калі беларуская дэлегацыя ўжо развіталася, ад'язджаючы дадому, Генадзь Зяньковіч, старшыня муніцыпальнага згуртавання беларусаў, сказаў:

— Для нас вельмі важныя, вельмі патрэбныя такія сустрэчы — тут мы адчуваем сябе зялёнай галінкай вялікага жывога дрэва.

— І мы без вас няпоўныя! — адгукнуўся нехта з членаў дэлегацыі…

Зм. ВЕРАС.

Ведай нашых!

КІНАЛАГІЧНАЯ «СТАЛІЦА» ЕЎРОПЫ

У Смаргонскім пагранатрадзе створана лепшая на еўрапейскім кантыненце «сабачая акадэмія»

Смаргонь, якая ў часы Вялікага княства Літоўскага славілася сваёй мядзведжай акадэміяй, зноў набывае вядомасць у Еўропе і за яе межамі, дзякуючы сваім «чатырохногім выхаванцам». Праўда, у наш час праслаўляюць маленькі беларускі горад не гаспадары лесу, а верныя памочнікі вартавых мяжы — сабакі. Менавіта ў Смаргонскім пагранатрадзе дзейнічае найлепшы ў Еўропе кіналагічны цэнтр. У знакамітую «сабачую альма-матэр» цэнтр пераўтварыўся ўсяго за 12 гадоў са звычайнай школы па падрыхтоўцы інструктараў службовых сабак. І такіх поспехаў беларускія памежнікі дасягнулі ў многім дзякуючы фінансавай дапамозе Еўрасаюза і Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Еўрапейская і міжнародная супольнасці інвеставалі ў мадэрнізацыю «сабачай акадэміі» больш за 1 мільён еўра. Зараз гэта сучасны кіналагічны комплекс, дзе створаны ўсе ўмовы для падрыхтоўкі чатырохногіх вартавых мяжы і спецыялістаў кінолагаў, а таксама для развядзення сабак самых лепшых службовых парод: нямецкіх, бельгійскіх, каўказскіх аўчарак, кокер-спаніеляў і лабрадораў-рэтрыверaў. Больш за тое, паводле слоў кіраўніка кіналагічнай службы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Уладзіміра Ворніка, ужо зроблены першы крок для вывядзення новай пароды сабакі, які будзе мець спрыт бельгійскай і сілу нямецкай аўчарак. А яшчэ беларускія спецыялісты зараз спрабуюць навучыць сабак не толькі пошуку парушальнікаў мяжы, наркотыкаў, выбуховых прыладаў, але і радыяцыйных рэчываў. Штогод прыкладна 100 чатырохногіх выпускнікоў гэтай установы накіроўваюцца на ахову Дзяржаўнай мяжы нашай краіны. Высокі прафесіяналізм смаргонскіх кінолагаў і іх выхаванцаў адзначаюць не толькі айчынныя пагранічнікі, але і замежныя.

Як падкрэсліў старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Ігар Рачкоўскі, цэнтр працуе не толькі ў інтарэсах беларускіх вартавых мяжы, але і многіх заможных краін. Напрыклад, не так даўно Смаргонскі пагранатрад наведалі фінскія памежнікі і пасля экскурсіі па цэнтры папрасілі аказаць ім дапамогу ў падрыхтоўцы спецыялістаў-кінолагаў. Нямецкія памежнікі выказалі жаданне набыць у цэнтры 150 шчанюкоў. Увогуле, Смаргонскі пагранатрад становіцца своеасаблівай кіналагічнай «сталіцай», дзе праходзяць многія міжнародныя спаборніцтвы, семінары, трэнінгі для адмысловых спецыялістаў. Кожны месяц яго наведваюць у сярэднім не менш за тры замежныя дэлегацыі. У прыватнасці, сюды прыязджалі па вопыт памежнікі з літаральна ўсіх краін СНД, а таксама з Фінляндыі, Латвіі, Літвы і нават з Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. І ўсе былі ў захапленні ад выхаванцаў «смаргонскай акадэміі». Не сталі выключэннем і прадстаўнікі міжнародных арганізацый, паслы краін ЕС, якія днямі ўзялі ўдзел у цырымоніі ўрачыстага адкрыцця цэнтра. Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі ў Беларусі, Маддове і ва Украіне Іан Боаг быў прыемна ўражаны ўбачаным. Паводле яго слоў, грошы, выдаткаваныя ЕС на мадэрнізацыю цэнтра, выкарыстаны з вялікай карысцю не толькі для Беларусі, але і ўсёй аб'яднанай Еўропы. Як вядома, Беларусь мае самую працяглую мяжу ЕС — больш за 1200 кіламетраў — і Еўрасаюз вельмі зацікаўлены ў надзейнай ахове сваіх межаў ад пранікнення з Усходу нелегальных мігрантаў, кантрабандыстаў і патэнцыйных тэрарыстаў. Мадэрнізацыя кіналагічнага цэнтра — гэта толькі адзін з накірункаў плённага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам у сферы аховы мяжы. Усяго на гэтыя мэты ЕС выдаткавала для нашай краіны больш за 30 мільёнаў еўра.

І гэта самы пераканаўчы прыклад таго, што межы не павінны раз'яднюваць беларусаў і еўрапейцаў, а, наадварот, збліжаць нас.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Мінск—Смаргонь—Мінск.

Чатырохногія вартавыя мяжы штурмуюць «вогненную перашкоду».

Пасля суда

КАЛІ ЗУБЫ МОЦНЫЯ...

У адзін з чэрвеньскіх дзён жыхар в. Раздзялавічы Ганцавіцкага раёна на свайго легкавушцы лётаў на вялікай хуткасці па вёсцы, а калі на яго затрыманне прыехалі інспектар ДАІ і ўчастковы, то п'яны вадзіцель аказаў супраціўленне і яго з цяжкасцю ўдалося пасадзіць у машыну.

Па дарозе ў райцэнтр затрыманы накінуўся на інспектара, які сядзеў побач, і стараўся ўхапіць суседа зубамі. У адзін з момантаў яму гэта ўдалося і п'яны пракусіў інспектару руку.

І вось суд на тры гады пазбавіў вадзіцеля права кіраваць аўтамашынай, наклаў штраф у памеры 465 тысяч, а за пракушаную міліцэйскую руку прыгаварыў да трох гадоў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Грошы

Дэпазіты папоўніліся двума трыльёнамі Br

На аднаго жыхара Беларусі прыпадае 471,8 долара ва ўкладах

Сёлета ўкладчыкі датэрмінова — за 9 месяцаў — дайшлі да прагнознай верхняй мяжы ў прыросце дэпазітаў беларусаў на ўвесь год: за тры кварталы людзі папоўнілі банкаўскія дэпазіты ў пераразліку на нацыянальную валюту амаль на два трыльёны рублёў. Нагадаем, што асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі прадугледжвалася, што ўклады насельніцтва павялічацца на 1,7—2 трыльёны рублёў да канца года.

— Рублёвыя і дэпазіты ў замежнай валюце ў беларускіх банках за дзевяць месяцаў павялічыліся на 24,7 працэнта, — паведаміў апошнюю інфармацыю карэспандэнту «Звязды» **прэс-сакратар Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч.** — За гэты перыяд рублёвыя ўклады ўзраслі амаль на адзін трыльён рублёў (на 19,7 працэнта), а ў замежнай валюце — на 406 мільёнаў долараў ЗША (на 35 працэнтаў). Такім чынам, на пачатак кастрычніка агульная сума дэпазітаў грамадзян перавысіла 9,7 трыльёна рублёў. У нацыянальнай валюце яны склалі 6,4 трыльёна рублёў, або 65,5 працэнта ад агульнай колькасці прыцягнутых у банкаўскую сістэму сродкаў насельніцтва, а ў замежнай — у эквіваленце больш за 1,5 мільярда долараў (34,5 працэнта).

— Гэта значыць, ва ўкладах беларусаў па-ранейшаму перавага за сродкамі ў нацыянальнай валюце ў агульным аб'ёме прыцягнутых банкамі сродкаў насельніцтва?

— Так, што цалкам тлумачальна: па зберажэннях у нацыянальнай валюце ў параўнанні са зберажэннямі ў замежнай больш прывабныя ўмовы захоўвання. Прычым мы не першы год праводзім і ў далейшым будзем прытрымлівацца працэнтнай палітыкі, якая накіравана на забеспячэнне больш прывабных умоў па зберажэннях менавіта ў беларускіх рублях. Гэта значыць, працэнтная стаўка рублёвага ўкладу павінна прыносіць укладчыку большы даход, чым захоўванне валютнага ўкладу. Так, даходнасць па новых тэрміновых рублёвых укладах насельніцтва ў жніўні гэтага года склала 11,7 працэнта гадавых, павялічыўшыся да ўзроўню леташняга снежня на 0,8 працэнтнага пункта. А вось рублёвая даходнасць доларавых дэпазітаў фізічных асобаў ніжэй за даходнасць па тэрміновых дэпазітах у беларускіх рублях у сярэднім прыкладна ў два разы.

— Напрыклад, у студзені 2001 года на аднаго жыхара рэспублікі ў сярэднім на валютных і рублёвых укладах у банках прыходзілася ў эквіваленце 35,8 долара ЗША. Цікава, якая гэта сёння лічба?

— Розніца паміж названай лічбай і той, якая была на пачатак кастрычніка гэтага года, — больш як у 13 разоў. Паводле апошніх даных, на 1 кастрычніка ў сярэднім на аднаго беларуса прыходзілася 1013,9 тысячы рублёў ва ўкладах, або ў доларавым эквіваленце — 471,8 долара ЗША. Дарэчы, на 1 студзеня 2007 года ў сярэднім на аднаго жыхара рэспублікі прыходзілася 820 тысяч рублёў зберажэнняў, размешчаных у банкаўскіх укладах, аблігацыях і ашчадных сертыфікатах, што было эквівалентна 384,6 долара. Павелічэнне дэпазітаў сведчыць аб росце даверу людзей да банкаўскай сістэмы. Да таго ж, прытоку ўкладаў спрыяе і пашырэнне банкамі спектра дэпазітаў, далейшае развіццё рынку рознічных паслуг. Кліентам былі прапанаваны новыя віды зберажэнняў грашовых сродкаў з высокім узроўнем даходнасці.

Між іншым, паводле даных Нацбанка, у верасні рублёвыя і дэпазіты ў замежнай валюце павялічыліся ў пераразліку на нацыянальную валюту на 223,4 мільярда рублёў. Прычым рублёвыя ўклады выраслі на 101 мільярд, а ў замежнай валюце — на 122,4 мільярда рублёў. Магчыма, у дадзеным выпадку некаторыя ўкладчыкі зрабілі стаўку на расійскі рубель, за кошт чаго прырост дэпазітаў у СКВ атрымаўся большым. Як вядома, расійскі рубель у адносінах да долара мацнее, а працэнты па такіх дэпазітах дастаткова высокія. Тым не менш, эксперты раяць захоўваць грошы ва ўкладах у нацыянальнай валюце, даходнасць па якіх усё ж такі большая.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Тры болевыя кропкі «Беллегпрама»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі за дадзены перыяд павялічыўся на 31,4 працэнта ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. Зніжаецца і колькасць стратных суб'ектаў гаспадарання галіны — з 70 да 50, у тым ліку прамысловых прадпрыемстваў — з 50 да 35. За восем месяцаў выканана ўстаноўленае на дзевяць месяцаў заданне прыцягнуць інвестыцыі ў асноўны капітал (124,5 працэнта).

Закранаючы праблемныя пытанні, Эдуард Нарышкін, у прыватнасці, спыніўся на праблеме запасаў гатовай прадукцыі. Гэта праблема, прызнаўся старшыня канцэрна, за якую «Беллегпрам» часта крытыкуюць. Паводле яго слоў, сапраўды, запасы гатовай прадукцыі дастаткова высокія. Аднак ён звярнуў увагу прысутных на тое, што хоць на 1 кастрычніка яны склалі 259 мільярдаў рублёў, або 144 працэнты сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці, у адносінах да папярэдняга месяца запасы скараціліся ўжо на 12 працэнтаў, ці на 20 мільярдаў рублёў. Да канца года ў канцэрне разлічваюць выйсці на нарматыў у 120 працэнтаў. «Да канца года мы разлічваем выйсці на паказчык 120 працэнтаў, упершыню за пяць гадоў», — зазначыў кіраўнік «Беллегпрама». Між іншым, гаворачы аб прычынах утварэння запасаў на складах, Эдуард Нарышкін патлумачыў, што летам яны сфарміраваліся за кошт сезоннай прадукцыі, продаж якой актывізуецца ў асенне-зімовы перыяд. Акрамя таго, паведаміў старшыня канцэрна, назапашванне прадукцыі адбылося і з-за зніжэння попыту на яе ў сезон адпачынкаў.

Самым важным фактарам, які ўплывае на зніжэнне канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў, Эдуард Нарышкін назваў значны аб'ём «шэрага» і «чорнага» імпарту, звязаны з недакладным дэклараваннем тавараў у Расіі, а затым і ў Беларусі.

Яшчэ адну праблему старшыня «Беллегпрама» бачыць у тым, што за апошнія 20 гадоў не ўдавалася ў поўнай меры правесці тэхнічнае пераўзбраенне галіны. Аднак гэтая праблема таксама вырашальная. Прадпрыемствы канцэрна сёлета за дзевяць месяцаў інвеставалі ў тэхпераўзбраенне 57 мільярдаў рублёў — 90 працэнтаў гадавога задання. Да канца ж 2010 года на абнаўленне вытворчасці будзе накіравана каля 500 мільярдаў рублёў, што дазволіць знізіць знос асноўных фондаў удвая.

Паводле слоў кіраўніка канцэрна, у гэтым годзе «Беллегпрам» рэалізуе і шэраг мерапрыемстваў галіновай праграмы энергазберажэння, што дазволіць зэканоміць у цэлым 25,4 тысячы тон умоўнага паліва на суму 6,5 мільярда рублёў. У першым паўгоддзі выкананы мерапрыемствы па энергазберажэнні з эканамічным эфектам 2,3 мільярда рублёў. За гэты перыяд атрымана эканомія паліўна-энергетычных рэсурсаў 6,4 тысячы туп. Сярод найбольш значных праектаў, што рэалізуюцца сёлета, Эдуард Нарышкін назваў увод газапаршневай электрагенеруючай установкі ў ААТ «Слонімская КПФ», рэканструкцыя абпалу з установкай хуткаснай тунэльнай печы ў ЗАТ «Добрушскі фарфоравы завод». Мясцовыя віды паліва выкарыстоўваюцца на Аршанскім ільнокамбінаце, прадпрыемстве «Гранітэкс». Укараняюцца энергазберагальныя святільні на прадпрыемствах швейнай галіны.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Беларусь і Латвія

мяркуюць дасягнуць сёлета «знакавага рубяжа» ў гандлі

Учора ў Рызе пачаў працу Трэці латвійска-беларускі інвестыцыйны форум. Выступаючы падчас адкрыцця мерапрыемства, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Латвіі Аляксандр Герасіменка адзначыў, што форум праходзіць на фоне надзвычай актыўнага росту ўзаемнага гандлю паміж краінамі.

Латвійскаму бізнэсу належыць значны ўнёсак у нарошчванне інвестыцый у эканоміку Беларусі. Сёння суседняя краіна ўваходзіць у першую дзесятку замежных партнёраў рэспублікі па дадзеным паказчыку. Аб гэтым гаворыцца ў звароце прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага да ўдзельнікаў Трэцяга латвійска-беларускага інвестыцыйнага форуму.

Ён таксама адзначыў, што беларускі бок назірае «пастаянны рост цікавасці замежных інвестараў да беларускага рынку», што пацвярджаецца істотным прытокам інвестыцый з-за мяжы. «Толькі за першае паўгоддзе 2007 года прыток замежных інвестыцый павялічыўся больш чым у два разы ў параўнанні з узроўнем 2006 года».

За восем месяцаў гэтага года ўзаемны гандаль павялічыўся на 214 працэнтаў і склаў 647 млн долараў ЗША. «Думаю, да канца года можам дасягнуць знакавага рубяжа ў 1 млрд долараў», — дадаў Аляксандр Герасіменка.

Пасол паведаміў таксама, што сёлета ў форуме бярэ ўдзел «рэкордная колькасць аўтарытэтных дзелавых людзей, якія зацікаўлены ў развіцці эканамічных сувязяў паміж Латвіяй і Беларуссю».

Паводле слоў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Латвіі ў Беларусі Майры Мора, яна хоча, каб форум «выкарыстоўваўся для абмеркавання магчымага працэсу прыватызацыі ў Беларусі, што вельмі цікавіць латвійскіх інвестараў». У той жа час пасол звярнула ўвагу на тое, што магчымасць увядзення «залатой акцыі», якая сёння існуе ў Беларусі, «не падганяе» інвестараў Латвіі актыўна ўкладваць сродкі ў эканоміку краіны.

Міністр эканомікі Беларусі Мікалай Зайчанка адзначыў падчас адкрыцця форуму, што Латвія з'яўляецца для Беларусі надзвычай важным транзітным калідорам для экспарту тавараў. Амаль трэць грузаабароту марскіх портаў Латвіі прыпадае на беларускія грузы.

Мікалай Зайчанка адзначыў таксама, што сёння ўрад краіны імкнецца зрабіць так, каб інвестыцыйны асяроддак у краіне «быў прымальным для латвійскага бізнэсу».

Паводле слоў міністра зносінаў Латвіі Айнарса Шлесэрса, яго краіна ў будучым мае намер стаць дзяржавай, якая злучае два вялікія рынкі — былога Савецкага Саюза і Еўрапейскага саюза. Пры гэтым ён дадаў, што праз Латвію ў Беларусь могуць прыйсці інвестыцыі з іншых еўрапейскіх краін.

Падчас прэс-канферэнцыі, якая адбылася ў рамках форуму, Мікалай Зайчанка пракаментаваў заяву латвійскага боку адносна сітуацыі з «залатой акцыяй». Паводле слоў міністра, «сама па сабе «залатая акцыя» — не вынаходніцтва Беларусі. Гэта агульнапрынятая міжнародная норма. Іншая справа, што правілы яе прымянення маюць у Беларусі пэўныя асаблівасці. Мы сёння вывучаем гэтае пытанне. Мы чуем голас інвестара. І думаем, як зрабіць лепш».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ, *Рыга.*

Дзяржстандарт запрашае на On-line-канферэнцыю

Ці ўлічваюць дзеючыя ў Беларусі дзяржаўныя стандарты сучасныя патрабаванні рынку? Ці задавальняюць яны патрэбы і інтарэсы спажыўцоў тавараў і паслуг? Ці палепшылася апошнім часам якасць тавараў, якія рэалізуюцца ў краіне? Якія вы бачыце шляхі ўдасканалення сістэмы менеджменту якасці? Задаць гэтыя і іншыя пытанні беларусы змогуць падчас On-line-канферэнцыі кіраўнікоў Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь, якая адбудзецца на сайце Дзяржстандарта (www.gosstandart.gov.by) 10 кастрычніка з 11.00 да 12.30.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Таямнічыя дрэвы Заазерскага краю

Бяроза дапамагала зацяжарыць, а сасна сама сябе абараніла



Фота Андрэя КУНЦЭВІЧА.

У лесе паблізу вёскі Заазер'е Бялыніцкага раёна стаіць **бяроза**, якую здаўна лічаць цудатворнай. Тутэйшыя жыхары расказваюць, што дрэва дапамагала жанчынам зацяжарыць.

У беларускай народнай абрадавай традыцыі бяроза займае адметнае месца. Яна сімвалізуе жаночы пачатак. У адрозненне ад дуба, мужчынскага пачатку. Бяроза — гэта старадаўні сімвал абуджэння прыроды, урадлівасці, чысціні і святасці шлюбу.

Вядомы і лекавыя ўласцівасці бярозы. Яна добра ўплывае на здароўе чалавека: дастаткова ўзгадаць бярозавыя сок, пупышкі, лісце і венікі для лазні, кару і чагу.

Пенсіянер-настаўнік Пётр Ціхановіч з Заазер'я паказаў краязнаўцам і журналістам непадалёк ад дарогі, што вядзе да суседняй вёскі Мажаны, вялізную бярозу. Вось менавіта пра гэта дрэва старыя людзі гавораць, што да яго па дапамогу каліссці звярталіся жанчыны, якія не маглі зацяжарыць.

Пётр Ціхановіч таксама расказаў, што калісьці каля бярозы стаяў яшчэ і каменны крыж, на якім быў выбіты адмысловы крыж старажытнай багіні Мажаны (падобная назва суседняй вёскі, відаць, таксама невыпадковая). Мажана, альбо Марэна — гэта паганская боства, даволі страшнае, якое з цягам часу пераўтварылася ў дапаможніцу жанчын.

Таму мясцовыя людзі лічылі, што месца, дзе спалучыліся бяроза і знак Мажаны, валодае пэўнай сілай. Яны верылі, што сілы прыроды дапамагаюць жанчынам знайсці шчасце мацярынства.

— Каменнага крыжа Мажаны на тым месцы цяпер няма — яго скралі, — паведаміў бялыніцкі краязнаўца Міхась Карпечанка. — Аднак там праходзілі абрады і засталася энергетыка. Па-хрысціянску гаворачы — намоленасць. Праўда, цяжка сказаць, ці карыстаюцца тым старадаўнім абрадам сучасныя жанчыны. Гэта і ў старыя часіны заўсёды трымалася ў тайне, бо справа, сапраўды, інтымная.

Расказваюць, што жанчына, якая накіроўвалася да бярозы па дапамогу, павінна была ўзяць з сабой чыстае адзенне. Потым трэба было пралезці праз «вілку» альбо «рагатку», якую ўтвараюць дзве вершаліны дрэва. Пасля гэтага жанчына павінна была зняць з сябе старое адзенне і, як сімвал сваёй былой нямогласці, пакінуць яго на галінах бярозы. Пераапрануцца ў чыстае і… пачынаць новае жыццё.

Ёсць і яшчэ адно таямнічае дрэва ў заазерскім лесе, якое выявілася зусім нядаўна. Леснікі расказалі пра дзіўны выпадак.

Вялікая **сасна** расце ў лесе, дзе непадалёк месцяцца старажытны крыж і валуны, якія ў «Звядзе» мы назвалі «Заазерскім Стоўнхэнджам». Некалькі гадоў таму там суцэльна высякалі ўчастак лесу. Калі надышла чарга звaліць тую сасну, у рабоч

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 кастрычніка 2007 г. № 39 (93)

ЛІКБЕЗ

ТАМ, ДЗЕ ЁСЦЬ СПАДЧЫНА,

СПРАВА ПРОСТАЙ НЕ БЫВАЕ

Для таго, каб правільна і эфектыўна рэалізоўваць на практыцы палажэнні любога нарматыўнага заканадаўчага дакумента, яго спярша трэба дасканала вывучыць, разабрацца з нюансамі. Адзін з найбольш складаных для ўспрымання, а значыць, і для выканання старшынямі Саветаў пярвічнага ўзроўню з'яўляецца Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 03.02.2006 № 70 «Аб мерах па ўпарадкаванні ўліку і скарачэнні колькасці пустых і старых дамоў з гаспадарчымі і іншымі пабудовамі ў сельскай мясцовасці». Унесці яснасць дапамагаюць сустрэчы старшынь са спецыялістамі, якія праводзяць своеасаблівы ліктбез, «расшыфроўваюць» найбольш складаныя моманты дакумента. Днямі такая сустрэча адбылася ў Бабруйскім раёне, дзе перад старшынямі выступіла начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі мясцовага райвыканкама Галіна МІРГАРОДСКАЯ.

Паводле яе слоў, спецыяльна створаная пры раённым выканкаме камісія сёлета паспела наведацца ва ўсе сельсаветы (у 12 сельскіх і адзін пасялковы), правяла абследаванне ў 117 населеных пунктах. Па яго выніках было складзена 170 заключэнняў. Звесткі аб 122 дамах, якія падлягаюць уключэнню ў рэгістр уліку, былі змешчаны ў мясцовай газеце. Па васьмі дамах Глушанскага і Хімоўскага сельсаветаў у газеце былі змешчаны звесткі аб будучай падачы заяў у суд. Аб спыненні безгаспадарчага ўтрымання дамоў было напраўлена 125 прадпісанняў грамадзянам, пасля чаго ў сельскія выканкамы паступіла 58 паведамленняў ад грамадзян, якія пацвердзілі намер далейшага выкарыстання пустых і старых дамоў. Галіна Міхайлаўна звярнула ўвагу старшынь на тое, што на працягу трох дзён копіі паведамленняў грамадзян, завераныя подпісам старшыні сельвыканкама і пячаткай, павінны перадавацца ў райвыканкам. Усяго ў раёне ў рэгістр уліку былі ўключаны 22 пустыя дамы.

> Указ не прадугледжвае адбірання старога дома ва ўласніка без уручэння яму прадпісання

— За некалькі дзён да выезду сакратар камісіі падае спісы пустых дамоў у агенцтва па рэгістрацыі нерухомасці, дзе яго спецыялісты адшукваюць у архіве справы на азначаныя дамы (гэтыя паперы мы потым бяром з сабой на выезд), — расказала Галіна Міхайлаўна. — Практыка паказала, што прыкладна ў 90 працэнтах выпадкаў справы на патрэбныя нам дамы ў агенцтве знаходзяцца. (Па шэрагу дамоў нават маюцца адрасы новых уладальнікаў, якія набылі хаты, але сельвыканкамы ў вядомасць не паставілі.) На аснове гэтай інфармацыі старшыні сельвыканкамаў потым накіроўваюць абавязковыя прадпісанні аб спыненні безгаспадарчага ўтрымання дамоў. Прадпісанне адпраўляецца заказным пісьмом з паведамленнем і ўказаннем тэрміну яго выканання (ад 6 да 12 месяцаў). Нам даводзілася адпраўляць прадпісанні і за межы Беларусі: у Мурманск, Курск, Екацярынбург і ў іншыя гарады. Ёсць будынкі, на якія ўвогуле адсутнічаюць дакументы. Камісія правядзіць абмер такіх дамоў. Акрамя таго, спецыялісты агенцтва па рэгістрацыі нерухомасці на працягу тыдня робяць разлік іх фізічнага зносу, складаюць спіс абследаваных дамоў, пасля чаго камісія дае заключэнне па кожнаму.

У раёне адпрацавана такая практыка: спіс абследаваных дамоў складаецца па форме, зацверджанай Палажэннем аб парадку надрукавання звестак аб пустых жылых дамах (згодна з Пастановай Савета Міністраў ад 27.04.2006 № 559). Ён неабходны і для апублікавання звестак аб пустых дамах, якія падлягаюць уключэнню ў рэгістр уліку, і для дадатку ў рашэнне райвыканкама аб уключэнні ў рэгістр, а таксама для апублікавання звестак аб будучай падачы заявы ў суд.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ДВОЕ З АЛЬШЫНЫ...

Што такое хутар у нашым разуменні? Закінутае, Богам забытае месца, куды ні праехаць ні прайсці і дзе людзі пазбаўлены ўсіх радасцяў цывілізацыі? Магчыма, некалі так яно і было... Сёння хутар — гэта, хутчэй, філасофія. Адасобленасць ад «скучкаванага» грамадства, жыццё на ўлонні прыроды, аддаленасць ад мітусні, штурханіны, вірлівасці спрыяюць душэўнаму заспакаенню і ўнутранай раўнавазе. Людзі жывуць на хутарах з пакалення ў пакаленне, перадаючы ў спадчыну не проста дом і прысядзібны ўчастак, але і сваё светаўспрыманне — любоў да прыроды, зямлі, цярплівасць, працавітасць, трываласць, а яшчэ некаторую закрытасць і нешматслоўнасць...

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

У апошнія гады хутары ўсё часцей прыходзяць у заняпад і знікаюць — паміраюць старыя гаспадары, імкнецца ў гарады, бліжэй да выгод, моладзь... Не абышла гэта тэндэнцыя і Ашмянскі раён. Хутарскіх гаспадарак тут засталося сапраўды не так многа, як было некалі. Аднак гаварыць аб іх поўным заняпадзе пакуль не даводзіцца.

— Ой! А я і не прыбралася нават, — разгублена ўсміхаецца гаспадыня хутара (ён завецца Альшына) Караліна Альбертаўна Варковіч, калі мы цэлай «дэлегацыяй», са старшынёй райсавета Мікалаем Квяткевічам і старшынёй Гальшанскага сельскага Савета Войцэхам Коўзанам, без усякага папярэджання заходзім на двор... (Міжволі ўяўляю рэакцыю на падобную сітуацыю якога-небудзь гараджаніна. Напэўна, і дзверы няпрошаным гасцям не адчыніў бы — пабаяўся б, бо ўладу мясцовую ў твар не ведае.) Караліна Альбертаўна гасцінна запрашае ўсіх у дом, але навокал — такая прыгажосць, так красуе і пераліваецца ўсімі фарбамі восені прырода і так ярка свеціць сонца, што ні ў які дом ісці не хочацца.

— Можа, кавы? — пытаецца гаспадыня, імкнучыся дагадзіць гарадскім гасцям.

— Не, лепш вадзічкі — адтуль, — паказваем на калодзеж.

Пакуль з непараўнальнай ні з чым асалодай п'ём халодную ваду, літаральна смакуючы кожны глыток, Караліна Альбертаўна распавядае пра сваё жыццё-быццё... Хутар ёй дастаўся пасля бацькоў. Сюды 19-гадовая Караліна прывяла свайго Ігната, які да таго жыў, можна сказаць, па суседству. Тут і аселі, звілі сваё гняздо, нарадзілі двух сыноў... Караліна Альбертаўна працавала і ў мясцовай гаспадарцы, і на іншых работах, але па-сапраўднаму «прыкіпела» да паштовага аддзялення, што ў Каменцы, за 3—4 кіламетры ад хутара — засталася там надоўга, на 25 гадоў, адтуль і на пенсію пайшла.

— Мне работа паштальёна вельмі падабалася. Раней людзі столькі ўсяго выпісвалі — і газет, і часопісаў... Гэты «багаж» у маю сумку ніколі не ўмяшчаўся. Напакую яе з верхам і — наперад. Летам на веласіпедзе, зімой — пехам, ды без дарогі, па сумётах... На маім участку было чатыры вёскі і з добры дзесятак хутароў. Пакуль усіх абыдзеш, з усімі перагаворыш — сцямнее. Баялася, безумоўна, увечары хадзіць — адна, і лесам, і полем. Але Бог аберагаў ад нядобрага, ад ліхіх людзей. Ды і работа столькі радасці прыносіла!.. Многіх нашых хлопцаў тады за мяжу служыць пасылалі — у Германію, у Афганістан. Можаце сабе ўявіць, з якім хваляваннем маці чакалі пісьмаў ад сваіх сыноў, свету белага не знаходзілі... А пісьмы гэтыя насіла я. Як атрымаю такое на пошце — лячу як на крылах, у любое надвор'е, па бездарожы, бягу, каб хутчэй аддаць каштоўны канверт бацькам. Разам чытаем, разам смяёмся і плачам, радуемся, перажываем...

Ранейшыя дарогі, гаворыць Караліна Альбертаўна, ні ў якое параўнанне не ідуць з цяперашнімі. Сёння «асфальт» амаль пад самы дом падыходзіць... Надакучыць у хаце сядзець, можна без праблем даехаць на аўтобусе да цэнтра сельсавета ці да Ашмян. Ці сыну з дому ў Смаргонь патэлефанаваць — ён на сваёй машыне завязе. Але вялікай патрэбы ад'язджаць далёка ад хаты ў Варковічаў няма. «Уся цывілізацыя прыязджае да нас сама», — смяецца Караліна Альбертаўна. Гэта азначае, што два разы на тыдзень на хутары бывае аўталаўка. Сюды ж рэгулярна наведваецца медыцынскі работнік Каменскага ФАПа Святлана Урбан — дваццаць тры гады таму Ігнат Казіміравіч перанёс інсульт, доўга ляжаў, потым нанова вучыўся рухацца, размаўляць...

— Кожны раз, ідучы на медкамісію, спадзяваўся, што групу інваліднасці знімуць і дазволяць вярнуцца працаваць на ферму — не мог без працы сядзець... Але групу не знялі, — расказвае Караліна Альбертаўна. — Так пры доме і застаўся...

— Вялікая ў вас гаспадарка? — пытаемся.

— А як паглядзіш наўкола — усё наша, — жартуе Караліна Альбертаўна. — Участак — 60 сотак. Ёсць карова, кабанчык, куркі...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

НЕДААЦЭНЬВАЕМ ПРАБЛЕМУ?

Цяжкая праца з цяжкімі сем'ямі

Розных мерапрыемстваў, накіраваных на перавыхаванне так званых цяжкіх сем'яў, праводзіцца нямала, аднак колькасць і іх, і дзяцей, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, з кожным годам на тэрыторыі Путрышкаўскага сельсавета (самага вялікага па колькасці жыхароў у Гродзенскім раёне) не скарачаецца, а мае тэндэнцыю павялічвацца. У мінулым годзе такіх сем'яў было 14, сёлета — ужо 17. А ў цэлым па раёне — 41 сацыяльна небяспечная сям'я, дзе так ці інакш 90 непаўналетніх дзяцей. Спроба разабрацца ў гэтай сітуацыі была зроблена на сесіі Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў.

Сесія пачалася са справаздачы старшыні Путрышкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Франца Роўбы, а затым выступілі кіраўнікі чатырох навучальных устаноў раёна. Паслухаць — і сапраўды робіцца нямала. Адпаведныя комплексныя камісіі выязджаюць у праблемныя сем'і, складаюць індывідуальныя планы працы з імі. У школах працуюць саветы па прафілактыцы правапарушэнняў, праводзяцца бацькоўскія сходы па канкрэтных праблемах, анкетаванне псіхолагамі. На базе сельгаспрадпрыемства штогод ствараецца лагер, дзе школьнікі не толькі адпачываюць, але і далучаюцца да працы, і ў першую чаргу ў склад звёнаў уключаюць дзяцей з цяжкіх сем'яў. Работнікі Дома культуры запрашаюць іх у гурткі мастацкай самадзейнасці...

Далей лагічна было б узяць слова і іншым удзельнікам сесіі, паколькі ў парадку дня пазначылі менавіта сумесную работу Савета пярвічнага ўзроўню, а таксама прадпрыемстваў і арганізацый, што знаходзяцца на яго тэрыторыі, школ, клубных устаноў, участковых інспектараў і супрацоўнікаў інспекцыі па справах непаўналетніх. Аднак ахвотнікаў падзяліцца набалелым, сваімі меркаваннямі і прапановамі, на жаль, больш не аказалася. На што звярнула ўвагу намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыя Бірукова: «Недаацэньваем праблему. Няма трывогі ў зале».

І сапраўды, няўжо гэта праблема датычыцца толькі настаўнікаў? Хіба яны, да прыкладу, вінаватыя ў сітуацыі, калі ажно 62 працэнты дзяцей у школе патрабуюць да сябе «асаблівага падыходу», што ў немалой ступені залежыць ад вельмі неспрыяльнага становішча з рабочымі месцамі для іх бацькоў на тэрыторыі таго ж Сапоцкінскага пассавета? Ці ведаем абстаноўку ў праблемных сем'ях (а гэта кроўная справа сельскіх Саветаў праз тых жа старастаў), наколькі своечасова пачынаем уплываць на бацькоў і абараняць правы і законныя інтарэсы дзяцей? Што канкрэтна робяць у гэтым накірунку не толькі кіраўнікі сельвыканкамаў і педагогі, але і канкрэтныя раённыя службы?

На сёння ў Гродзенскай вобласці 3048 сірот, прычым, каля 95 працэнтаў з іх — пры жывых бацьках. Амаль 24 тысячы чалавек, у тым ліку больш за тры тысячы жанчын, стаяць на ўліку як алкаголікі. Рэальна ж бацькоў, якія злоўжываюць спіртным і не займаюцца выхаваннем сваіх дзяцей, здзекуюцца з іх, значна больш. Пры гэтым працаваць, як правіла, ахвоты няма. У цэлым па вобласці бацькі, чые дзеці знаходзяцца пад апекай дзяржавы, вінаватыя за іх утрыманне 7 мільярдаў рублёў. А ў Гродзенскім раёне заплацілі ўсяго каля 7 мільёнаў, хоць павінны — 173 мільёны рублёў. Шлях тут, напэўна, адзін — дапамагаць гэтым бацькам знайсці работу, калі трэба — вучыць той ці іншай спецыяльнасці. Не хочуць — працаўладкоўваць прымусова і забіраць грошы на ўтрыманне іх дзяцей. А што яшчэ зробіш?

З іншага боку, падкрэсліла Марыя Бірукова, трэба вучыць на добрым сямейным вопыце, заахвочваць такія сем'і, праводзіць для іх больш цікавых мерапрыемстваў.

На гэтай жа сесіі была зацверджана і непасрэдна звязаная з праблемамі сям'і «Праграма дэмаграфічнай бяспекі Гродзенскага раёна на 2007—2010 гады». Яна прадугледжвае меры для стымулявання нараджальнасці і ўмацавання сям'і, аховы здароўя насельніцтва і фарміравання здаровага ладу жыцця. Важна толькі, каб правільныя словы падмацоўваліся канкрэтнымі будзённымі справамі. У прыватнасці, было сказана на сесіі, трэба палепшыць надомнае абслугоўванне адзінокіх састарэлых людзей. А паколькі ў структуры смяротнасці ў раёне пераважаюць хваробы сістэмы кровазвароту, то ўсе аддаленыя населеныя пункты павінны быць забяспечаны элементарнымі танометрамі. Старшыня райвыканкама Ян Васілеўскі распарадзіўся да канца тыдня вырашыць гэта пытанне.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

УДАРЫМ ДЫСКАТЭКАЙ ПА ПАДЛЕТКАВАЙ ЗЛАЧЫННАСЦІ?

Галоўнай тэмай чарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў стала моладзевае пытанне. Падчас абмеркавання тэмы дэпутаты не толькі традыцыйна «рабілі справаздачы», але і гаварылі аб праблемах ажыццяўлення моладзевай палітыкі ў вобласці.

Дэпутат Пётр Южык, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама, адзначыў, што па даных на пачатак лета на ўліку ў цэнтрах занятасці ў якасці беспрацоўных былі зарэгістраваны 2066 маладых грамадзян (ва ўзросце да 29 гадоў), што складае 34 працэнты ад агульнай колькасці беспрацоўных. На жаль, на тых прадпрыемствах, куды бяруць на працу маладых людзей, няма замацаваных за імі вопытных спецыялістаў, якія маглі б многаму іх навучыць. У рэгіёне за 7 месяцаў 2007 года падлеткавая злачыннасць склала 8,2 працэнта ад усяго ўзроўню злачыннасці. Больш за 3 тысячы юнакоў і дзяўчат знаходзяцца пад наглядам нарколагаў.

Да пачатку наступнага года Віцебскім абласным Саветам дэпутатаў вырашана зацвердзіць гарадскія і раённыя праграмы «Дыскатэка», разлічаныя да 2010 года. Месцы правядзення такіх акцый будуць забяспечаны сучасным светлавым і гукавым абсталяваннем. Прадугледжана навучанне вядучых музычных праграм, арганізацыя абмену вопытам паміж імі. Запланавана таксама паставіць у дварах больш спартыўных канструкцый, у тым ліку і ў кожным сельскім населеным пункце, дзе пражывае моладзь. Будзе завершаны падбор у працоўных калектывах спецыялістаў, адказных за арганізацыю працы з моладдзю, і прадугледжана магчымасць матэрыяльнага стымулявання такой дзейнасці. Запланавана аказваць дапамогу ў працаўладкаванні па-за чаргой моладзі, якая вярнулася з месцаў пазбаўлення волі. Ім таксама будуць дапамагаць паступаць у навучальныя ўстановы.

Дырэктар віцебскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа дэпутат Аляксандр Цацоха адзначыў, што для прыцягнення моладзі да заняткаў фізкультурай і спортам могуць выкарыстоўвацца спартыўныя залы ў навучальных установах. Іх можна здаваць у арэнду для арганізацыі гурткоў, секцый. Але ж узнікаюць праблемы ў вячэрні час, бо нельга не выконваць патрабаванні па эканоміі электраэнергіі. Гэтая праблема будзе вывучацца.

Першы сакратар Віцебскага абласнога камітэта БРСМ, дэпутат Руслан Вінакураў адзначыў, што моладзь звальняецца з некаторых прадпрыемстваў з-за нізкай зарплаты. Зразумела, каму захочацца застацца ў калектыве, дзе плацяць не за самую лёгкую працу меней за 80 тысяч беларускіх рублёў у месяц? Пры тым, што байцы асобных студэнцкіх атрадаў усяго за 3 тыдні зарабляюць ад 200 да 500 тысяч рублёў. Дзіўна, што ў раёнах неахвотна запрашаюць моладзевыя сельскагаспадарчыя і будаўнічыя атрады на працу. Аддаюць перавагу «шабашнікам»?

— У горадзе Орша працуе толькі адзін з чатырох басейнаў, няма сучасных спартыўных збудаванняў, — адзначыў загадчык хірургічнага аддзялення Аршанскай гарадской бальніцы дэпутат Леанід Баярын. Орша даўно атрымала дрэнную рэпутацыю як «горад калоній». Пасля вызвалення былыя вязні не маюць магчымасці адаптавацца ў грамадстве, ды многія і не хочуць гэтага. Такіх людзей шмат, і яны могуць дрэнна паўплываць на моладзь. Таму моладзевую праблему на Аршаншчыне трэба вырашаць комплексна, улічваючы ўсе гэтыя нюансы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НАДО УЧИТЬСЯ ЗАРАБАТЫВАТЬ

Александр АТЯСОВ, председатель Витебского областного Совета депутатов:

— **Указ № 21 «О повышении роли органов самоуправления в решении вопросов жизнеобеспечения населения» очень важный и нужный. Впервые в истории первичного звена власти появился такой документ, который нацелен на повышение их роли и ответственности.**

Конечно же, иногда на местах можно услышать: мол, права теперь есть, нет денег... Но не надо забывать, что сиюминутной отдачи никогда не бывает. Указ появился в середине бюджетного года, когда все местные бюджеты — от областного до первичного уровня — были уже сформированы. По ходу надо было отрабатывать на местах выполнение соответствующих пунктов Указа о формировании бюджетов.

Указ — не одноразовый документ, он долгосрочный. С ним надо работать при формировании бюджета 2008 года (и последующих) на уровне местных бюджетов. На сегодняшний день прерогатива представительных органов власти — местные налоги и сборы. Эту возможность нужно эффективно использовать для пополнения бюджетов первичного уровня. Указ дал право засчитывать в бюджеты сельских, поселковых Советов налоги от продажи гражданам земельных участков, реализации и аренды имущества и т.д. Также теперь в бюджеты первичного уровня зачисляется и сбор с заготовителей сельскохозяйственной продукции, лекарственных трав, грибов. На Витебщине в этом направлении можно более активно работать как с индивидуальными предпринимателями, так и с организациями потребкооперации. Следует контролировать этот процесс.

В Придвинском крае есть положительные примеры по взиманию сбора за осуществление деятельности по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма. И словом, и делом инициативным людям, пожелавшим попробовать себя на этом поприще, помогали руководители первичных звеньев власти в Россонском, Миорском, Лепельском районах. И процесс пошел. Если раньше не было правовой базы по деятельности в сфере агроэкотуризма, то теперь есть соответствующий Указ, и сбор засчитывается только в бюджет сельских, поселковых Советов.

Также хорошо, что впервые Указом предусмотрено формирование резервных фондов сельских, поселковых Советов депутатов, стимулирование работы старейшин.

«Вышел Указ — на нас теперь больше возложено задач», — так могут посетовать некоторые председатели Советов. Деньги надо зарабатывать! Вот, например, коммунальное унитарное предприятие, созданное при Каменьском сельском Совете Лепельского района для оказания различных услуг. Есть комбайны, трактора с прицепами, мотопилы имеются... Оказываются услуги не только по заявкам на территории своего сельского Совета — и старое дерево спилят, и огороды обработают, и всё необходимое для благоустройства сельских населенных пунктов сделают.

Что касается вопроса передачи систем водообеспечения, дорог на баланс специализированных организаций, как и требовалось Указом, проведена инвентаризация. Есть различные мнения: кому именно передавать те же дороги? В Витебской области однозначная позиция — только дорожникам. Каждый должен делать свое дело: коммунальники — заниматься водой, дорожники — дорогами. Тем более что специальная техника, подготовленные работники есть только в дорожных организациях. В результате содержание тех же т. н. «внутрихозяйственных» дорог не такая уж и большая проблема.

Приходится слышать иногда: «Почему в Указе не прописано, например, как решать вопросы освещения населенных пунктов?». Эта проблема решается на местном уровне. Просто надо утвердить, кто должен снимать показания счетчиков, менять лампочки, производить расчет за потребленную энергию. В каждом районе есть энергетики. Необходимо просто расставить все точки над «і», и не будет никаких вопросов. Так и при формировании бюджетов. Указ не может фактически прописать все нюансы, иначе мы получили бы документ толщиной в несколько томов.

Указ № 21 дал толчок и для решения проблем технической оснащенности сельсоветов. Уже нет таких, где для работы использовали бы только один телефонный аппарат. Сельсоветы полностью оснащены всем необходимым. Другое дело, оборудование стареет. Автомобили председателей требуют с годами замены. Это тоже проблема местных властей.

Численность работников сельского Совета, как отмечено в Указе, зависит от нескольких факторов. Существует определенный штатный лимит, в пределах которого местные органы власти могут определять: сколько работников необходимо в сельском Совете. Но, как показывает практика работы в том же Каменьском сельсовете, работа дополнительных сотрудников может оплачиваться за счет хозрасчетной деятельности.

> *На пытанне аб тым, як ідзе рэалізацыя Указа Прэзідэнта № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва», адказваюць старшыні абласных Саветаў дэпутатаў.*

Важным моментом исполнения Указа стало образование при Совете Республики Совета по взаимодействию органов местного самоуправления. Такой Совет начал действовать, действовать и весьма эффективно. Обсуждаются актуальные и проблемные вопросы, соответственно, вырабатываются рекомендации, которые используются в практической деятельности первичного звена.

Указ дает возможность первичному звену власти развиваться. Главное, надо умело научиться пользоваться теми возможностями, которые предоставлены.

СКЛАДАЦЬ БЮДЖЭТ — ТАКСАМА НАВУКА

Сяргей АШМЯНЦАЎ, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў:

— Фарміраванне бюджэтаў сельскіх і пасялковых Саветаў на наступны год пачалося з вызначэння патрэб і дакладнай іх фармулёўкі. З пачатку года мы правялі некалькі семінараў для кіраўнікоў пярвічнай улады, дзе іх вучылі ў тым ліку і складаць свой бюджэт, паказвалі лепшы вопыт. Сёння можна сказаць, што абсалютная большасць старшынь сельскіх Саветаў вызначыліся з патрэбамі сваіх вёсак і тэрыторый, маюць дакладнае ўяўленне, колькі сродкаў неабходна на наступны год для забеспячэння сацыяльных стандартаў і падтрымання жыццядзейнасці жыллёва-камунальных і іншых аб'ектаў.

На нядаўнім пасяджэнні прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў мы разгледзелі пытанне фарміравання бюджэту сельскага Савета на прыкладзе сельскіх органаў улады Пружанскага і Брэсцкага раёнаў. Падчас разгляду давялося канстатаваць, што сельскія Саветы не дастаткова актыўна вядуць работу па продажы маёмасці і зямельных участкаў, па прыцягненні на свае тэрыторыі малога і сярэдняга бізнэсу. Стварэнне суб'ектаў гаспадарання па вытворчасці, нарыхтоўцы, перапрацоўцы сельгаспрадукцыі, прадастаўленне ім на ўмовах арэнды памяшканняў і зямельных участкаў дазволіла б павялічыць уласную даходную базу бюджэтаў і, адпаведна, павялічыць расходы.

Недастаткова выкарыстоўваюцца рэзервы папаўнення бюджэтаў ад аграэкатурызму. Найбольшая колькасць турыстычных сядзіб створана ў Камянецкім, Бярозаўскім, Брэсцкім раёнах. А вось у Ганцавіцкім, Маларыцкім, Іванаўскім, Ляхавіцкім, Пінскім такіх прыкладаў наогул няма.

Рашэннем прэзідыума аблсавета старшыням сельскіх Саветаў прадпісана забяспечыць поўны збор падаткаў з нарыхтоўшчыкаў сельгаспрадукцыі, лекавых траў, грыбоў, ягад. Як паказвае практыка, гэта дзейсны спосаб папаўнення бюджэту, асабліва ў тых сельсаветах, якія размешчаны ў лясной зоне. Напрыклад, сёлета ўпершыню ў Пружанскім раёне ўдалося такім чынам сабраць 55 мільёнаў рублёў. Гэтыя сродкі пойдуць на канкрэтныя аб'екты ў справе добраўпарадкавання, або паляпшэння тэрыторый. Грошы павінны быць у запасе. Здараюцца ж патрэбы і тэрміновыя. Нават аварыйнае дрэва прыбраць абыходзіцца ў некалькі соцень тысяч рублёў. А на той жа Пружаншчыне такіх дрэў ужо каля тысячы. Можна крыху папоўніць бюджэт, калі ўважліва сачыць за даўгабудамі на сваёй тэрыторыі. За незавершанае своечасова будаўніцтва гаспадару аб'екта патрэбна плаціць падатак.

Варта, думаю, лічыць здабыткам такую практыку, калі пры фарміраванні раённых бюджэтаў на наступны год сродкі на асвятленне сельскіх вуліц закладваюцца асобным радком. Гэта ў нас ужо ёсць. Мы палічылі сваім абавязкам накіраваць Саветы пярвічнага ўзроўню на тое, каб яны прадугледзелі ў бюджэтах затраты на водазабеспячэнне сельскага насельніцтва і ўзялі на сябе частку затрат грамадскіх лазняў.

ТАМ, ДЗЕ ЁСЦЬ СПАДЧЫНА...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Зыходзячы з Указа, — тлумачыць начальнік жыллёва-камунальнага аддзела Бабруйскага райвыканкама, — у суд падаецца альбо заява аб прызнанні пустога дома безгаспадарчым і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, а таксама аб адбіранні зямельнага ўчастка, на якім размешчаны гэты дом, калі азначаны зямельны ўчастак знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, альбо заява аб адбіранні старога дома ва ўласніка шляхам яго выкупу адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай ці перадачы адпаведнаму выканаўчаму камітэту для продажу з таргоў, а таксама аб адбіранні зямельнага ўчастка, на якім размешчаны азначаны дом, калі гэты зямельны ўчастак належыць грамадзяніну на праве ўласнасці.

У першым выпадку абавязак перадачы заявы ў суд ускладаецца на раённыя выканаўчыя камітэты. У другім — на выканаўчыя камітэты пярвічнага ўзроўню. У заяве аб прызнанні пустога дома і маёмасці, якая ў ім ёсць, безгаспадарчымі, неабходна **дакладна ўказаць, кім і калі было прынята рашэнне аб уключэнні жылога дома ў рэгістр уліку, якая рухомая маёмасць падлягае прызнанню безгаспадарчай, яе асаблівыя прыметы, а таксама доказы, якія пацвярджаюць адмаўленне гаспадара ад права ўласнасці на яе.** Да заявы павінны прыкладацца дакументы, абазначаныя ў пункце 7 Указа, а таксама дакументы, якія сведчаць аб апублікаванні звестак аб пустых дамах і звестак аб будучай падачы заявы ў суд. У выпадку, калі справа датычыцца і адабрання ўчастка, на якім размяшчаецца пусты дом, да заявы неабходна яшчэ дадаць дакумент, які пацвярджае права ўласнасці грамадзяніна на зямельны ўчастак.

Да заявы аб адабранні старога дома ва ўласніка трэба прыкласці рашэнне выканаўчага і распарадчага органа аб прызнанні жылога дома непрыдатным для пражывання; доказы таго, што ўласнік дома на працягу апошняга года ў ім не пражывае і не прымае мераў для прывядзення яго ў добры стан (акт, даведка і г.д.); паведамленне аб ўручэнні ўласніку прадпісання аб спыненні безгаспадарчага ўтрымання дома; доказы невыканання ім ва ўстаноўлены тэрмін гэтага прадпісання (акт, даведка). Прынамсі, Указ не прадугледжвае адбірання старога дома ва ўласніка без уручэння яму прадпісання.

— У нас па кожным сельскім Савеце фарміруецца асобная папка, куды мы збіраем усе патрэбныя дакументы, — адзначыла Галіна Міхайлаўна. — У сувязі з тым, што ў мінулым годзе

Работа па Указу № 70 складаная і карпатлівая, і большая яе частка ўскладзена на старшынь сельвыканкамаў

час быў упушчаны, сёлета мы (аддзел ЖКГ) узялі на сябе такую ініцыятыву і абследавалі сельскія населеныя пункты раёна. Часта спісы, якія падавалі старшыні сельвыканкамаў, аказваліся недакладнымі. Напрыклад, нумар дома, згодна з дакументамі агенцтва па рэгістрацыі нерухомасці, — 15-ы, а насамрэч — 12-ы. Пад'язджаем да другога дома, а там толькі фундамент. Сама хата даўно згарэла. У выніку мы абследавалі 326 дамоў, а заключэнняў склалі толькі 170. Падкрэслю: работа па Указу № 70 складаная і карпатлівая, і большая яе частка ўскладзена на старшынь сельвыканкамаў. Першы крок, які трэба зрабіць у гэтым накірунку, — «прачасаць» увесь населены пункт ад пачатку да канца, узяць на заметку старыя і пустыя дамы. Потым выбраць час і папрацаваць дзень у агенцтве па рэгістрацыі нерухомасці — зверыць нумарацыю дамоў. Гэта варта зрабіць да таго, як спісы будуць перададзены ў райвыканкам. Калі ў населеным пункце раней нумарацыі не было, шукайце дакументы на дом па прозвішчы ўласніка.

Пытанняў наконт Указа ўзнікае шмат. Сёння 22 будынкі ўжо ўключаны ў рэгістр уліку, у двух сельсаветах вядзецца апублікаванне звестак аб будучай падачы заяў у суд. Літаральна некалькі тыдняў таму ў Хімоўскім сельсавеце пасля таго, як уся працэдура была праведзена, аб'явіўся ўласнік на дом. Аднак суд усё роўна адбудзецца. І толькі паводле рашэння суда ўласнік зможа ўступіць ў свае правы.

Галіна Міхайлаўна растлумачыла розніцу паміж старым і пустым домам. Працэнт зносу старога дома павінен быць 65 і больш. Аднак адной гэтай умовы яшчэ недастаткова. Старымі лічацца дамы, што знаходзяцца ў прыватнай уласнасці ў сельскай мясцовасці (за выключэннем жылых дамоў, якія аднесены заканадаўствам да катэгорыі службовых памяшканняў) з гаспадарчымі і іншымі пабудовамі, у адносінах да якіх на 1 студзеня 2007 года маюцца дакладныя звесткі аб тым, што дадзеныя дамы ўтрымліваюцца безгаспадарча (гэта значыць іх уласнікі на працягу апошняга года не пражываюць у іх і не прымаюць мераў для добраўпарадкавання) і прызнаныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку не адпаведнымі санітарным патрабаванням.

У кожным райвыканкаме акрамя камісіі па рабоце з Указам №70, ёсць міжведамасная камісія па абследаванні жыллёвага фонду. Яна і вызначае, што стан канкрэтнага дома не адпавядае санітарным патрабаванням, растлумачыла Галіна Міргародская.

— Калі ў вашым населеным пункце ёсць напаўразбураны дом, аднак у яго знайшоўся ўласнік, — уручайце яму прадпісанне добраўпарадкаваць дом у пэўны тэрмін. Калі ён гэтага не зрабіў, няхай пісьмова пацвердзіць, што бярэ на сябе абавязак ва ўказаны тэрмін дом ліквідаваць, а не можа сам — зноў жа пісьмова дае згоду на ліквідацыю.

Уцэлым на 2007 год раёну на выкананне Указа № 70 было выдаткавана 13 млн рублёў. «Большую частку грошай мы пакуль не патрацілі, — прызналася Галіна Міхайлаўна. — Прытрымліваем іх, бо напарадзе — суды. Увогуле, працаваць з Указам № 70 цяжка, трэба вытрымліваць жорсткія тэрміны (напрыклад, у верасні ты змясціў публікацыю ў газеце, у кастрычніку выканкам прыняў рашэнне аб уключэнні дома ў рэгістр уліку, у лістападзе ты зноў павінен даць паведамленне ў «раёнку» — аб будучай падачы заявы ў суд). Там, дзе ёсць спадчына, справа простай не бывае. Аднак Указ трэба як след вывучыць і наладзіць сістэму, тады і рэалізоўваць яго на практыцы будзе прасцей.

Інга МІНДАЛЁВА.

Бабруйскі раён.

РЫНАК ПРАЦЫ

ЗНЯЦЬ — ЯШЧЭ НЕ ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ

Паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, за апошні год узровень афіцыйна зарэгістраванага беспрацоўя на Брэстчыне зменшыўся з 1,7 да 1,4 працэнта. Прычым гэта адбылося нягледзячы на тое, што з пачатку года па дапамогу ў працаўладкаванні звярнулася каля 34 тыс. жыхароў вобласці, або адразу на 24 працэнты больш, чым за аналагічны перыяд летась.

Крыху статыстыкі. З пачатку года на Брэстчыне ўдалося стварыць 13,7 тыс. рабочых месцаў, працаўладкаваць 21 тыс. чалавек, апроч таго, 1,7 тыс. беспрацоўных былі накіраваны на прафесійную падрыхтоўку, 8,2 тыс. паўдзельнічалі ў грамадскіх работах, а 404 жыхары рэгіёна атрымалі дапамогу ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. Усё гэта дазволіла палепшыць сітуацыю на рынку працы ў 10 з 16 раёнаў, і ў тым ліку знізіць беспрацоўе ў традыцыйна «праблемных» Ганцавічах, Мікашэвічах, Іванаве, Бярозе і Белаазёрску. Разам з тым, паводле слоў начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалая Коханава, можна казаць аб некаторых даволі сур'ёзных праблемах. У прыватнасці, менавіта Брэстчына аказалася ў аўтсайдарах па такім паказчыку, як накіраванне беспрацоўных на прафесійнае навучанне.

Не менш востры застаецца сітуацыя па сельскай мясцовасці. Сёлета тут з'явілася 1,5 тыс. новых працоўных месцаў, што значна перавысіла першапачатковыя планы. Аднак у той жа час малюнак па некаторых аграгарадках застаецца сумным. Скажам, зараз на 51 беспрацоўнага ў вёсцы **Хатынічы Ганцавіцкага раёна** прыпадае толькі 5 свабодных месцаў, на 40 беспрацоўных у вёсцы **Тышкавічы Іванаўскага раёна** — 3, а на 20 беспрацоўных **вёскі Белавуша Столінскага раёна** і ўвогуле няма ніводнай вакансіі. Застаецца напружаным становішча ва ўжо ўведзеных у мінулыя гады аграгарадках **Моталь Іванаўскага і Рубель Столінскага раёнаў.** Пры гэтым аналіз паказвае, што значная частка сродкаў на стварэнне рабочых месцаў у вобласці ідзе ў буйныя гарады.

Акрамя таго, ёсць заўвагі наконт стылю работы некаторых раённых службаў занятасці. Некаторыя з іх, канстатуюць у міністэрстве, па сутнасці працуюць згодна з сумнавядомым прынцыпам «няма чалавека — няма праблемы». «На жаль, мы навучыліся здымаць людзей з уліку з любой «зручнай» нагоды, да прыкладу, пры адмове ад двух прапаноў работы, якая падыходзіць па спецыяльнасці, вопыту, адукацыі і ўзроўню заробкаў — кажа Мікалай Коханаў. — Сапраўды, закон гэта дазваляе. Але ў тым жа законе вызначана, што за адмову ад двух прапаноў такога месца работы беспрацоўныя **не павінны**, а толькі **могуць** здымацца з уліку. Таму «спрошчаныя трактоўкі» тут не падыходзяць. І больш за тое, у выніку іх з'яўляюцца новыя праблемы. Спачатку мы фактычна «заганяем» беспрацоўных у «цень», а потым будзем прымаць захады па ўцягненні іх у легальную эканамічную дзейнасць».

Тым часам варта звярнуць увагу на адзін па-сапраўднаму няпросты момант. Зараз з прыкладна 198 тыс. індывідуальных прадпрымальнікаў больш за 80 тысяч маюць наёмных работнікаў. Апошні тэрмін на перарэгістрацыю такіх прадпрымальнікаў заканчваецца 15 ліс-

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

тапада, аднак пакуль колькасць выпадкаў перарэгістрацыі застаецца нязначнай, а многія з ІП не плануюць праходзіць яе ўвогуле. Гэта, мяркуюць у міністэрстве, пацягне за сабой скарачэнне колькасці наёмных работнікаў і можа прывесці да звароту ў службы занятасці 30—60 тыс. чалавек. У такой сітуацыі, заўважае Мікалай Коханаў, варта прадугледзець стварэнне большай колькасці рабочых месцаў у новых мясцовых праграмах занятасці. Пры гэтым агульныя планы тут застаюцца ранейшымі — да канца 2010 года ўзровень беспрацоўя ў найбольш складаных рэгіёнах павінен наблізіцца да адзнакі ў 1 працэнт ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва.

Сяргей ГРЫБ.

ДВОЕ З АЛЬШЫНЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

З участкам самі мы не справіліся б — дапамагаюць СВК «Доргішкі», суседзі, сацыяльны работнік і, зразумела ж, сыны. Корм для каровы гаспадарка выдзяляе нам бясплатна. Паліва — брыкет і дровы — абыходзяцца таксама нядорага. Ды і за здадзенае малако грошы атрымліваем. Так што пенсіі — 517 тысяч на дваіх — хапае. Яшчэ і дзецям з сабой тое-сёе ў торбачку зложым, як прыедуць...

Сыны ў Караліны Альбертаўны і Ігната Казіміравіча цяпер гараджане: старэйшы жыве ў Смаргоні, малодшы — у Мінску. Але вясковай працы не цураюцца. Зямля, што на хутары Альшына, родзіць дзякуючы таксама і іх намаганням. Як любыя бацькі, Варковічы-старэйшыя радуюцца, калі атрымліваецца сабрацца сям'ёй — з нявесткамі, з унукам (ён пакуль што адзін). У Караліны Альбертаўны для такіх выпадкаў ужо напрыгатове свае смятанка, малако, масла...

— Маслабойкай яго ўзбіваеце?

— Ды не, дзеткі, з ёю клопаты адны. Ніякая маслабойка з рукамі не параўнаецца...

Пірагі гаспадыня не пячэ з таго часу, як сыны разабралі печку. А вось над блінамі ды над беларускай верашчакай варожыць часта. Асабліва калі хоча дагадзіць нявесткам.

— Як прыедзе каторая, я ўжо і без напамінаў ведаю — трэба гатаваць верашчаку. Раблю яе паводле старадаўняга рэцэпта, як бабуля навучыла: падсмажваю парэзаную на кавалачкі свежаніну з цыбуляй ці сваю каўбаску, разбіваю яечка, дадаю разведзенай на малацэ мукі, прыпраўкі, спецый... Можа, людзі і лепш умеюць гатаваць, але нявесткі маю верашчаку вельмі хваляць.

На здароўе Караліна Альбертаўна скардзіцца не прывыкла, хоць з гадамі яго, безумоўна, больш не стала.

— Калі чалавек прачнуўся, і ў яго нічога не баліць, значыць, ён не жывы, — смяецца яна.

Аптымізму і жыццялюбству Варковічаў можна толькі па-добраму пазайздросціць... Падчас пазіравання перад фотакамерай Караліна Альбертаўна «камандавала парадам» — кіравала дзеяннямі мужа: «Ну давай ужо, абдымай мяне! Ці ты забыўся, як гэта робіцца?!» І Ігнат Казіміравіч падпарадкоўваўся жонцы з відавочным задавальненнем...

— Сорак шэсць гадоў мы разам, але праляцелі яны, як адзін дзень. Былі дзеці малыя, былі клопаты, гаспадарка, праца. Усяго было — і спрэчак, і ладу. Азірнуцца не паспелі, а ўжо вечар на дварэ. Але мы амаль што не сумуем. Тут у нас весела, асабліва летам...

Каб сумавалася яшчэ менш, дзеці дапамаглі ўсталяваць на доме «талерку» — спадарожнікавую антэну. Тэлевізійных каналаў цяпер стала намнога больш, але Варковічы па-ранейшаму аддаюць перавагу беларускім. А яшчэ Караліна Альбертаўна прызвычаілася да серыялаў — не на жарт перажывае і за Белінду, і за Таццяну...

...Пяць гадоў таму на хутары адбылася трагедыя — з-за няспраўнай электраправодкі ўзнік пажар, падчас якога дом Варковічаў згарэў практычна цалкам — засталіся адны сцены.

— Не ўяўляю сабе, што б мы рабілі без падтрымкі людзей і гаспадаркі... Тады Мікалай Праўко толькі-толькі ўзначаліў наш СВК і нас амаль не ведаў. Але імкнуўся дапамагчы чым толькі мог, за што вялікі яму дзякуй. А больш за ўсё ўразілі людзі з суседніх вёсак — Навасядаў, Норштаў, Каменкі. Яны прыносілі грошы, дапамагалі разграбаць папялішча, будавацца, падтрымлівалі і словам, і справай. Так што цяпер можна сказаць, што дом наш мы ўзводзілі ўсім светам...

Наталля КАРПЕНКА.

Ашмянскі раён.

ФАНТАН НА ПАДВОРКУ

Магілёўскі раён правядзіць агляд-конкурс на лепшы населены пункт і лепшую прыватную сядзібу.

Кожны сельскі Савет раёна вылучае на конкурс сваіх прэтэндэнтаў, потым вёскі і прыватныя падворкі аглядае спецыяльная камісія і журналісты. Вынікі будуць падведзены напрыканцы года, а пераможцы ўзнагароджаны на злёце перадавікоў. Прэміі, якія выплачваюцца з раённага бюджэту — 5 базавых велічынь.

Прэтэндэнтаў зашмат, але пакуль што найбольшае ўражанне засталося ад сядзібы Бутавых з вёскі Таранава Кадзінскага сельсавета. Там добраўпарадкаваны і ўпрыгожаны кожны куток. Альтанка, керамічныя фігуры і вазы, печка для прыгатавання шашлыкоў і беларускіх страў, арэлі, лазня, якая глядзіцца як невялікі рэстаран, у дварэ ёсць нават фантан.

Асобны конкурс арганізаваны і для маладых сем'яў. Праўда, там ёсць адна ўмова: акрамя парадку, чысціні і ўтульнасці, у гаспадарцы маладых павінна быць жывёла і агарод. Інакш кажучы, не толькі знешняя прыгажосць, але і ўнутраны змест падворка.

Ілона ІВАНОВА.

КАБЕЛЬНАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ ПРЫЙДЗЕ ДА ВАС...

Жыхары прыкладна 60 тысяч сталічных кватэр глядзяць толькі тры тэлевізійныя каналы. Роўна столькі ў стане трансляваць звычайныя антэны эфірнага прыёму, што знаходзяцца на дахах дамоў, якія пабудаваны ў самым цэнтры горада. Справа ў тым, што ў цэнтральных раёнах кампаніі-аператары не ствараюць сетак размеркавальных сістэм кабельнага TV. Таму для таго, каб кожны мінчанін меў магчымасць глядзець дома разнастайныя праграмы і перадачы, будзе створана спецыяльная камісія, якая дапаможа развіццю і будаўніцтву сетак перадачы даных.

— Кожны жадае, каб яго тэлевізар паказваў не тры, а значна больш каналаў. Раней некаторыя кабельныя аператары мелі прывілеі і будавалі свае сеткі па ўсім горадзе, а іншыя — толькі на пэўных вуліцах. Узвядзенне сістэм перадачы даных вялося, такім чынам, хаатычна, — каментуе дырэктар унітарнага прадпрыемства «Мінскія тэлевізійныя інфармацыйныя сеткі» Віктар Бычкоў. — Работа камісіі дапаможа вызначыць перспектыву інфармацыйна-тэлекамунікацыйнай інфраструктуры сталіцы, наладзіць парадак у дзейнасці гэтых кампаній. Сеткі кабельнага тэлебачання пачнуць зараз стварацца раўнаважна ва ўсіх раёнах, пры гэтым будуць вельмі пільна сачыць за якасцю работ, аб'ёмамі і тэрмінамі іх выканання. Кожны кабельны аператар мае права накіраваць заяўку ў камісію, якая стане выдаваць дазвол на стварэнне новых сетак, адпаведна са створаным планам іх будаўніцтва.

Акрамя таго, у будучым кабельныя аператары пачнуць актыўна прадаваць новыя паслугі. Напрыклад, «Мінскія тэлевізійныя інфармацыйныя сеткі», якія на сённяшні момант абслугоўваюць найбольшую колькасць сталічных кватэр, дакладней, тэлевізараў мінчан, толькі сёлета накіруюць 2 мільярды рублёў на будаўніцтва інфармацыйных сетак, іх мадэрнізацыю. У прыватнасці, прадпрыемства стварае ўласныя сістэмы на базе оптыка-валаконных ліній сувязі. Гэта дае магчымасць прадастаўляць паслугі не толькі прыёму тэлевізійных каналаў, але і хуткаснага Інтэрнэта.

— У гэтым годзе мы плануем правесці сеткі кабельнага тэлебачання і запусціць праз нашы сістэмы паслугу выхаду ў Інтэрнэт у раней не ахопленых раёнах сталіцы. На вуліцах Кабушкіна, Шышкіна, Тухачэўскага, на Партызанскім праспекце. Да канца года жыхары Заводскага раёна будуць глядзець трыццаць каналаў тэлебачання і выходзіць праз нашы сеткі ў сусветнае павуцінне, — узгадаў Віктар Бычкоў. — Колькасць абанентаў складзе больш за дзевяць тысяч.

З ліпеня пачалася работа па стварэнню кабельных сістэм на вуліцах Калініоўскага і Сядых. Замест трох каналаў тэлебачання ў кватэрах будуць прымацца трыццаць. Да 2008 года ад раёна Захад да кальцавой дарогі ўся тэрыторыя будзе таксама ахоплена кабельнымі каналамі і магчымасцю выйсці праз гэтыя сеткі ў Інтэрнэт, у Лошыцы з'явіцца оптыка-валаконная лінія. Будаўніцтва пачнецца сёлета. Як расказаў спецыяліст, за 2007 год плануецца скараціць на 15 тысяч колькасць тых кватэр, дзе яшчэ транслюецца толькі тры тэлевізійныя каналы.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

АБАРОНА СТАРЫМ АД ПАЖАРАЎ

У Магілёўскай вобласці пачалася дабрачынная акцыя «Бяспечны дом». На працягу кастрычніка ў кватэрах і жылых дамах састарэлых людзей будзе ўсталявана тысяча аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. Прыборы закупіў філіял «Белдзяржстраха», акцыю падтрымала абласное ўпраўленне МНС. Установка будзе рабіцца бясплатна, паводле спісаў малазабяспечаных старых.

Апавяшчальнікі рэагуюць на дым рэзкім гукавым сігналам, які пабудзіць гаспадара альбо ўстрывожыць суседзяў. Гэта дазваляе своечасова выявіць пажар, захаваць жыццё і маёмасць. У Магілёўскай вобласці апавяшчальнікі перш за ўсё ставяць у жытле адзіноких і састарэлых людзей, інвалідаў, шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў. Гэта работа дазволіла сёлета скараціць колькасць пажараў у дамах гэтай катэгорыі грамадзян у пяць разоў.

Ілона ІВАНОВА.

У ВЁСЦЫ — НОВЫ ДЗІЦЯЧЫ САДОК

У вёсцы Сумарокава Магілёўскага раёна пабудавалі дзіцячы садок. Гэты аб'ект належыць сельскагаспадарчаму прадпрыемству «Авангард».

Сумарокава — вялікая вёска, у ёй жыве 450 чалавек. Сёлета яна стане аграгарадком. Як паведамілі ў Княжыцкім сельскім Савеце, раней вяскоўцы з Сумарокава вазілі малых у суседнюю вёску і нават у Магілёў, які непадалёку. Новы дзіцячы садок прыме дзве групы дзяцей — а гэта каля паўсотні месцаў. Цяпер у новым будынку ідуць аддзелачныя работы, а ўрачыстае адкрыццё запланавана на кастрычнік.

Ілона ІВАНОВА.

НАШ ЛЕС — НАМ І ПЕРАРАБЛЯЦЬ

14-я міжнародная спецыялізаваная выстаўка ў Мінску «Дрэваапрацоўка-2007» прадэманстравала сучасныя падыходы і прапановы па выкарыстанню дзелавой драўніны з мінімальнымі выдаткамі. У тым ліку і ў сферы малога бізнэсу.

У многім цікавасць да выстаўкі выклікана, з аднаго боку, запатрабаванасцю лесу як важнай сыравіны для мэблевай, дрэваапрацоўчай і іншых галін, а з іншага, вяртаннем сельскіх жыхароў да традыцыйных беларускіх рамёстваў, узнікненнем і развіццём у глыбінцы малых прадпрыемстваў нездзяржаўнага сектара эканомікі. Гэтыя і іншыя абставіны, неабходнасць з максімальнай карысцю на месцах распараджацца лясным рэсурсамі. У тым ліку і безгатунковай драўнінай, вызначалі тэматыку выстаўкі. У яе экспазіцыі, напрыклад, былі прадстаўлены невялікія сучасныя станкі, якія па кішэні і пачынаючаму ці дробнаму прадпрымальніку з вёскі, пасёлка. Гэтае абсталяванне можна эксплуатаваць, скажам, у прыстасаваным памяшканні на гаспадарчым двары сядзібы. Наведвальнікі таксама пазнаёміліся з метадамі нарыхтоўкі і пярвічнай апрацоўкі лесу, неабходным наборам інструментаў для наступнай работы з драўнінай, спосабамі ўтылізацыі адыходаў, убачылі ўзоры гатовых вырабаў, якія маюць попыт у спажыўцоў.

Леанід ТУГАРЫН.

ВЯСКОВЫ КАЛЕКТЫВІЗМ

У Лунінецкім раёне людзей на добрую справу доўга ўгаворваць не даводзіцца

Апошнім часам можна пачуць, што вясковы калектывізм паступова адыходзіць у нябыт. Сельскі чалавек пад уплывам тэхнічнага прагрэсу, урбанізацыі і яшчэ невядома чаго становіцца індывідуалістам накшталт гарадскога. Не раз чула, што нават падчас пажару вяскоўцы не заўсёды імкнуцца прыйсці адзін аднаму на дапамогу. Пажарныя ўжо не здзіўляюцца, калі ім гавораць: «Твая работа, ты і тушы». А кіраўнікі сельскіх Саветаў амаль у адзін голас скардзяцца, як не проста бывае падняць людзей на радавы суботнік па ўборцы тэрыторыі або ў якія цяжкасці часам выліваецца заключэнне дагавора наконт 500-рублёвага штомесячнага ўзносу за вываз смецця. На шчасце, ёсць і іншыя прыклады, асабліва ў палескай глыбінцы.

Жыхары вёскі Велута Лунінецкага раёна яшчэ гадоў пяць таму вырашылі навесці парадак на могілках талакой, а затым падтрымліваць яго агульнымі намаганнямі. Вялікія дрэвы, што разрасліся на пагосце, перашкаджалі як след даглядаць магілы, іх патрэбна было спілаваць. Вось сельскі сход і пастанавіў: дрэвы прыбраць, а драўніну пусціць на патрэбнае. Як рашылі, так і зрабілі. Дрэвы, якія выраслі на могілках, паслужылі і далей. Іх парэзалі на жэрдкі і зрабілі агароджу вакол могілак.

Як расказаў старшыня Бастынскага сельскага Савета Фёдар Рашэцкі, работы па добраўпарадкаванні могілак узначаліў стараста вёскі Уладзімір Коўшык, намеснік дырэктара мясцовай школы. Уладзімір Андрэевіч складаў графік, згодна з якім на будаўніцтве агароджы было задзейнічана прыкладна паўтара дзесятка чалавек. А перад гэтым вяскоўцы сабралі з кожнага двара пэўную суму грошай: купілі цвікі, іншыя неабходныя матэрыялы. Так за пару тыдняў могілкі абгарадзілі і поўнасцю прывялі ў парадак.

І цяпер кожны год недзе за тыдзень да Вялікадня людзі прыходзяць на месца апошняга спачыну продкаў, каб прыбраць, падфарбаваць, вынесці смецце, якое збіраецца за зіму. Звычайна пра час правядзення «суботнікаў» на могілках апавяшчае стараста вёскі, але ўгаворваць нікога асабліва не даводзіцца. Людзі збіраюцца і робяць усё, што патрэбна. Тыя, хто маюць ва ўласнасці трактары, вывозяць тэхнікай адходы, падвозяць неабходныя для рамонту матэрыялы. Вядома ж, платы за такую работу ніхто не патрабуе.

Паводле слоў старшыні Савета, адразу пасля таго, як могілкі прывялі ў парадак, многія выказвалі прапанову наняць для іх вартаўніка-наглядчыка. Праз сельвыканкам гэта аказалася зрабіць немагчыма, такой адзінкі ў штатным раскладзе не прадугледжана. Але ёсць іншыя варыянты вырашэння праблемы, якія абмяркоўвалі грамадой. Напрыклад, збіраць сродкі пад эгідай царквы. З грошай, якія збіраюць вернікі, можна было б аплачваць работу гэтага чалавека. А пакуль названая прапанова знаходзіцца, так бы мовіць, на стадыі разгляду, на могілках перыядычна працуюць рабочыя, якіх накіроўвае ў вёску раённы цэнтр занятасці насельніцтва.

Па прыкладу жыхароў Велуты вяскоўцы з іншых населеных пунктаў сельсавета таксама вырашылі падтрымліваць могілкі ў дастойным выглядзе. І святар бастынскай царквы айцец Іаан не застаўся ў баку ад гэтых важных мерапрыемстваў. Тым больш што людзей на добрую справу тут, мяркуючы па ўсім, доўга ўгаворваць не даводзіцца.

Кіраўнік мясцовай улады Фёдар Рашэцкі ўспомніў, як ў Бастыні ўскладчыну пабудавалі мост. Так атрымалася, што рака Цна з боку вуліцы Усходняй вёскі Бастынь заўсёды была мяжой паміж землямі лясгаса і мясцовага СВК. Узвальваць на сябе клопаты па ўзвядзенні моста не хацела ні адна, ні другая арганізацыя. Людзям жа даводзілася дабірацца на свае палеткі, сенакосы, робячы круг у пяць кіламетраў. І вось аднойчы яны сабраліся на сход і вырашылі, што для ўсіх выгадна пабудаваць мост, хоць бы і сваімі рукамі. Найперш сабралі грошы, а потым знайшліся памочнікі з розных устаноў і арганізацый. А мост атрымаўся добрым, трывалым. Зараз ужо і забыліся, як траціліся час і паліва на аб'езд.

Такім жа чынам пабудавалі і прагоны для жывёлы на пашу. Тут што ні вёска, то прыклад работы на агульную карысць талакой. У Люшчы, відаць, няма такой справы, на якую не падняла б людзей стараста Раіса Андрэеўна Жураўлёва. Вясной вяскоўцы сабраліся на суботнік, каб раз і назаўсёды прыбраць стыхійныя звалкі. Ліквідавалі «імправізаваныя» сметнікі — прасцей стала падтрымліваць парадак у наваколлі. Бо свядомасць не спіць у таго, хто да агульнай справы рукі прыклаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Лунінецкі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

Краіна здароўя

Выпуск
№ 28 (41)

Пытальнік

Пры плоскаступнёвасці абцас у абутку — абавязковы

Яшчэ ў падлеткавым узросце мне паставілі дыягназ «плоскаступнёвасць». Зараз я працую прадаўцом. Увесь мой рабочы дзень праходзіць на нагах і напрыканцы сваёй змены я ўжо літаральна ног пад сабой не чую. Падкажыце, калі ласка, як мне аблегчыць мае пакуты...

Таццяна КРАСОЎСКАЯ, *Смалявіцкі раён*

Сапраўды плоская дэфармаваная ступня ног нашмат горш вытрымлівае нагрузку нашага цела і выклікае хуткую стамляльнасць ног. Чалавек, які пакутуе ад плоскаступнёвасці, часта адчувае ныючыя болі ў ступнях пры хадзе, а потым і проста пры стаянні. Апошнім часам гэта хвароба атрымала вельмі шырокае распаўсюджванне, дзякуючы нашаму маларухомаму ладу жыцця і аслабленню апорна-рухальнага апарата.

Самы просты спосаб папярэдзіць плоскаступнёвасць ці аслабіць яе — гэта хада басанож па вадзе, траве і грунту. Можна пакласці побач са сваім ложкам масажны дыванок, ці пакласці яго, напрыклад, у ванным пакоі — пакуль займаецеся асабістай гігіенай, тапчыцеся па дыванку. Пасля работы рабіце пяціхвілінныя ванначкі для ног, тэмпература вады павінна быць 35—40 градусаў. Таксама карысныя для ног халодныя абліванні, якія паляпшаюць кровазварот і змяншаюць стамляльнасць.

Калі ёсць вольны час, то выконвайце наступныя практыкаванні:

1. Устаньце прама, зацісніце паміж шчыкалаткамі мяч і спрабуйце рабіць крокі, не ўпускаючы мячыка.

2. Ляжце на спіну, локцямі ўпіраючыся ў падлогу. Ступнямі вазьміце мячык і прыўзніміце яго над падлогай.

3. Пакладзіце на падлогу тоўстую палку, скалку ці чаранок ад рыдлёўкі. Устаньце на яе сярэдзінай ступні і катайце ўперад-назад, але каб не было балюча.

4. Устаньце прама, пакладзіце на падлогу мяч і катайце яго ступнёй кругавымі рухамі. Можна пашукаць у продажы спецыяльныя пухірыстыя мячы рознага дыяметра.

5. Падбірайце з падлогі пальцамі ног анучкі ці палачкі, навучыцеся шавяліць кожным пальцам паасобку.

Хадзіце на пятках і на насочках — па 50 крокаў.

Пры плоскаступнёвасці трэба насіць абутак на ўстойлівым сярэднім шырокім абцасе. Вельмі шкодныя для плоскай ступні цяжкія высокія платформы і абутак увогуле без абцасаў, без пад'ёму пад пятку. Да таго ж трэба паклапаціцца пра артапедычны супінатар. Салідныя фірмы адразу выпускаюць дамскія туфлікі ці спартыўны абутак з супінатарам і масажнымі пухіркамі. Але можна набыць супінатар самастойна і ўкладваць яго ў любы абутак.

Вучань Камянюцкай школы Камянецкага раёна Віктар Земніцкі за зданыя лісічкі купіў сабе мабільнік.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама тэл.:8(017) 220-20-25

16 кастрычніка

9.00—12.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Таццяна Фёдараўна МАРТЫНАВА.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Людміла Аляксандраўна КАЛАСКОВА.

23 кастрычніка

9.00—12.00 —— галоўны ўрач Мінскага абласнога радзільнага дома Пётр Леанідавіч МАСЬКО.

14.00—17.00 —— галоўны ўрач Мінскай абласной клінічнай бальніцы Ігар Мікалаевіч ЛАДУЦЬКА.

Усходняя медыцына

«Сэн-Сэй» дапаможа пазбавіцца ад розных праяў стрэсу

У сучасным свеце дзейнасць кіраўнікоў розных рангаў, як правіла, звязана са стрэсамі. Як пазбегнуць іх згубнага ўздзеяння на здароўе і працаздольнасць кіраўніка? Як скарэктаваць магчымыя наступствы стрэсавых нагрузак? Аб гэтым ішла размова падчас тэлемоста «Мінск—Токіо», які адбыўся ў Інстытуце вышэйшых кіраўніцкіх кадраў. У тэлемосце ўзяў удзел Макота Усуі, спецыяліст па ўсходняй медыцыне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі «Сэн-Сэй».

Спадар Макота Усуі, які практыкуе і навучае «Сэн-Сэй», спецыялізуецца на адным з напрамкаў усходняй медыцыны, што заснаваны на энерга-інфармацыйных спосабах аднаўлення фізічнага і ментальнага здароўя ў працэсе кіраўніцкай дзейнасці.

— Я навучаю, праводжу семінары, практыкую як урач, — гаворыць Макота Усуі, — я паказваю, як перайсці да гарманічнага духоўнага стану. Да мяне звяртаюцца пацыенты з рознымі праблемамі: з болямі ў паясніцы, шыі, суставах, таксама людзі з псіхалагічнымі праблемамі, душэўнымі траўмамі, тыя, хто хоча выглядаць больш молада і энергічна. Хоць пацыенты вельмі розныя, але ва ўсіх выпадках лячэнне пачынаецца з рэгуліроўкі фізічнай і духоўнай раўнавагі. Гэта неабходна таму, што духоўны і фізічны ўзроўні ўзаемазвязаны, ёсць шмат спосабаў прывесці іх у раўнавагу.

У медыцыне ёсць такое паняцце — «псіхасаматычнае расстройства». Гэта калі душэўныя перажыванні, вынікі стрэсаў маскіруюцца пад хваробы ўнутраных органаў. Змагацца з гэтай з'явай дапамагае пэўная методыка трансу, пад уплывам якой чалавек расслабляецца і здымае псіхічнае напружанне. Аднойчы, адчуўшы гэты стан, чалавек пераконваецца, што яго можна адчуць зноў, ужо самастойна. Пры штодзённай прафілактыцы ўзровень стрэсу будзе значна зніжацца і адпаведна яго праявы стануць меншымі і на фізічным узроўні.

Спадар Макота Усуі пазнаёміў з даступнымі метадамі самааднаўлення пры розных праявах стрэсу.

Напрыклад, вы маеце **болевыя адчуванні ў шыі**. Зрабіце такое практыкаванне: павольна апусціце галаву налева. Вярніцеся ў зыходны стан. Цяпер павольна апусціце галаву направа. Зноў зыходны стан. Прыслухайцеся да сябе, запомніце, у які бок было больш хваравіта апускаць галаву. Зараз зрабіце над галавой трохкутнік з рук. Нахіліцеся да ўпору ў той бок, у які вам было больш складана гэта зрабіць. Замрыце так. Павольна прыміце зыходны стан. Не апускаючы рук, зрабіце глыбокі ўдых, выдых. Павольна апусціце рукі. Нахіліце галаву ў той бок, у які яе было нахіляць лягчэй. Зыходны стан. Зараз — у той бок, дзе былі хваравітыя адчуванні. Вы пераканаецеся, што нахіляць галаву стала лягчэй. Вельмі важна засяродзіцца на сабе, прыслухацца да адчуванняў.

Яшчэ адно практыкаванне для прафілактыкі **шыйнага астэахандрозу**. Павольна павярніце галаву ўлева. Зыходны стан. Цяпер — управа. Прыслухайцеся: у якім баку былі хваравітыя адчуванні. Складзіце рукі на ўзроўні грудзей у замок. Падыміце ўверх локці. Зараз павярніце шыю ў той бок, у які вам было больш складана яе павярнуць. Гледзячы ў гэты ж бок, апусціце рукі. Вярніцеся ў зыходны стан. Удых, выдых. Яшчэ раз павярніце галаву ўправа—улева. Вы павінны адчуць аблягчэнне.

Практыкаванні для **паяснічнага астэахандрозу**. Ляжце на спіну і з усёй моцы нацягніце на сябе шкарпэткі. Абедзве нагі прыўзніміце прыкладна на 20 сантыметраў ад падлогі. Моцна прыцісніце падбародак да грудзей. Апусціце ногі, але не кладзіце іх на падлогу. Цяпер зноў падыміце іх. Зрабіце гэта пяць разоў, не забываючы моцна прыціскаць падбародак да грудзей. Пасля таго, як вы зрабілі практыкаванне пяць разоў, расслабце цела. Такое практыкаванне трэба рабіць два разы на дзень. Яно вельмі эфектыўнае. Акрамя таго, заўважана, што ў людзей, якія мелі раней праблемы са слыхам, не маглі спяваць, голас паляпшаўся. Таксама цікава, што гэта практыкаванне дапамагае і пры парушэннях функцый шчытападобнай залозы.

Для тых, у каго **бяссонніца**. Вельмі важна расслабіць цела, каб самому расслабіцца псіхаэмацыянальна. Любое фізічнае дзеянне выклікае псіхаэмацыянальны водгук. Таму важна паведаміць сваёй псіхіцы аб тым, што трэба засынаць. Вось спосаб, даступны кожнаму. Перад тым як легчы спаць, паспрабуйце на працягу 10 секунд рукамі разраўноўваць сваё спальнае месца. Затым кладзіцеся на спіну. Адну руку павольна падыміце ўверх, расслабце яе і быццам кіньце ўніз. Гэтак жа зрабіце з другой рукой. Потым ногі — максімальна расслабляючы: уверх, кідок уніз. Зараз таз — уверх, уніз. Паспрабуйце на працягу тыдня кожны вечар рабіць гэта практыкаванне і вы ўбачыце, што яно вельмі эфектыўнае. Сон будзе добрым, а прачнуўшыся, адчуеце сябе бадзёрым і адпачыўшым.

Пры павышаным **артэрыяльным ціску**. У медыцыне «Сэн-Сэй» лячэнне артэрыяльнага ціску праводзіцца пры ўздзеянні на ногі. У прыватнасці, на верхнюю знешнюю паверхню ступні. Трэба, лежачы на жываце, рабіць павольны масаж верхняй знешняй паверхні ступні. Пры гэтым уздзеянні будзе ўзмацняцца цыркуляцыя крыві і тым самым адцягнецца залішні прыток крыві да галаўнога мозга. Ціск адрэгулюецца і знізіцца.

Вольга ШАЎКО.

Раіць спецыяліст

Як адаптаваць арганізм да пераходу на зімовы час

У канцы кастрычніка мы пераходзім на зімовы час. Гэта даволі істотная перамена для арганізма. Як гаворыць **кандыдат медыцынскіх навук урач-псіхатэрапеўт Ірына БАЙКОВА,** у перыяд адаптацыі да новага рэжыму дня ў настроі людзей магчымы эмацыянальныя хістанні, можа з'явіцца раздражняльнасць. Акрамя таго, цалкам верагоднае парушэнне рытму сну: ён становіцца перарывістым, могуць узнікнуць цяжкасці з засынаннем. Асабліва гэта датычыць тых, хто меў тэндэнцыі да падобнага стану раней. У такім разе рэкамендуецца прымаць лекавыя травы, якія валодаюць заспакаяльным дзеяннем. Напрыклад: валяр'яну, мелісу, хмель. Можна рабіць цёплыя нажныя ванны. Пажадана, каб чалавек працягваў ужо ў новым рэжыме класціся ў адзін і той жа час.

Можна рабіць і піць чай з лекавых раслін.

Чай з валяр'яну: 1—2 чайныя лыжкі парэзаных каранёў заліць 1/4 літра халоднай вады і настойваць ноч. Раніцай памяшаць, працадзіць і падагрэць да цёплага стану. Прымаць 150—200 мл у дзень.

Чай з кветак хмелю: 2 чайныя лыжкі кветак заліць 1/4 літра кіпеню, настойваць 10 хвілін, потым працадзіць. Прымаць два разы на дзень па 70—100 мл. Апошні прыём за 30 хвілін да сну.

Чай з мелісы: 2 чайныя лыжкі здробненага лісця заліць 1/4 літра кіпеню. Шчыльна закрыць і настойваць 10 хвілін. Прымаць 2 разы на дзень па 70—100 мл.

Усё гэта дапаможа з найменшымі стрэсавымі цяжкасцямі адаптавацца да зімовага часу. Акрамя таго, перавод часу на адну гадзіну і самастойна кампенсуецца арганізмам на працягу тыдня.

Вольга ШАЎКО.

РЭЎМАТЫЗМ ЦЭЛІЦЬ У СЭРЦА

Восень — пара, калі абвастраюцца хранічныя захворванні. Адно з іх — рэўматызм.

Доўгія гады рэўматызм разглядаўся толькі як захворванне суставаў. Аднак сучасная медыцына сцвярджае, што найбольшую шкоду ён наносіць сэрцу і сасудам. Фарміраванне клапаннага пароку сэрца — распаўсюджанае наступства рэўматычнай атакі (інакш — рэўматычны прыступ).

Рэўматызм, або рэўматычная ліхаманка (як яго называюць у англамоўных краінах) — захворванне інфекцыйна-алергічнага характару, пры якім пашкоджваецца злучальная тканка, пераважна сардэчна-сасудзістай сістэмы, а таксама суставаў, унутраных органаў. Як ні сумна, але гэта хвароба ўпершыню дыягнастуецца галоўным чынам у дзяцей 5—15 гадоў, маладых людзей (жанчыны хварэюць у 3 разы часцей, чым мужчыны).

Справакаваць хваробу могуць інтаксікацыя, пераахаладжэнне, стомленасць, фізічнае перанапружанне. Аднак вырашальную ролю ў развіцці рэўматызму адыгрываюць генетычная схільнасць (у сям'і ўжо былі рэўматыкі) і асаблівыя бактэрыі — бета-гемалітычныя стрэптакокі групы А, якія сваім складам падобныя на клеткі злучальнай тканкі сэрца, суставаў. Апынуўшыся ўнутры нашага арганізма, стрэптакок правакуе запаленне (чалавек хварэе на ангіну, фарынгіт, шкарлятыну). Арганізм, заклікаючы імунітэт на барацьбу, напрыклад, з ангінай, выпрацоўвае ахоўныя рэчывы — антыцелы, якія будуць знішчаць хваробатворныя бактэрыі, пашкоджаныя клеткі. У некаторых жа людзей, пры парушаным імунітэце, гэтыя антыцелы пачынаюць знішчаць ужо не толькі стрэптакокі, але і клеткі злучальнай тканкі. У выніку ў органах, дзе такіх клетак многа, з'яўляюцца ачагі запалення і перашкаджаюць іх нармальнай рабоце.

Улічваючы інфекцыйнае паходжанне захворвання, няцяжка зразумець, чаму ад рэўматызму пакутуюць пераважна дзеці. Да 5 гадоў імунная сістэма дзіцяці яшчэ недастаткова сфарміраваная і не можа даць прызнерных ахоўных рэакцый. А пасля 15-ці кожны чалавек ужо «сутыкаўся» са стрэптакокам: мы ўсе ў гэтым узросце альбо перахварэлі на ангіну без наступстваў, альбо «займелі» рэўматызм. (На шчасце, апошні развіваецца ў адносна невялікага працэнта асобаў, якія перанеслі вострую стрэптакокавую інфекцыю.) Таму, калі хтосьці сцвярджае, што ў яго рэўматызм з'явіўся пасля 30, хутчэй за ўсё, дзіцячая рэўматычная атака засталася незаўважанай.

СІМПТОМЫ РЭЎМАТЫЧНАЙ АТАКІ

Часцей за ўсё сустракаецца вострае цячэнне рэўматызму. Захворванне развіваецца праз 1—3 тыдні пасля перанесенай насаглоткавай інфекцыі. Хворыя скардзяцца на павышэнне тэмпературы да 39 °С, дрэннае самаадчуванне (слабасць, патлівасць). Пазней з'яўляюцца адзнакі, якія ўказваюць на пашкоджанне сэрца: аддышка, сэрцабіцце, адчуванне цяжару за грудзямі, парушэнне частаты пульсу. У некаторых выпадках пры аглядзе хворага можна выявіць сып у выглядзе бледна-руковых плямаў, якія з'яўляюцца на скуры грудзей, жывата, шыі, твару. Рэўматызм можа закрануць і нервовую сістэму. Пры гэтым узнікае міжвольнае падрыгванне мышцаў твару, ног або рук, павышаная ўзбуджальнасць, грымаснічанне. Характэрны сімптом рэўматызму — востры мігруючы поліартрыт буйных суставаў (каленных, локцевых, прамянёвазапясцевых, галёнкаступнёвых). Боль нібы перакоквае з аднаго сустава на другі: калі адзін сустаў перастае балець, боль раптам з'яўляецца ў іншым. Мяккія тканкі ў вобласці суставаў ацёчныя, скура гарачая навобмацак. Часцей за ўсё праз некалькі тыдняў пасля пачатку супрацьзапаленчай тэрапіі болевыя праявы ў суставах знікаюць. Таму ў народзе і кажуць: «Рэўматызм ліжа суставы, а кусае сэрца».

Існуе таксама і неактыўны, маласімптомны пачатак хваробы, пры якім адзначаюцца невялікае павышэнне тэмпературы, стомленасць, нязначныя парушэнні з боку суставаў, сэрца.

Для ўстанаўлення дакладнага дыягназу трэба звярнуцца да ўрача-рэўматолага. Каб не памыліцца, ён павінен правесці комплекснае абследаванне. Назначыць агульны і імуналагічны аналіз крыві для таго, каб выявіць прыметы запалення. Каб удакладніць ступень пашкоджання сэрца, неабходна кансультацыя кардыёлага, электракардыяграфія і рэхакардыяграфія сэрца. Ацаніць стан суставаў дапамогуць урачы-артапеды.

Сёння рэўматызм паспяхова лечыцца, але хворых з набытым парокам сэрца нямала. На жаль, прычына, па якой дзеці становяцца хранічна хворымі, нярэдка тоіцца ў іх бацьках. Некаторыя мамы і таты не спяшаюцца звярнуцца да ўрача, а безадказна чакаюць, калі «само ўсё пройдзе». У дадзеным выпадку час можа быць незваротна згублены.

Лячэнне рэўматызму праводзіцца ў стацыянары: толькі своечасова знятае запаленне выратуе сэрца ад фарміравання пароку. Вельмі важна захоўваць пасцельны рэжым і выконваць усе назначэнні ўрача. Ежа павінна быць разнастайнай, з нізкім утрыманнем солі, багатай на вітаміны, бялкі, якія павышаюць імунабіялагічную ахову арганізма, паляпшаюць скарачальную здольнасць міякарда. Рэкамендавана фізіятэрапія, лячэбная фізкультура.

Прафілактыка захворвання вядзецца ў двух накірунках. Пярвічная прафілактыка — калі рэўматызму яшчэ няма — барацьба са стрэптакокавай інфекцыяй. Лічыцца, напрыклад, што своечасовае лячэнне ангіны можа спыніць развіццё рэўматычнай атакі. Неабходна таксама ўстараніць ачагі хранічнай інфекцыі, у прыватнасці ў насаглотцы (танзіліт, гаймарыт). Варта прывучаць дзіця да здаровага ладу жыцця: правільнага харчавання, паўнацэннага рэжыму, загартоўвання, спорту. Другасная прафілактыка — калі рэўматычная ліхаманка ўжо была ў дзіцяці — накіравана на папярэджанне рэцыдываў захворвання ва ўмовах дыспансэрнага нагляду.

Рэцэпты народнай медыцыны пры рэўматызме

- Вельмі карысныя для сэрца мёд, чорныя і чырвоныя парэчкі, шыпшына, глог, размарын.
- Лісце гусялапкі, кветкі вятроўніку, парасткі багуну, лісце бруснічніку — узяць пароўну. 2 ст. лыжкі здробненага збору заліць 0,5 л кіпеню, зліць разам з травой у тэрмас, настойваць ноч. Прымаць па 1/3 шклянкі тры разы на дзень.
- Плады шыпшыны, плады маліны, лісце чорных парэчак, лісце бруснічніку — узяць пароўну. Прымаць настой з гэтага збору два разы на дзень па 1/2 шклянкі ў якасці вітамінната сродку.
- Пашкоджаныя суставы націраюць настойкай чырвонага перцу на спірце, дабаўляючы алей.
- Дапамагае мазь з пладоў конскага каштану. Плады здрабняюць, змешваюць з камфорным маслам або свіным салам. Мазь прыкладаюць да хворых месцаў.
- Уціраць у балючы сустаў спіртавы настой бярозавых пупышак, настой кветак белай акацыі.
- Здымае боль свежы ліст лопуху. Яго трэба змачыць у халоднай вадзе і прывязаць да хворага месца.
- Па некалькі разоў на дзень прыкладайце да хворых суставаў мяшочкі з гарачым аўсом, лёнам, буйной соллю.
- Прымайце ванны з дабаўленнем свежага лісця бярозы, зелені папараці.

Безумоўна, лячэнне рэўматызму народнымі сродкамі не з'яўляецца альтэрнатывай медыкаментам. Аднак яно дазваляе зменшыць дозы і таксічнае ўздзеянне лякарстваў, а ў перапынках паміж медыкаментознымі курсамі падтрымліваць дасягнутыя вынікі.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Інфарм-укол

МЯНЯЕМ МЯСА НА БАБЫ

Адзін з сакрэтаў здаровага харчавання: пазбягайце мясных страў некалькі дзён на тыдні — і рызыка сардэчна-сасудзістых захворванняў будзе ў некалькі разоў меншай, а талія на некалькі сантыметраў танчэйшай.

Паводле статыстыкі замежных вучоных, напалову вегетарыянцы — тыя, хто рэдка ўжывае мяса, на 50 працэнтаў радзей пакутуюць ад атлусцення, чым тыя, хто ўжывае яго штодня. Посная ялавічына, свініна і кураціна — цудоўныя крыніцы пратэіну і іншых карысных рэчываў, аднак калі скараціць іх прысутнасць у рацыёне, можна толькі выйграць. Большасць людзей спажывае 2,5 кг мяса ў тыдзень, што ў два разы перавышае норму, рэкамендаваную кардыёлагамі. Калі вы дагэтуль перакананыя, што абед без мяса — грошы на вецер, паспрабуйце гатаваць стравы з выкарыстаннем бабоў, капусты розных гатункаў, макароны, сыру. Наш арганізм штодня павінен атрымліваць 8 г бялкоў на кожныя 10 кг вагі. Таму варта ўжываць яйкі, міндаль, шпінат.

СТАЦЬ СВАБОДНЫМ АД НЕГАТЫВУ

Нявырашаныя пытанні і незадаволеныя жаданні пазбаўляюць яшчцё ўцех. Гэта падрывае нашы яшчцёвыя сілы і энергію, самапавагу і пачуццё годнасці. І часта прыводзіць да сумных наступстваў.

Паступова зніжаецца ўзровень успрыняцця, страчваецца здольнасць рэагаваць не толькі на негатыў, але і на ўсё добрае. Калі вы страчваеце магчымасць сумаваць, то страчваеце і здольнасць адчуваць сябе шчаслівым. У рэшце рэшт эмацыянальнае «атручэнне» можа прывесці да разбуральнага эфекту на фізічным узроўні. Людзі з невырашальнымі праблемамі і негатыўным эмацыянальным багажом перажываюць розныя сімптомы:

- хранічныя болі ў шыі і спіне,
- мігрэні,
- стомленасць,
- бяссонніцу,
- зніжэнне імунітэту.

Спецыялісты звязваюць гэтыя эмацыянальныя канфлікты і з больш сур'ёзнымі захворваннямі (напрыклад, сардэчнымі), а таксама з трывожнымі станамі і дэпрэсіяй.

Існуе сем крокаў да эмацыянальнага ачышчэння і ў перспектыве — да больш здаровай і шчаслівай будучыні.

1. Валодайце сабой. Калі вы пастаянна асуджаеце людзей, магчыма, яны адлюстроўваюць вашы якасці, якія вы не хочаце прызнаваць. Самы час пачаць больш адказна ставіцца да сваіх паводзінаў.

2. Усведамляйце свае эмоцыі. Навучыцеся дакладна фармуляваць пачуцці ў форме канкрэтнага сказа, інакш пустата запоўніцца атрутнымі эмоцыямі: гневам, злосцю, адзінотай.

3. Кантралюйце цела. Неабходна вывучыць энергію, якую нясе тая ці іншая эмоцыя. Звярніце ўвагу на адчуванні, якія ўзнікаюць. Якая цялесная рэакцыя ім адпавядае? Тады некаторыя з эмацыянальных нагрузак знікнуць.

4. Стварыце атмасферу. Вылучыце час для сябе. Паслухайце музыку, схадзіце на масаж, зрабіце практыкаванні ёгі. Так вы хутчэй зразумееце праблемы, тое, што звязана з адчуваннем эмацыянальнага напружання і недахопам задавальнення.

5. Запісвайце ўсё. Дазвольце негатыву выйсці на паверхню — апішыце яго ў сваім дзённіку. Паспрабуйце дакладна напісаць пра ўсё, што адчуваеце.

6. Выратавальныя рытуалы. Стварыце ўласны рытуал інтаксікацыі: кідайце камяні ў раку, танцуйце, гуляйце пешшу, рабіце дыхальную гімнастыку, слухайце музыку, паразмаўляйце з чалавекам, якога пазбягаеце. Рабіце тое, што звычайна дапамагае пазбавіцца негатыўных эмоцый.

6. Заахвочвайце сябе. Вучыцеся атрымліваць задавальненне ад смачных страў, цёплай ванны, чарговых выхадных і г.д. Абавязкова ўзнагароджвайце сябе за работу, якую вы добра выканалі.

ЯК ВІЛЬГЕЛЬМ САЛАСЮК «ПЕРАМОГ» СВАЕ ХВАРОБЫ,

Праверана на сабе

альбо Правільнае харчаванне і фізічныя нагрузкі — галоўнае лякарства

Больш за дваццаць гадоў таму ветэран Вялікай Айчыннай вайны Вільгельм Сцяпанавіч Саласюк прыехаў падлячыцца ў санаторый «Парэчча» (Гродзенскі раён) ад сваіх, здавалася б, ужо хранічных хвароб — астыт, каліт, намячаўся халецыстыт. Прайшоў курс аздараўляльных працэдур, быццам палягчэла, аднак вярнуўся дадому, пафарбаваў у кватэры падлогу, надыхаўся фарбай — і зноў усё стала балець: суставы рук і ног, пазваночнік.



Фота Яраслава ВАНКОВІЧА.

— Зноў іду ў паліклініку — выпісваюць заспакаяльнае, но-шпу, — прыгадвае Вільгельм Сцяпанавіч. — Адзін урач кажа: «Ну што ж паробіш? Узрост...» Другі: « Наступствы чарнобыльскай катастрофы, дрэнная экалогія». Трэці бачыць, што я ўдзельнік вайны, і канстатуе: «Гэта акопная хвароба, ва ўсіх франтавікоў ногі баляць. Не вы ж адзін такі — трэба прывыкнуць, палачку бярыце».

— І дзе ж у вас тая палачка?

— Як бачыце, цудоўна абыходжуся без яе. Выслухаўшы дыягназы і парады медыкаў, я, вадзіцель са шматгадовым вопытам, задумаўся: што робіць шафёр, калі ў машыне заглухне рухавік? Прычыну шукае. Так і з чалавекам: чаму «разваліўся»? Давай шукаць прычыны сваіх хваробаў. Звярнуў увагу ў калідоры паліклінікі на лозунг са словамі Гіпакрата: «Ваша ежа павінна служыць вашым лякарствам». Цікаўлюся ў медыкаў: а якая ежа? У адказ — агульныя словы, маўляў, прадукты павінны быць свежымі, адзін раіць ужываць больш смятаны, тварагу, другі — мяса. Бачу, што яны таксама нічога толкам не ведаюць. Тады стаў чытаць літаратуру па аздараўленні арганізма, культуры харчавання, у прыватнасці, кнігі амерыканскага даследчыка Поля Брэга. І прыйшоў да высновы, што маё традыцыйнае сняданне, чай з батонам — гэта зусім не карысна, нават, можна сказаць, шкодна.

Што з'яўляецца прычынай хваробы суставаў? Наш арганізм мае патрэбу ў вітамінах групы А (жоўты гарбуз, дыня і морква), менавіта іх не хапае для фарміравання храсткоў і касцей, і групы С (яблыкі, кіслыя ягады, іншыя кіслыя гародніна і садавіна). Вось я і стаў гэта прымяняць у сваім рацыёне, выключыўшы булкі і белую муку.

— Дык што, толькі гародніна і садавіна?

— Не толькі. Не прэтэндуючы на ісціну ў апошняй інстанцыі, магу патлумачыць, у чым сутнасць сістэмы харчавання і аздараўлення, дзякуючы якой, упэўнены, мне ўдалося «перамагчы» свае хваробы.

Дык вось, раніца. На сняданне ў мяне звычайна морква, яблык і крыху капусты, ды яшчэ, калі ёсць — перац. Усё гэта — у надзёртым выглядзе, без солі і цукру, з нерафінаваным алеем, перамяшаў і салата гатовая. Аднак перш чым яго з'есці, раблю гімнастыку. У 1988 годзе я быў такі аслаблены, што ледзь хапала сілаў на тры адціскданні ад падлогі. Потым гляджу — магу чатыры, пяць... Цяпер гэта практыкаванне выконваю 85 разоў — без перапынку, не падымаючыся. А калі падымуся і адчуваю, што хочацца прадоўжыць, то яшчэ разоў 30 адціскаюся. Плюс 30 нагінанняў, 100 прысяданняў. І ўсё гэта — без выхадных і «прагулаў». Нават калі пазалетась зламаў руку, то, каб не аслабнуць, працягваў адціскацца ад падлогі, толькі ўжо на локці і другой руцэ. Зняў гіпс — праз 10 дзён стаў, як звычайна, адціскацца на абедзвюх руках.

Пасля зарадкі ў мяне па распарадку прабежка (прыкладна тры кіламетры трушком), якая патрэбна для таго, каб даць нагрузку сэрцу. Калі мы сядзім, то кровазварот складае адзін абарот у хвіліну, ходзім — 2—2,5 абарота, а калі бяжым — да 10 абаротаў. Адчуваеце розніцу?

Вяртаюся дадому, мыюся і ем гэтую салату. Затым — чатыры фінікі альбо арэхі. І пайшоў справы рабіць. На абед — боршч.

— З мясам?

— Не, на вадзе. Мяса павінна спажывацца два—тры разы на тыдзень, не больш. І вось чаму. Мяса не мае вялікай пажыўнай каштоўнасці для чалавека, гэта далікатэс, жывёльны бялок. Калі мы будзем часта есці мяса, то павінны ведаць, што ў ім маецца мачавая кіслата, якая, пранікаючы ў тканкі, паступова крышталізуецца і там, у арганізме выклікае ўспуханне пластаты ў мужчын і рэўматызм. Акрамя таго, мяса забірае шмат энергіі для сваёй перапрацоўкі — арганізм заўчасна зношваецца, знясільваецца.

— А каўбасы?

— Іх даследчыкі таксама рэкамендуюць ужываць рэдка, толькі на святы. Неабходных нашаму арганізму вітамінаў у каўбасах практычна няма. Добра яшчэ, калі харчовая дабаўка — соя. А калі крухмал? Нам ад гэтага карысці мала. Хоць на смак і пах прыемна.

Дарэчы, яшчэ фізіёлаг Мечнікаў на зары мінулага стагоддзя выявіў, што амаларам мясных страў пагражае палавое бяссілле ў раннім узросце. Гэта адбываецца з-за недахопу ў арганізме вітаміну Е, які маецца ў агародніне і некаторых фруктах — апельсінах, авакада, грэйпфрутах. Па гэтай жа прычыне наступаюць і выкідышы ў жанчын. Але ім ніхто чамусьці аб гэтым не гаворыць. І яны ядуць абы што.

— Але ж ці будзеш сыты гароднінай? Можа ўзнікнуць элементарнае пачуццё голаду...

— Няпраўда. Даследчыкі на гэты конт пішуць, што цеплавую і мускульную энергію нам даюць менавіта гародніна і некаторыя фрукты (апельсіны, авакада, грэйпфрукты). А тлушчы — удвая больш. Аднак тлушчы трэба спажываць раслінныя, нерафінаваныя, паколькі ў іх няма халестэрыну. На ўласным вопыце я знайшоў больш карысці ў сале, чым у нейкіх іншых тлушчах. Як кажуць у народзе, з'еў шматок сала — можаш насіць, вазіць, касіць.

На вячэру — порцыя кашы і порцыя гародніны. Альбо тушаная гародніна — капуста (нездарма яшчэ Аляксандр Македонскі браў яе ў паход для лячэння сваіх воінаў), кабачок, гарбуз і разы чатыры на тыдзень — шматочак сала з чорным хлебам. Паўбоханка на тыдзень нам з жонкай Марыяй Міхайлаўнай хапае.

— Гэта з улікам і абедаў?

— А калі боршч густы, то навошта хлеб? У левай руцэ — цыбуліна (вось дзе неабходныя нашаму арганізму кальцый, фосфар, ды і зубы будуць цэлыя), у правай — лыжка.

— А ці ўваходзяць у ваш рацыён рыба, бульба, малочныя прадукты?

— Рыбу мы ўжываем і ў тушаным, і ў смажаным выглядзе, разам з агароднінай, прычым пераважна марскую, паколькі ў ёй карысных элементаў значна больш, чым у рачной. Безумоўна, у нашым рацыёне прысутнічае і бульба, аднак ідзе яе няшмат. Так, у бульбе ёсць калій, сера, фосфар, хлор і магній. Але гэта — у сырым выглядзе. Калі ж пачынаем варыць, даводзім да адпаведнай тэмпературы, то ўсё ператвараецца ў неарганічнае мінеральнае рэчыва — крухмал. У страўніку ён становіцца дробненькім пясочкам, які не раствараецца ў вадзе, не гарыць у агні і не гніе ў зямлі.

Але боршч, напрыклад, без бульбы нясмачны. Альбо, іншы раз, дапаўняем агародніну бульбяным пюрэ. А сёння ў нас — бульбяная запяканка. Таму мы бульбай, як і чорным хлебам, карыстаемся, аднак гэта — дадатак да харчавання, а не яго аснова. Гэтак жа як, бывае, захочацца сырнікаў са смятанай. Зрэшты, на малочныя прадукты ў нашым узросце стаўку рабіць не варта, карысныя хіба што сметанковае масла (тлушч для арганізму) і цвёрдыя сыры (у іх ёсць кальцый, фосфар і іншыя пажыўныя элементы). Але ўсё добра ў норме. Празмернае ўжыванне таго ж сметанковага масла пагражае тым, што яно адкладваецца на сасудах і разам з крухмалам ўтварае на іх цэлы панцыр, а гэта можа справакаваць сур'ёзныя праблемы.

А вось чым я абавязкова завяршаю абед і вячэру, дык гэта яблыкам альбо кіслымі ягадамі. Калі, зразумела, не галадаю.

— ?

— Кожны квартал у мэтах ачышчэння арганізма я тры дні запар галадаю. Акрамя таго, «сяджу на вадзе» штотыднёва па пятніцах. Дыстыляванай вады цяпер знайсці цяжка, таму з вечара кіпячу два літры і раніцай працэджваю праз дватры слаі марлі. Максімальна, каб ачысціць сасуды і капіляры, я галадаў пятнаццаць дзён. Акрамя таго, амаль штомесяц прамываю кішэчнік, што абараняе ад прастудных і іншых захворванняў.

— Але, кажуць, галаданне можа здароўю і пашкодзіць...

— І вось чаму. Галадаючы, трэба піць ваду. Але не мінеральную, паколькі там ёсць мінеральныя рэчывы і можна прынесці сабе больш шкоды, чым карысці. Ні ў якім разе нельга яе ўжываць падчас галадання.

— Вільгельм Сцяпанавіч, не памыліліся, калі дваццаць гадоў таму пачалі разбірацца ў прычынах сваіх захворванняў і змагацца з імі па сваёй сістэме?

— Упэўнены, што зрабіў правільна. Хваробы, якія мне раілі ўспрымаць як нешта натуральнае, чаму трэба скарыцца, ужо даўно не трывожаць. Сасуды чыстыя, кардыяграма выдатная, ціск 120 на 80.

— Можа, варта было б увесці ў навучальных установах хоць бы факультатыў па культуры харчавання?

— Някепска было б, зразумела. Але хто будзе выкладаць? Нават у ВНУ будучых медыкаў не вучаць ні правільнаму харчаванню, ні ачышчэнню арганізма. Вучаць лячыць людзей, але не вучаць, ад чаго хваробы з'яўляюцца. Аднаму доктару я хацеў параіць, як яму пазбавіцца ад язвы, рэкамендаваў пачытаць Поля Брэга. «Так, шарлатанаў усялякіх шмат», — адказвае.

...Нягледзячы на свой паважаны ўзрост, Вільгельм Сцяпанавіч сёння ў выдатным фізічным тонусе і можа даць «фору» многім маладзейшым людзям. Так, яго аздараўленчая сістэма — гэта, вядома ж, не панацэя ад усіх хваробаў. Але гэта прыклад таго, чаго дасягае чалавек, калі не сядзіць, склаўшы рукі, а цікавіцца накопленым іншымі вопытам і ўмела яго прымяняе.

Вільгельм Сцяпанавіч, дарэчы, і сам з вялікім задавальненнем падзяліўся б сваімі «сакрэтамі» здароўя з усімі, каму гэта неабыякава. Скажам, нядаўна ён прапанаваў свае паслугі, прычым абсалютна бясплатна, у адным з санаторыяў. Дзіўна, але яго жаданне раіць, як правільна харчавацца і менш х

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГ ЦЭНЫ

Выпуск № 13 (25)

ЗАПАСАЕМСЯ

ВОСЕНЬСКІЯ кірмашы могуць быць паказальнымі, калі вытворцы сельгаспрадукцыі і ўлады эфектыўна ўзаемадзейнічаюць, бо інтарэсы іх супадаюць. А вынік такога супрацоўніцтва можна бачыць кожную суботу і нядзелю.

Сёлета, як і ў мінулыя гады, у самым цэнтры Баранавіч, на плошчы Леніна гандлююць фермеры, сельгаскааператывы, рыбгасы і прыватнікі. Бачачы, наколькі папулярныя такія кірмашы, улады вырашылі адкрыць яшчэ некалькі пляцовак для гандлю, але ўсе імкнуцца бліжэй да помніка Ільічу.

У цэнтры гандаль ідзе бурна і людзі запасаюцца. Адкрыццё кірмашоў панізіла кошт бульбы. Калі раней прыватнікі на легкавушках з прычэпамі стаялі па ўсім горадзе і прадавалі бульбу па 400—450 руб/кг, то цяпер яна каштуе ўжо 300—350 рублёў. Канкурэнцыя на рынку — бальзам на душу пакупнікам.

Ёсць з чаго выбіраць, і прадаўцы згаворлівыя. Вывозяць мяшкі з агароднінай на чым давядзецца: на аўтамашынах, веласіпедах, калясках... або, калі нехта бярэ многа, то прадавец запісвае адрас і абяцае прывезці да пад'езда, а другі нават тую бульбу занясе пакупніку ў падвал — нармальная паслуга.

А цэны прымальныя. Напрыклад, морква каштуе 500 рублёў, капуста — 550, цыбуля — 800, буракі — 270, перац і памідоры — па 1500 рублёў за кілаграм. Гэта ў сярэднім, бо ўсё залежыць ад якасці. Давялося бачыць бульбу і па 180 рублёў, але ўжо дробную.

Яблыкі, на якія сёлета неўраджай, прадавалі па 2000 руб/кг, хоць іх было і няшмат. А вось мёду хапала. Лясны, майскі, грэцкі, верасовы — паўлітровы слоік па 10 тысяч, а кілаграм — 13—14 тысяч рублёў.

Тоўпіўся пакупнік і каля цыстэрнаў з рыбай, і тут было з чаго выбіраць. Гаспадарка «Сасновая» прасіла за кілаграм карпа 4500 рублёў, а рыбгас «Лактышы» — на тысячу танней.

І добра было б, каб такія кірмашы ў нас ніколі не канчаліся, а гэта значыла б, што жыццё наладзілася.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Што паляціць далей — бульбіна альбо мабільнік?

У Бабруйску ў нядзелю пройдзе Фестываль бульбы, на якім будуць не толькі гандляваць бульбай, частаваць стравамі з бульбы, але і прапануюць браць удзел у вясёлых спартыўна-бульбяных спаборніцтвах.

Гэты фестываль адбудзецца ў Бабруйску ўжо не першым разам, з ініцыятывы грамадскасці і пры падтрымцы выканаўчых камітэтаў горада і раёна.

Праграма фестывалю вялікая. Адбудзецца конкурс на лепшую страву з бульбы. Ён будзе падзелены на дзве часткі: аматары і прафесіяналы. Другую частку будуць прадстаўляць работнікі гандлю і грамадскага харчавання. На мінулым фестывалі ўдзячная публіка з вялікім задавальненнем з'ела ўсе конкурсныя стравы і ацаніла іх вельмі высока.

Сёлета запланавана цікавая кулінарная акцыя: у Бабруйску будзе прыгатавана самая доўгая бульбяная каўбаса. Павінна быць смачна: акрамя бульбы, у яе склад будуць уваходзіць цыбуля, сала ды мяса, спецыі. Гэта каўбаса будзе прадавацца. Павінна хапіць усім — яе даўжыня плануецца болей за 20 метраў.

НПЦ бульбаводства прапануе на акцыю накшталт тэлевізійнай «Кантрольнай закупкі» 10 гатункаў бульбы. Народнае журы з паўсотні чалавек будзе вырашаць, якая вараная бульба найбольш смачная.

Каманды запрашаюцца на бульбяное шматбор'е: хуткасная чыстка і надзіранне бульбы, смажанне дранікаў, хуткаснае спажыванне бульбяных страў (шэраг беларускіх прадпрыемстваў прапанавалі на гэты конкурс свае бульбяныя паўфабрыкаты), бег у бульбяных мяхах і з імі ж пад пахай, а таксама кіданне бульбы. Адна сетка крам мабільнай сувязі прапанавала наладзіць конкурс па кіданні мабільнікаў і бульбы — што ж паляціць далей?

Натуральна, што на фестывалі будуць гандляваць бульбай: і насеннай, і звычайнай. А НПЦ харчавання абяцае прадставіць у Бабруйску цікавыя стравы з бульбы, напрыклад — бульбяны квас.

На фестывалі мяркуюць абраць Каралеўну бульбы, а таксама шэраг Бульбашоў — якія найлепш спяваюць і танчаць, самага начытанага і найбольш інтэлектуальнага. Апошні вызначыцца шляхам камп'ютарнай бітвы ў гонар Каралеўны бульбы.

— Трэба ставіць на п'едэстал усё роднае і блізкае, і бульбу таксама, — упэўнена ініцыятар правядзення Фестывалю бульбы Наталля Цымбурская. — У нас у Беларусі зусім няма харчовых, гастранамічных святаў. І Бабруйск тут стаў першаадкрывальнікам. Бульба — гэта ж наш традыцыйны і галоўны харч, без якога беларус жыць не можа. Запрашаю ўсіх ушанаваць нашу Бульбу і павесяліцца на свяце.

Фестываль бульбы разгорнецца ў межах кірмашу «Залатая восень» каля Палаца мастацтваў у Бабруйску 14 кастрычніка з 10 да 15 гадзін.

Ілона ІВАНОВА.

Што галоўнае ў дзіцячых падгузках?

Пытальнік

Дайце, калі ласка, параду, як выбраць немаўляці добрыя падгузкі. Меркаванні сябровак, якія ўжо вырасцілі сваіх дзяцей, настолькі розныя, што я разгубілася. А эксперыментаваць на ўласным дзіцяці мне, ведаеце, абсалютна не хочацца. Ці заўсёды высокі кошт падгузкаў адпавядае іх якасці?

Таццяна К., *г. Баранавічы*

Справа ў тым, што знайсці падгузак, які будзе ідэальна падыходзіць вашаму малому, часцей за ўсё можна толькі метадам спроб і памылак. Усмоктваюць і ўтрымліваюць вільгаць ўсе адназовыя падгузкі, але далёка не ўсе яны робяць гэта хутка і якасна. Якасць і надзейнасць напрамую залежаць ад абсарбіруючага матэрыялу, размеркаванага ўнутры падгузка. Для таго, каб попка малога больш часу заставалася сухой, выбірайце падгузкі з унутраным слоем, які пераўтварае вільгаць у гель і не дае выцякаць вадкасці.

Памацайце ўнутраны слой падгузка. У якасных мадэлях ён мяккі і не можа даставіць дзіцяці ніякіх нязручнасцяў. Знешні слой у дарагіх мадэлях падгузкаў мае двухкампанентную структуру: гэта мяккі, падобны на нятканы, матэрыял і мікрапорысты палімер. Гэтыя падгузкі, як гаворыцца ў рэкламе, «дыхаюць»: іх знешні слой прапускае пары вадкасці і паветра. У выніку цыркуляцыя паветра ў падгузках не спыняецца нават калі ён перапоўнены. Але мяняць такія падгузкі рэкамендуецца таксама часта, як і звычайныя — праз кожныя 3—4 гадзіны.

Правільна падабраны падгузак шчыльна прылягае да ножак малога — гэтаму спрыяюць спецыяльныя бакавыя гумачкі. Паміж жыватом дзіцяці і пярэдняй часткай падгузка павінен свабодна размяшчацца палец дарослага чалавека — звярніце на гэта ўвагу, калі зашпільваеце ліпучкі.

Пры ажыццяўленні пакупкі знайдзіце на ўпакоўцы краіну-вытворцу. Падгузкі адной і той жа маркі могуць адрознівацца па якасці ў залежнасці ад таго, дзе яны былі выпушчаны: непасрэдна на фірменным заводзе ці па ліцэнзіі. Апошнія, як правіла, больш танныя, але па якасці яны прайграюць фірменнай прадукцыі. Не варта купляць дзіцячыя падгузкі ў вялікай колькасці. Лепш спачатку набыць адну ўпакоўку, і толькі калі вынік вас задаволіць, можна лічыць, што вашы пошукі «сваёй» гандлёвай маркі паспяхова завяршыліся.

Марская харчовая соль — скарбніца мінералаў

Адносна нядаўна ў сталічных магазінах у продажы з'явілася марская соль. Першае, што кідаецца ў вочы — яна нашмат даражэйшая за прадукцыю беларускіх вытворцаў. Хацелася б атрымаць нейкую інфармацыю аб новым прадукце.

Т.С. МЯЛЕШЧАНКА, *г. Мінск.*

Паходжанне марской солі вынікае ўжо з самой яе назвы. Склад крышталю марской солі настолькі складаны і ўтрымлівае так многа хімічных элементаў, што ўзнавіць яго штучна ў лабараторыі не ўяўляецца магчымым. Сталовая асветленая рафінаваная соль, да якой прызвычаіліся ўсе беларусы, на 99,9 працэнта складаецца з хларыду натрыя. А натуральная марская соль, акрамя хларыду натрыю, змяшчае таксама хларыд калію, хларыд магнію, карбанат магнію, сульфат кальцыю, а таксама жалеза, бор, ёд, фосфар, крэмній і г.д. — больш за 100 мінералаў. Менавіта за ўтрымання мноства мінералаў марская соль лічыцца больш карыснай. А атрымліваюць марскую соль натуральным «дзедаўскім» спосабам — выпарваннем на сонцы марской вады. У краінах, якія не адмаўляліся ад спажывання марской солі на карысць рафінаванай асветленай солі, сардэчна-сасудзістыя захворванні і артрыты не з'яўляюцца такой праблемай як, скажам, для беларусаў. Біёлагі, напрыклад, сцвярджаюць, што марская вада аднаўляе гідраэлектрычны баланс, парушэнне якога выклікае збой у рабоце імуннай сістэмы чалавека, спрыяе развіццю ў яго алергіі і многіх іншых праблем са здароўем. Даказана, што натуральная марская соль нейтралізуе таксіны і шкодныя бактэрыі і ўзмацняе ўсе функцыі нашага арганізма. Невыпадкова марскую ваду называюць яшчэ «мацярынскім растворам» і выкарыстоўваюць яе тэрапеўтычны эфект пры лячэнні многіх захворванняў.

ГОМЕЛЬСКІ ЛІКЁРА-ГАРЭЛАЧНЫ ЗНОЎ ВЫЗНАЧЫЎСЯ

На дзвюх міжнародных спецыялізаваных выставах — у Сочы і Рызе.

Канкурэнты там былі даволі сур'ёзныя з Украіны, Расіі, Францыі, Чылі, ЮАР і г.д. Тым не менш гамяльчане аказаліся на вышыні. Гран-пры атрымалі бальзамы «Чорная каралева» і «Палессе», залатыя медалі — гарэлка «Радзімічы» і бальзам «Палессе», а сярэбраныя — гарэлка «Палессе-Прэміум», настойка салодкая «Журавінка на каньяку» і бальзам «Чорная каралева».

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАЛАЧАНАМ ПЛАЦЯЦЬ ЗА... СМЕЦЦЕ

Аб гэтым эксперыменце паведамілі «Звяздзе» ў Полацкім гарвыканкаме. Яго незвычайнасць у тым, што цяпер у спецыяльных нарыхтоўчых пунктах прымаюць асобна шкло, посуд, паперу, пластык. Разлік ажыццяўляецца прама на месцы. Пакуль што працуюць толькі чатыры такія пункты, але ж у гэтым месяцы іх колькасць павялічыцца мінімум у два разы. Каб прыцягнуць увагу зборшчыкаў смецця, якія жывуць далёка ад пунктаў, спецыяльная машына будзе прыязджаць у двары. Такі вопыт у Віцебскай вобласці выкарыстоўваецца ўпершыню. Яго мэта зрабіць больш эфектыўным раздзельны збор смецця, палепшыць экалагічнае выхаванне насельніцтва.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Карысная парада

Што пажадана ведаць, калі збіраецеся займець вокны з ПВХ?

Калі ў нашы паштовыя скрыні кідаюць рэкламныя лістоўкі наконт устаноўкі вокнаў з ПВХ, пагадзіцеся, многія бываюць прыемна здзіўлены дастаткова прымальным узроўнем цэнаў. Але толькі напачатку, бо варта патэлефанаваць па ўказаных нумарах ці яшчэ лепш пад'ехаць на фірму з уласнымі канкрэтнымі памерамі, як гэта цана павялічваецца недзе ў паўтара раза. У прынцыпе, асаблівага падману тут няма, паколькі ў рэкламе (на тое яна і рэклама) указваюцца нейкія сярэднія параметры — па памерах, асаблівасцях канструкцыі (профіль ад пэўнага вытворцы, колькасць «глухіх» створак ці якія адчыняюцца і інш.). Часам «забываюць» адразу ўказаць кошт дэмантажу старых вокнаў ці мантажу новых. Памятайце пра гэта і вы як мінімум «зэканоміце» на ўласных нервах.

Узгадні, потым устанаўлівай

Перш чым даваць нейкія канкрэтныя парады па вокнах з ПВХ, зазначым, што з канца мінулага года, згодна з палажэннем аб пераўладкаванні і перапланіроўцы жылля ў шматкватэрных дамах, змяніліся патрабаванні, што прад'яўляюцца да яго ўладальнікаў. Дарэчы, і раней гарадскія ўлады імкнуліся навесці парадак у гэтай сферы: была забаронена без спецыяльнага дазволу замена вокнаў у будынках-помніках архітэктуры, у дамах, размешчаных на цэнтральных магістралях. Новыя вокны лепш было заказваць па ўзоры папярэдніх: па колеры, колькасці створак, наяўнасці фортак. Гэтыя патрабаванні захаваліся і зараз. Уладальнік кватэры, які, напрыклад, вырашыў зашкліць балкон ці лоджыю, памяняць вокны, павінен узгадніць гэтую працэдуру і атрымаць дазвол у архітэктара раённай адміністрацыі, паставіць у вядомасць ЖЭС або таварыства ўласнікаў. Усё — бясплатна. Невыкананне гэтых патрабаванняў (як і няведанне) можа каштаваць штрафу. Хоць, на наш погляд, было б лагічным, каб пра гэта патэнцыяльных кліентаў адразу папярэджвалі на фірмах, што спецыялізуюцца на ўстаноўцы вокнаў. Я дзеля цікаўнасці задаў гэтае пытанне прадстаўнікам некалькіх з іх і ў прынцыпе атрымаў вядомыя мне адказы. Але ніводнага разу ініцыятыва не зыходзіла з боку фірмаў. Сапраўды, навошта адразу адпужваць кліента?

На чым заснавана папулярнасць?

Падкрэслім, што не бяромся сцвярджаць, быццам вокны з ПВХ (полівінілхларыду) — самыя лепшыя. Скажам, зараз у новабудоўлях пачалі ўстанаўліваць (мяняць пры капрамонце ў старых шматпавярхоўках) даволі прыстойныя драўляныя шклопакеты. Тым не менш менавіта вокны з ПВХ па шэрагу прычын на сёння з'яўляюцца найбольш папулярнымі пры замене як у старых, так і новых шматкватэрных дамах. Яны забяспечваюць добрую цепла- і шумаізаляцыю, простыя ў карыстанні і доглядзе, каштуюць параўнальна нядорага (напрыклад, чым драўляныя шклопакеты).

Профілі звычайна прапануюць ад вытворцаў з Германіі, Аўстрыі, Польшчы. Насамрэч гэта, як правіла, не зусім і не заўсёды так: па ліцэнзіі іх вырабляюць у суседняй Расіі, прычым на даволі высокім узроўні. Розніца паміж імі можа складаць каля 10 працэнтаў ад кошту, але звычайны пакупнік зможа іх адрозніць хіба толькі па ступені бялізны (беласнежныя лепш ставіць у кватэры, з невялікімі адценнямі ад асноўнага (белага) колеру — на балконе, напрыклад). Дарэчы, вокны могуць мець і ламінацыю («гарачым» спосабам на іх наносіцца спецыяльная плёнка — каляровая, пад натуральны колер драўніны). Можа быць і аднабаковая ламінацыя, як правіла, з боку кватэры. Кошт такіх вокнаў на 15—30 працэнтаў большы (чым тлумачыцца такая істотная разбежка — высвятліць не атрымалася), чым «базавых» белых. Дакладней, не ўсіх вокнаў, а «канструкцыі» ці «вырабу» (самой рамы). Бо ў канчатковую цану ўваходзяць яшчэ кошты адліваў (аднаго ці двух), падаконніка, мантажу (дэмантажу), радзей — аддзелкі адкосаў.

У кватэрах звычайна ўстанаўліваюць двухкамерныя шклопакеты, на балконе ці лоджыі можна абысціся і аднакамернымі. Розніца складае 7—12 працэнтаў ад кошту «вырабу».

Эканоміць трэба, але абачліва

Каб зэканоміць, многія заказваюць вокны з адной «глухой» створкай і адной, якая адчыняецца («глухая» можа займаць як палову ўсяго акна, так і большую-меншую яго частку). Адчыняцца створка можа як у трох пазіцыях (розніца з «глухой» — 20—25 доларaў), так і пяці (яшчэ дадатковыя 20—25 доларaў). Але не спяшайцеся з выбарам, калі жывяце вышэй за другі—трэці паверх і не служылі ў паветрана-дэсантных войсках. Пры нізкаватым падаконніку, вялікай «глухой» створцы пры доглядзе акна могуць узнікаць праблемы. Мыць яго будзе цяжкавата нават з дапамогай аўтамабільнай шчоткі. Дарэчы, двойчы на год — вясной і восенню — знешнія гумавыя ўшчыльнялькі трэба змазваць (ёсць спецыяльныя сродкі, але падыдзе і звычайны дзіцячы вазелін), гэтак жа як і механізмы фурнітуры (кропля-другая машыннага масла).

Калі закранулі фурнітуру (можа быць вытворчасці Германіі, Аўстрыі), яе вам абавязкова павінны адрэгуляваць. Ніякіх празмерных намаганняў пры карыстанні! Вам павінны пакінуць спецыяльныя ключы, якімі вы з цягам часу зможаце самастойна «падцягваць» што трэба. Хоць на працягу тэрміну гарантыйнага абслугоўвання (як правіла, не менш як тры гады) такія рэгуліроўкі бясплатна павінна рабіць фірма-ўстаноўшчык. Дарэчы, не забудзьцеся атрымаць належным чынам аформлены гарантыйны талон.

Нялішнім будзе атрымаць на фірме і экзэмпляр эскіза будучых вокнаў, асабліва калі ў вас нешта нестандартнае. Там указаны ўсе памеры, характарыстыкі, што можа дапамагчы ў спрэчных сітуацыях. Прыгадваю, як фірма не на тую створку ўстанавіла «грабёнку» для мікраправятрывання. Тэарэтычна яе можна было б перанесці, але ў новай раме засталіся б дзіркі. Паколькі эскіз, зроблены замершчыкам і адобраны намі, меўся, у выніку фірма бясплатна ўстанавіла дадатковы механізм коштам 20 доларaў на патрэбную створку.

Паставіць вокны — яшчэ не ўся справа

Пры ўстаноўцы ці замене вокнаў непазбежна паўстае пытанне далейшай аддзелкі адкосаў. Далёка не ўсе фірмы прапануюць такую паслугу, таму, не выключана, завяршаць работу давядзецца або вам асабіста, або нанятымі вамі дадаткова работнікамі. Але некаторыя, дастаткова зірнуць на фасады шматпавярховак, кідаюць усё як ёсць, што часам выдае мантажная пена ў зазорах паміж рамай і сцяной. Між тым яна баіцца вільгаці і сонца, таму яе абавязкова трэба закрыць хоць бы сіліконам.

Унутраныя адкосы звычайна тынкуюць або «зашываюць», вільгацетрывалым гіпсакардонам ці панэлямі ПВХ. Першы варыянт найбольш распаўсюджаны, гіпсакардонам лепш «зашываць» адкосы ў дамах старой забудовы, з тоўстымі сценамі. Панэлі ПВХ (можна набыць ламінаваныя) зручныя тым, што іх лёгка даглядаць, але з цягам часу яны могуць пажаўцець.

Падаконнікі, асабліва там, дзе ёсць батарэі ацяплення, лепш не рабіць вельмі глыбокімі, інакш будзе перашкода для цыркуляцыі цёплага паветра. Там, дзе іх няма і дазваляе месца, можна, наадварот, зрабіць падаконнік, які будзе або міні-сталешніцай, або невялікім столікам. На балконе ці лоджыі, калі шырыня падаконніка запланавана больш за 15 сантыметраў (для вазонаў з кветкамі), а яго даўжыня даходзіць да 3 метраў, пажадана знізу ўзмацніць яго металічным вугалком.

Устаноўку маскітных сетак лепш заказваць адразу на той жа фірме — так іх прасцей змантаваць. Яны бываюць двух відаў: рамачныя (сетка, нацягнутая на каркас) і ралетныя (па прынцыпу кшталту тых, што выкарыстоўваюцца на гандлёвых павільёнах, толькі невялікія — па памеры створак). Першыя можна на зіму здымаць, але тады трэба прадугледзець месца для захоўвання; другія мацуюцца раз і назаўсёды, але калі ў механізм нешта трапіць, самастойна на вышыні вы наўрад ці зможаце адрамантаваць яго. Рамачныя маскітныя сеткі каштуюць у сярэднім 20—25 доларaў, ралетныя — 35—40 доларaў (у залежнасці ад канкрэтных памераў). Памыляецца той, хто думае, што яны могуць спатрэбіцца толькі жыхарам першых паверхаў: машкара летам можа лёгка трапіць і ў кватэру на дзесятым паверсе.

Спачатку грошы, шклопакеты — праз 3—5 дзён

Большасць фірмаў зараз пры заключэнні дагавора бяруць перадаплату ў памеры 70 працэнтаў ад агульнага кошту «па аб'екту», як яны самі пазначаюць. Зразумела, грошы трэба ўносіць у офісе (заадно і паглядзіце на яго, што таксама часам бывае немалаважным), а не праз замершчыка. Рэшта ўносіцца пасля завяршэння ўсіх работ (за некалькі дзён, што пройдуць пасля ўстаноўкі, вы зможаце заўважыць магчымыя недахопы і выказаць свае прэтэнзіі; звычайна яны могуць датычыць рэгуліроўкі фурнітуры). Ваш заказ большасць фірмаў возьмецца выканаць у сярэднім за 3—5 дзён (падчас сезона, калі ўсе масава кідаюцца мяняць або ўстанаўліваць вокны, тэрміны могуць некалькі павялічвацца; можа ўплываць таксама складанасць абранай вамі канструкцыі). Значна павялічваецца тэрмін выканання заказу ў выпадку, калі рамы будуць з ламінацыяй — да двух тыдняў. Сам мантаж па часе займае некалькі гадзін на адно акно. Шумам перфаратара вашых суседзяў патурбуюць недзе на паўгадзіны. Далёка не ўсе фірмы аказваюць паслугу па вывазе смецця, старых рамаў, але часам за дадатковую плату можна дамовіцца непасрэдна з мантажнікамі. Прынамсі, на вынас усяго непатрэбнага да пад'езда. Дарэчы, перад устаноўкай трэба прадугледзець месца (у кватэры, калідоры) для вынасу ўжо непатрэбных канструкцый і складзіравання элементаў вашых будучых вокнаў. Гэта нагадванне не лішняе, бо рамы займаюць даволі шмат месца, таму з тых памяшканняў, дзе будуць праводзіцца работы, лепш загадзя вынесці ўсё лішняе, пры неабходнасці прыкрыць мэблю і бытавую тэхніку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Гардэробная

ШТО МОДНЫ СЕЗОН *нам рыхтуе?*

З такім пытаннем мы звярнуліся да вядучага дызайнера Беларускага цэнтра моды Эльвіры Жвікавай і з яе дапамогай склалі даведнік сезона восень—зіма 2007—2008.

Тэндэнцыі

Шматслойнасць: Вітаецца не толькі ў спалучэнні «сукенка-вадалазка», але і ў дуэтах з верхнім адзеннем. Садзейнічае гэтаму актуальная даўжыня рукава паліто — 3/4 ці 7/8. З халодным надвор'ем гэта модная тэндэнцыя, можа, і не вельмі стасуецца, аднак калі апрануць цёплы світар нават з такой даўжынёй рукавоў, будзе не надта холадна. Тэме шматслойнасці адпавядае і нашэнне сукенак ды спадніц з легінсамі і вузкімі штанамі. Наслаенне, зразумела, стварае дадатковы аб'ём, а значыць, адпавядае матыву овер-сайз (у перакладзе азначае «празмерна вялікі», нібы з большага пляча) — па-ранейшаму моднаму.

Кантраснасць фактур па сутнасці вынікае з папярэдняй тэндэнцыі: апранаеце шыфонавую (шыфон, дарэчы, амаль што гаспадар сезона — ён будзе актуальны і для вячэрняга, і для паўсядзённага адзення) ці атласную сукенку на тонкую трыкатажную вадалазку з віргінскай поўсці — кантраст забяспечаны. Такое спалучэнне выглядае стыльна, ва ўсякім выпадку ў гэтым сезоне. Што да астатніх асаблівасцяў верхняга адзення, дык выконваецца яно з разрэджаных цвідавых тканін, з фетру, з сукна, якое дае скульптурны сілуэт. Даўжыня скарочаная — практычна жакеты-паліто, якія нагадваюць стылістыку 50-х. Рукавы суцэльнакроільныя з высокай прымай, па нізе — шырокія паты. Каўнеры-стойкі мяккія, прызбораныя, з закругленнямі і шырокімі лацканамі, зашпільваюцца на маланку. Актуальная двухбортнасць, якая імітуе рускую касаваротку. Вітаецца і кантрастнасць колераў: калі паліто, скажам, белае ці чырвонае, то спражка на поясе няхай будзе чорнай.

«Спартызаванасць»: уплыў спорту на гардэроб праявіцца і на адзенні, і на абутку — відаць, адчуваецца набліжэнне Пекінскай алімпіяды.

Аскетычнасць у пэўнай ступені праявіцца ў каларыстыцы базавага адзення — усе адценні шэрага (ад колеру шэрага туману да насычанага мокрага асфальту), абавязкова чорны, карычневы, бэжавы (яны засталіся з мінулага сезона, як і матывы овер-сайз) і як інтэнсіўныя ўсплёскі — малочна-белы і чырвоны. Аднак модніцы няхай не пужаюцца: багацце колераў перамясцілася на абутак і аксесуары: шалікі, сумкі, паясы.

Носьбітамі колеру могуць быць таксама вадалазкі, майкі, топы. Даволі аскетычны і характар тканін: матэрыялы сталі больш плоскімі, вяртаецца пляскатае сукно з эфектам залізанасці, вываранасці, у калекцыях дызайнераў найбольш часта сустракаюцца гладкафарбаваныя тканіны — набіўкі адыходзяць на другі план.

Самыя модныя прапановы абутку будуць «размяшчацца» ў зоне калена — невысокія, практычна на плоскім хаду боты. Яблага, калі выкананы ён будзе з велюру: матэрыял забяспечыць мяккае тушэ нават самаму смеламу колеру. Батфорты перасталі быць хітовымі. Апошнія цёплыя дзянькі можна дахадзіць у плоскіх балетках з вострымі насамі, а потым перайсці на плоскія бацільёны з вострымі ці акруглымі насамі. Сапфіравыя, ліловыя адценні, колер бутэлечнага шкла — адны з самых модных у гэтым сезоне.

Набыткі

Што варта набыць для ўласнага гардэроба ці адшукаць у шафах?

Сукенка, безумоўна, правіць баль практычна ва ўсіх варыяцыях. Гэта і мяккія трыкатажныя варыянты, крыху дзіцячыя, з круглымі какеткамі, прызбораныя на грудзях, з каўнерамі-стоечкамі ці з гарлавінай, аформленай выразам «лодачка», з рукавом ці без (так званыя сукенкі-сарафаны), сабраныя па нізе, на прытачным поясе-манжэце. На рукавах сукенак робіцца зборка, ствараючы аб'ёмныя рукавы-фэнтазі. Гэта і маленькія лаканічныя сукенкі ў духу 60-х — адразныя па таліі, з мноствам вытачак, з маленькімі кароткімі рукавамі, якія прадугледжваюць вадалазкі пад ніз (шматслойнасць абавязвае). Гарлавіны сукенак з джэрсі могуць афармляцца буйнымі камянямі-стразамі ў тон асноўнага матэрыялу.

Камізэлька, як і падцяжкі, запазычанне з мужчынскага гардэроба, аднак моднай будзе не маленькая прыталеная камізэлька, а дастаткова прасторная і шырокая, каб пад ёй умясцілася прасторная кашуля-блуза з мноствам зашчыпаў ці дробных рушаў.

Легінсы не губляюць сваёй актуальнасці, у гэтым сезоне яны служаць альтэрнатывай вузкім штанам і носяцца са спадніцай.

Спадніцы дастаткова кароткія, з сустрэчнымі складкамі, завужаныя ўнізе, з шырокім падгінаннем, у форме цюльпана. Абавязковая ўмова — кішэні ў бакавым шве.

Жакеты класічнай формы, для іх галоўнае — якаснае выкананне і бездакорная пасадка на фігуры.

Штаны ў розных варыяцыях: ад неверагодна вузкіх, са стрэлкамі, са спецыяльным пакрыццём-пігментам, які дае глянцавы эфект, — да вельмі шырокіх, са складкамі, з кішэнямі ў падразным бачку, з суцэльнакроільным поясам-карсажам, на шлейках, якія імітуюць падцяжкі.

Блузкі пераважна белыя, з тонкага батысту, са шматлікімі аздабленнямі — эфектнымі какеткамі і манішкамі, зашчыпамі і складачкамі, застрочанымі ў розных накірунках. Такая вялікая колькасць упрыгажэнняў тлумачыцца яшчэ і тым, што засцежка ў жакетах на два гузікі дастаткова нізкая, і звычайная блузка не будзе эфектна выглядаць у глыбокім выразе. Самыі моднымі будуць блузкі ў духу овер-сайз, запраўленыя ў шырокія штаны з поясам-карсажам.

Вадалазкі ў гэтым сезоне будуць адрознівацца асабліва высокай гарлавінай, неадпаведнай шыі, таму будзе збірацца ў лёгкую драпіроўку.

Футра: не соромна, калі яно будзе штучным, аднак пажадана, каб расфарбоўка была набліжана да натуральнай. Даўжыня футравых вырабаў укарочаная — прагнозы наконт актуальнасці неверагодна доўгага верхняга адзення не спраўдзіліся.

Аксесуары

У гэтым сезоне аксесуары практычна абавязаны быць яркімі і каляровымі. Шалікі з шыфону, трусіная пуху ці шарсцяных ніцяў выконваюцца ў бірузовых, жоўтых, фіялетавых, сапфіравых танах. Моднымі будуць дастаткова масіўныя сумкі на дзвюх ручках, цвёрдай формы, якія ў нечым нагадваюць баулы. Паясы рэкамендуецца аздабляць пластыкавай фурнітурай — металізаваная ў гэтым сезоне не такая акутуальная, хіба што ў джынсавым адзенні. Моднымі акцэнтамі жаночага гардэроба стануць каўнер-стойка, рушы і накладныя кішэні.

Не забывайцеся, што гэта не інструкцыя, а проста накірункі для фантазіі, бо самыя модныя рашэнні — вашы: толькі вы ведаеце, што вам пасуе найбольш.

Ала МАЧАЛАВА.

ЗА КРОК ДА АЛІМПІЯДЫ

Баскетбалісткі зборнай Беларусі плануюць заваяваць адну з пяці пуцёвак у Пекін

У Нацыянальным аэрапорце «Мінск» сустракалі баскетбольную зборную нашай краіны, якая вярталася з чэмпіянату Еўропы з бронзавымі медалямі. Такой колькасці родных, сяброў, журналістаў і балельшчыкаў у сваёй памяці я не ўзгадаю. Яшчэ за паўгадзіны да прылёту самалёта з Рыма па прыблізных падліках было каля сотні ахвотных першымі пабачыць нашых гераінь, якія ў напружаных драматычных раздзінках на баскетбольнай пляцоўцы даказалі, што і слабы пол ператвараецца ў моцны, калі трэба. Асабліва хацелася пабачыць Кацярыну Сніціну, бо Насця Верамеенка паабяцала, калі атрымаецца выйграць медалі (незалежна ад іх якасці), яна будзе стрыгчы сяброўку прама ў аэрапорце. Гадзіннік паказваў палову на пятую, а баскетбалісткі ўсё не выходзілі. Нехта пажартаваў: «Магчыма, хтосьці з дзяўчат з сабой прыхапіў італьянскія каштоўнасці, ці медалі нельга правозіць?» «Дык яны ж «бронзу», а не «золата» вязуць!» — падключыўся адзін мой калега. Праўда, гэтая «бронза» для нашай краіны бы «золата», таму што дагэтуль беларускім камандам у гульнявых алімпійскіх відах спорту ўзысці на еўрапейскі п'едэстал не ўдавалася. Нарэшце выйшла ўся каманда. Дзяўчаты і тут, бы на пляцоўцы, паказалі сябе як адзіны калектыў.

— Вельмі прыемна, што столькі людзей прыйшло нас сустракаць. Адразу разумееш, якая ў нас была вялікая падтрымка, — прызналася Святлана Вольная. — Дзякуй усім! Мы спадзяёмся трапіць на Алімпіяду, каб працягваць радаваць нашых балельшчыкаў.

— Мы былі вартыя на большае, але нам крыху не хапіла згулянасці, — заўважыла капітан зборнай Наталля Трафімава. — Аднак мы зможам яшчэ дадаць і тады не за гарамі Алімпіяда. Трэцяе месца на «Еўропе» — для нас яшчэ не найбольшая вышыня.

У гэтыя словы сапраўды хочацца верыць, узгадваючы атакі беларусак, іх настрой на барацьбу, нягледзячы на траўмы. У прыватнасці, Алена Леўчанка прыехала на радзіму з гіпсам на руцэ. Пашкодзіла яе якраз у матчы за трэцяе месца супраць каманды Латвіі. Раптам маю ўвагу прыцягнула Каця Сніцына, якая... ужо была з кароткай стрыжкай. На пытанне, калі ж з'явілася новая прычоска, спартсменка з усмешкай сказала:

— Гэта адбылося адразу пасля матча з камандай Латвіі. Стрыгла, зразумела, Насця Верамеенка. Яна зараз мой асабісты стыліст. З новай прычоскай я адчуваю сябе вольнай, але галоўнае не што на галаве, а што на маёй шыі медаль.

— Ці праўда, што нягледзячы на ўдалую стрыжку, цябе запісалі ў салон?

— Ой, толькі Насці не кажыце!

— Якія наогул у цябе ўражанні ад першага ўдзелу ў турніры такога высока ўзроўню?

— Было весела! (усміхаецца) Безумоўна, уражанняў у мяне шмат, бо гэты чэмпіянат стаў для нашай каманды дэбютным і адразу такі поспех. Калі нас узнагароджвалі, пасыпалася канфеці, мы плакалі. Не хавалі эмоцый. Нягледзячы на трэцяе месца, мы спявалі разам з расіянкамі «We are the Champions».

Прадстаўнікі Мінспорту, трэнеры, балельшчыкі віншавалі бронзавых прызёраў, дарылі ім букеты. Прысутныя на радасцях крычалі «Ура! Брава! Бе-ла-русь!» Дзень прыезду баскетбалістак стаў нацыянальным святам. І гэта апраўдана.

— Спадзяюся, што гэты поспех дапаможа ў развіцці беларускага баскетбола, — выказаў спадзяванне галоўны трэнер каманды Анатоль Буяльскі. — Патэнцыял у нас ёсць. Неабходна толькі правільна яго выкарыстаць.

— Які матч вы назвалі б ключавым — з італьянкамі (менавіта перамога над гаспадынямі выводзіла беларусак у наступную стадыю турніру) ці з дзеючымі чэмпіёнкамі — чэшкамі?

— Не той і не іншы, — здзівіў Анатоль Сяргеевіч. — Мне здаецца, што для нас было вельмі важна выйграць першую гульню (з Харватыяй), каб з'явіўся кураж, настрой на далейшыя перамогі.

— «Бронза» даказвае, што дэбют на Еўрабаскеце атрымаўся. Аднак ці ўсім вы задаволены як трэнер?

— Дзяўчаты малайцы. Я задаволены іх мужнасцю і характарам ва ўсіх матчах. Адзінае, на што хацеў бы звярнуць увагу: для такой маладой каманды, як наша, правесці дзевяць сустрэч за 14 дзён было нялёгкай справай пры такім шчыльным графіку. То было два дні перапынку ад гульняў, то матчы праходзілі штодня. Магчыма, гэта звыкла для вопытных баскетбалістак. Нашы ж рваліся ў бой, а былі два дні трэніровак, ці даводзілася ісці на пляцоўку пасля напружанага ўчарашняга матча.

— Калі вы зразумелі, што будзе медаль?

— Верыў у каманду я яшчэ тры гады таму, калі ў мяне з іроніяй цікавіліся: «Ну, як рыхтуецеся да Алімпіяды?» На чэмпіянаце Еўропы дзяўчатам давялося сустрэцца з вельмі моцнымі камандамі. Расіі ў гэтым сэнсе пашанцавала болей, бо мы спынілі чэмпіёнак, адабралі крыху сілы ў іспанак.

— Летам 2008 года 12 камандаў будуць змагацца за пяць пуцёвак у Пекін. Што трэба, каб нашы дзяўчаты не згубілі свой аптымістычны настрой пасля завяршэння кваліфікацыйнага турніру?

— Мы падцягнем некаторыя аспекты нашай гульні і, мяркую, на перадалімпійскім турніры каманда будзе выглядаць яшчэ больш пераканаўча.

— Асабіста вы як плануеце святкаваць поспех каманды?

— Ой, я хачу хутчэй дадому да дачкі!

Нагадаю, што напрамую на Алімпіяду-2008 адправяцца каманды Расіі, Кітая, Аўстраліі, Японіі, Новай Зеландыі, ЗША і Малі. Пяць астатніх удзельнікаў Гульняў вызначацца ў кваліфікацыйным турніры, які адбудзецца летам наступнага года. Сярод прэтэндэнтаў Іспанія, Беларусь, Латвія, Чэхія, Куба, Бразілія, Аргенціна, Карэя, Тайвань, Фіджы, Сенегал і Ангола. Пажадаем нашым дзяўчатам удачы і будзем працягваць «хварэць» за нашу зборную.

Ірына ПРЫМАК.

Рэха публікацыі

У кожнага ёсць выбар

На артыкул «Любіць жывых» («Звязда», 15.09.2007 г.) адгукнуліся чытачы, а гэта значыць, што ўзнятая тэма не пакінула іх абыякавымі.

Нагадаю. Гаворка ў артыкуле ішла пра тое, што неабходна найперш шанаваць чалавека пры жыцці, а які на яго магіле будзе стаяць помнік — справа другарадная. А штуршком для размовы сталі могілкі «Трышынскія» ў Брэсце, дзе многа магіл высокапастаўленых чыноўнікаў XIX стагоддзя з паваленымі помнікамі. Узводзіліся на стагоддзі, а ці быў у гэтым сэнс?

— Сумна бывае на нашых памінках, бо здаецца, што не з чалавекам развіталіся, а вяселле гуляюць. Не ведаю, як у іншых краінах, а вось ва Украіне і ў Расіі такога няма, усё больш сціпла — няма той «абжыралаўкі», як у нас. Давялося мне ехаць праз Казахстан і з вагона цягніка ўдалечыні ўбачыла белы горад, а мне растлумачылі, што гэта не горад, а могілкі з пабудаванымі на іх маўзалеямі. Вядома, у нас не такі размах, але чаму мы не можам пахаваць роднага чалавека цывілізавана, па-еўрапейску? — пытаецца Любоў Абрамчук з Мінска.

Зазірніце на могілкі. Многа мы знойдзем помнікаў з надпісам па-беларуску? Найчасцей што на ўсе могілкі ніводнага. І гэта пры тым, што ніхто не прымушае пісаць на той ці іншай мове — чалавек выбірае сам. А куды кідаюць смецце, навёўшы парадак на «сваёй магіле»? На суседнюю — забытую. А рознакаліберныя помнікі і агароджы таксама пра нешта гавораць.

Але як паступаюць у Еўропе? Што значыць пахаваць па-еўрапейску?

Звернемся да гнеўнага ліста з пас. Сасновы Асіповіцкага раёна.

— Не трэба ўзнаўляць азіятчыну, звярніце свой позірк у Еўропу, адарвіцеся ад стэпаў, — піша Яўген Васільеў.

Вось і зазірнём на могілкі Парыжа, бо дзе ўжо Еўропа, калі не ў гэтым горадзе? Там магілы дагледжаныя і алеі падмеценыя, але кожны, хто хоча там ляжаць, павінен выкупіць сабе месца на агавораны тэрмін, напрыклад, 50 гадоў. Праз паўвека радні неабходна падпісаць новы дагавор. А інакш у гэтую магілу будзе пакладзены яшчэ адзін нябожчык. І нікога не здзіўляе, калі ў магіле «стосам» ляжаць чацыёра памерлых. За ўсё ў Еўропе трэба плаціць і ніхто з магілы пыл здзьмухваць не будзе толькі за тое, што там ляжаць астанкі нейкага там «тайнага саветніка».

А крэмацыя сёння не толькі ў Еўропе, але і ва ўсім свеце распаўсюджаная, асабліва ў мегаполісах.

Але быць спаленым ці ўявіць, што над табой у магіле будзе ляжаць яшчэ адзін нябожчык нашаму чалавеку цяжка. А гэта і ёсць Еўропа — прагматычная і даволі цынічная. Так што тут, магчыма, Азія з яе маўзалеямі на магілах больш падыдзе камусьці. Вось тут і трэба падумаць: куды больш душа цягне — у Еўропу ці Азію?

У Беларусі, як і на тэрыторыі іншых краін постсавецкай прасторы, з'явіліся добраўпарадкаваныя могілкі нямецкіх салдат, загінулых у Другую сусветную вайну. Іх не было б, калі б Германія не заплаціла грошы, і гэта разумна. У дадзеным выпадку зацікаўленасць праявіла дзяржава. Праводзяцца перапахаванні салдатаў і ў нашай краіне. Але калі магіла прыватная, то гэта і праблема радні, якая павінна думаць, што з той магілай будзе.

А наконт таго, што мільёны «ворагаў народа» ляжаць у вечнай мерзлаце Сібіры, а на іх магілах толькі слупкі з нумарамі (якіх ужо і няма), то я і кажу: любіць трэба жывых і цаніць выццё як самае дарагое. Каб было так, то і не з'явіліся б «ворагі народа».

Уцягвацца ў спрэчку няма ніякай ахвоты. Вось у сваім артыкуле я ўспомніў Чынгісхана толькі таму, што калі б была яго магіла, то косці хана паказвалі б на вітрыне, як астанкі фараонаў, а ўжо гучыць «... прыклад пахавання Чынгісхана — не прыклад для еўрапейцаў...». Чаму не прыклад? Няўжо пахаваць у зямлю без помніка горш, чым спаліць у крэматорыі?!

А ў цэлым гэта дробязь, бо ў кожнага ёсць выбар.

— Не трэба пераконваць майго ўнука і праўнука, што я тлен і павінен знікнуць, — папракае чытач.

Калі некаму будуць на магілу класці кветкі праўнукі, то і добра. А тое, што мы станем тленам і знікнем, то куды ад гэтага падзенешся — закон Прыроды. Вунь наймагутнейшы ў свой час род Радзівілаў знік і над іх трунамі ў Нясвіжскім касцёле няма каму галаву схіліць з радні. І нічога страшнага, лічу, у гэтым няма.

Што датычыцца асабіста мяне, то хацелася б адысці сціпла і ціха: без памінак, адпявання ды і помнік не абавязкова — дастаткова каменя.

А закончыць хачу выказваннем рымскага імператара Марка Аўрэлія, празванага «філосафам на троне»: «Час чалавечага жыцця імгненне: яго сутнасць вечнае цячэнне. Усё чалавечае мімалётнае, караткавечнае; тое, што ўчора было ў зародку, заўтра мумія ці прах. Дык вось, правядзі гэты момант часу ў згодзе з прыродай, а затым развітайся з жыццём гэтак жа лёгка, як ападае спелая аліва: услаўляючы прыроду, якая яе нарадзіла і з удзячнасцю да дрэва, якое яе стварыла».

І што да гэтага можна дадаць?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ

Яўменаў і небажыхар

У часы нашага дзяцінства небажыхарамі былі не анёлы з херувімамі, а простыя лётчыкі са звычайнымі касманаўтамі. Ледзь не ў кожным парку стаяла дашчаная ракета, і мы проста не маглі не гуляць у касманаўтаў. І гулялі, і ляцелі з Месяца на Марс, падарожнічалі па Венеры, наведваліся на планеты з назвамі кшталту К-777. А мой сусед і раўнагодак Юра Яўменаў пісаў раманы пра касмічны пыл і міжгалактычныя вандроўкі. Калі ён мне адкрыў таямніцу ўласнай творчасці, на ягоным стэлажы ўжо хавалася за кнігамі ажно восем тоўстых сшыткаў з фантастычнымі раманамі. Я ўзяў адзін сшытак і прачытаў. «Ну як?» — запытаўся аўтар. «А што гэта за прозвішча ў касманаўта — Макаронаў?». Юра сумеўся. «Не бывае такіх прозвішчаў...» Яўменаў пакрыўдзіўся. І колькі я потым ні хваліў ягоны твор пра Макаронава, крыўда не прахадзіла. Зрэшты, я і цяпер думаю, што небажыхар не можа быць Макаронавым.

Вова і птушкі

«Вова, якую карціну будзеш маляваць?» — «Сем параненых птушак». Вова апранае бацькаву кашулю з абрэзанымі рукавамі, такі ў яго рабочы халат. Ён адкаркоўвае баночкі з гуашшу і няспешна малюе на белым аркушы сем чорных птушак з чырвонымі ранамі. «Вова, намалюй неба...» — прапаноўвае настаўнік Іваноў. Мой унук робіць выгляд, што не чуе настаўніка, і закрывае баночкі.

Аляксандр і «АнтыБегбедэр»

З Францыі ў Беларусь прыехаў даследчык еўрапейскіх каштоўнасцяў — Аляксандр. «Калі на твой нос начапіць акуляры, ты станеш падобны да Бегбедэра!» — гэта першае, што я сказаў Аляксандру падчас знаёмства. «Уваў, я ненавіджу Бегбедэра. Калі я вучыўся ў ліцэі, я стварыў таварыства «АнтыБегбедэр». У кнігарнях мяне проста ванітуе ад сучаснай французскай літаратуры...» — «Будзем лічыць, што Бегбедэру пашанцавала з апанентамі. У мяне хапае тых, хто лічыць сябе Анты-Глобусам, але яны ўсё ніяк не збяруцца ў адно таварыства...» Пажартаваўшы, мы перайшлі да сур'ёзнай размовы і дзве гадзіны прагаварылі пра пабудову новай Еўрапейскай імперыі.

Алена і запрашэнні

Калі я піў, увесь час хацелася, каб мяне некуды запрасілі, а я там узяў ды напіўся. Ну а хто будзе запрашаць чалавека, які прыходзіць і напіваецца ўсмерць? Мала такіх. Калі я кінуў піць, мяне паўсюль запрашаюць, а я не вельмі хачу прыходзіць і глядзець, як нехта іншы напіваецца і спрабуе абліць мяне сваёй сацыяльнай нянавісцю... «Мы прыходзім у свет голыя, мы голыя і сыходзім! А ты...» — «Я сыду ў дарагім касцюме...» — «Ты нават думаеш за грошы...» — «За грошы не думаю...» Даводзіцца стрымлівацца. Запрашэнняў усё больш і больш. Смаленскія брыльянты, прэмія са Стакгольма, уладзіны ў італьянскай амбасадзе, новы дыск Вайцюшкевіча, 100 гадоў Нашай Ніве ў Берліне, кніга Астраўцова... Я хаджу на тусоўкі праз раз. Прыходжу на пачатак, вітаюся, усміхаюся, кажу «дзякуй» за персанальнае запрашэнне і сыходжу. А вось жонка мая Алена любіць ультрамадэрнісцкія вечарынкі гламурных чэлаў. «У мяне самы лепшы брылік!» «Няма нічога смачнейшага за італьянскую пасту!» «Афіцыянтамі былі сапраўдныя мурыны ў белах парыках!» «Ты будзеш здымацца ў рэкламным кліпе маёй кнігі?» Адмовіцца ад удзелу ў шоў, якое ладзіць жонка з нагоды выхаду сваёй кнігі «Bielaruski. Women of Europe», не магу. Здымаюся разам з Клаўдзіяй, Наташай і Вэндзі. Мы ўсе гаворым, якая таленавітая Алена: Клаўдзія па-італьянску з нямецкім акцэнтам, Наташа па-руску, Вэндзі па-ангельску... «Якая правільная ў Вэндзі ангельская мова!» — «Яна ж з Англіі!» — «А настаўніцай яна не працавала?» — «Здаецца, працавала...» — «Чуваць. У Вэндзі не проста сапраўдная ангельская мова, у яе мова лонданскай настаўніцы!» — «Наташа запрасіла мяне ў Лондан. Ты не хочаш паехаць з намі ў Англію?» — «Я ў Лондане быў два разы...» — «Не паедзеш?» — «Не...» — «Будзеш сядзець са сваімі п'яніцамі ў «Акварыуме»?» — «Буду сядзець са сваімі п'яніцамі ў «Акварыуме», «Лондане» і «Старым Менску». А што?» — «Сядзі!» Запрашэнні, запрашэнні... Яны сыплюцца на мяне з розных бакоў. Дзякуючы ім, я навучыўся не адказваць па тэлефоне, калі нумар не вызначаецца.

Аліса і запрашэнне

Аліса пераехала з Мінска ў Ілічоўск, што пад Адэсаю. Цяпер яна збіраецца зняць дом у самой Адэсе. «Там будзе пакой для гасцей, і я запрашаю Вас туды. Вы будзеце гуляць каля мора і пісаць свае ўражанні...» Алісе некалі спадабалася мая кніга падарожнай прозы — «Сшыткі», а пра Адэсу там ніводнага слова няма. Аліса хоча, каб і пра Адэсу было. Можна напісаць: пра Алешу і Паустоўскага, пра Эйзенштэйна з браняносцам... Але мне не гэта важна, мяне цешыць тое, што я нарэшце стаў сапраўдным літаратарам, якога запрашаюць пажыць каля мора. Вядома ж, мяне запрашалі шмат разоў і шмат разоў я некуды ездзіў, а яшчэ больш разоў я адмаўляўся, бо часу бракавала, і ў два месцы адразу не паедзеш. Толькі ўсе папярэднія запрашэнні былі, скажам так, афіцыйныя, дзяржаўныя і паўдзяржаўныя. Семінары, конкурсы, прэзентацыі, лекцыі — выдатна... Але ж гэта без цеплыні, без шчырасці і любові. Ты ж ведаеш, як зазвычай запрашаюць: адзін абхаз, адзін албанец, адзін амерыканец ну і адзін брат-беларус. Карацей, палітыка гэта, а не мастацтва. Палітыку не люблю. Мне прыват быў заўсёды даражэйшы за палітасвету. Таму запрашэнне Алісы мяне цешыць. Можна сядзець сабе ў крэсле і ўяўляць, як гуляю каля Чорнага мора і ў кавярнях натую свае ўражанні пра Адэсу... Хораша... Уявіў, і можна нікуды не ехаць.

Тата і кветкі

Чытаю дзённікі суседа — дзядзькі Валодзі Караткевіча: «29/IV. Чацвер. (...) Нашы ўмеюць толькі балбатаць, як папугаі ў клетках, на сходах пра вобраз станоўчага героя. Ты — пішы яго, паказвай яго, а не дундукай. Сёння (+)12? Сонечна, але наплываюць хмары. І вось палова трэцяй, а надвор'е пахмурнае, можа быць дождж. Учора Адамчык прынёс жонцы з лесу букецік сініх вочак-пралесак. Скора маюць з'явіцца іх вялікасць смарчкі». Робіцца крыху сорамна, бо, пішучы пра тату з мамаю, ні разу не згадаў я пра кветкі, пра той жа букет пралесак.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

БЛІЦ-34

У якасці яго заданняў, як звычайна, падаём кампазіцыі нашых чытачоў:



№ 1 (Дзмітрый Камчыцкі, Магілёў). БЕЛЫЯ: a5, c1, e5, g7 (4). ЧОРНЫЯ: a3, c3, d4, f6, h8 (5). Пачатковая расстаноўка нагадвае вілкі для чыгунка.

№ 2 (Пётр Кажаноўскі, в. Кашэвічы Пінскага раёна). БЕЛЫЯ: d2, дамкі b8, c7 (3). ЧОРНЫЯ: a3, d4 (2).

№ 3 (Міхаіл Стэфановіч, Гродна). БЕЛЫЯ: a7, b4, d2, f2, f6, g3, g5 (7). ЧОРНЫЯ: b2, c3, d6, d8, e7, h4, h8 (7).

У эцюдах і камбінацыі — ход і выйгрыш белых.

Пераможцу чакае сюрпрыз ад ветэрана працы Анатоля Антонавіча Пярхальскага (Глыбокае) — яго Зборнік звяздоўскай шашачнай рубрыкі за 2004 год. Такія Зборнікі ён падрыхтаваў таксама і за 2005 і 2006 гады, якія, як і сам конкурс, прысвячае 90-годдзю газеты «Звязда».

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

ДАСЛЕДВАННІ ЗВЯЗДОЎЦА

Уладзімір Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна) за перамогу ў адным з нашых конкурсаў атрымаў прыз — энцыклапедычнае выданне У. Маламеда і Ю. Барскага «Курс шашечных окончаний. Международные и русские шашки» (Москва, «Физкультура и спорт», 1989). Праштудзіраваўшы яго, знайшоў, што ў наступных заканчэннях можна згуляць больш рацыянальна:

№ 1. БЕЛЫЯ: дамкі a1, a5, a7 (3). ЧОРНЫЯ: a3, дамка c1 (2).
1. ah8 ch6 2. hg7 3. ac5 4. a:c3x.

№ 2. БЕЛЫЯ: дамкі a1, a5, a7 (3). ЧОРНЫЯ: a3, дамка d8 (2).
1. ah8 dh4 2. af2 3. hc3 4. a:c3x.

Такія рашэнні даюцца ў тэарэтычнай кнізе. А што заўважыў У. Бандарык?

ВЯДУЧЫ РУБРЫКІ

Віталь Варушыла змястоўна вядзе рубрыку «Шашкі» у газеце «Спортивная панорама». Ён вядомы як майстар гульні ў міжнародныя шашкі. Аднак захапляецца і шашачнай кампазіцыяй. Пазнаёмцеся з яго некаторымі задумкамі на 100 і 64-клетачных дошках:



№ 1. БЕЛЫЯ: 24, 29, 32, 33, 34, 36, 39, 40, 41, 43, 45, 48, 49 (13). ЧОРНЫЯ: 1, 7, 8, 9, 10, 13, 15, 17, 18, 19, 20, 23, 25 (13).

Практычная пазіцыя: 1. 36-31 2. 32-28 3. 29-24 4. 39-33 5. 31-27 6. 43:5x.

№ 2. БЕЛЫЯ: 27, 28, 31, 32, дамкі 33, 37, 41 (7). ЧОРНЫЯ: 4, 13, 17, дамкі 5, 16, 26, 50 (7).

«Слупняк»: 38, 9, 49, 19, 10! (46A) 5x. A (5) 46x.

№ 3. БЕЛЫЯ: 12, 23, 33, 34, 39, дамкі 45, 50 (7). ЧОРНЫЯ: 14, 24, 32, дамкі 1, 5, 46 (6).

Зноў трагедыя для чорных на вялікай дарозе: 29!, 41!, 10x.



№ 4. БЕЛЫЯ: a7, c1, c5, d2, e3, e7, f4 (7). ЧОРНЫЯ: a3, b6, d4, d6, d8, g7, h2 (7).

Белыя ўдарам «пяткай» блакіруюць простую чорных. Пераканайцеся ў гэтым самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

Белгазпромбанк

УВЕДОМЛЕНИЕ

ОАО «Белгазпромбанк» уведомляет о возобновлении проведения открытой подписки на простые (обыкновенные) акции шестого выпуска ОАО «Белгазпромбанк».

УВЕДОМЛЕНИЕ
о созыве внеочередного собрания акционеров ОАО «Старая фабрика»

Наблюдательный совет ОАО «Старая фабрика» извещает акционеров Общества о проведении внеочередного общего собрания акционеров.

Собрание состоится 14 ноября 2007 года в 10.00 в помещении Общества по адресу г. Минск, ул. Октябрьская, 19.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 9 месяцев 2007 г.
2. О внесении изменений в порядок распределения чистой прибыли за 2007 г.
3. О вознаграждении членов Наблюдательного совета.
4. О реконструкции здания, принадлежащего ОАО «Старая фабрика».

Регистрация участников собрания будет проводиться в день проведения собрания с 9.30 до 10.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

Наблюдательный совет ОАО «Старая фабрика».

Выпрабавана на сабе

Дзяўчына, дазвольце Вас... аштрафаваць

Менш чым за 15 хвілін я налічыў больш як 20 пешаходаў, якія пераходзілі і перабягалі дарогу ў непрадугледжаных месцах. І гэта, улічваючы тое, што перыядычна наш аўто ДАІ спыняўся, каб правесці прафілактычную работу з пешаходамі-парушальнікамі. Патэнцыйныя «самазабойцы», калі з машыны ДАІ выходзіў інспектар, адразу пачыналі апраўдвацца: «Вінаваты, больш не буду!» Будзе, і яшчэ як!..

Вось дзяўчына-прыгажуня перабягае праспект. Да зебры для пешаходаў усяго метраў 10. Ды навошта? Тут жа бліжэй! А вось адразу некалькі чалавек літаральна кідаюцца на дарогу. Адзін таварыш парушае правілы, нягледзячы нават на тое, што побач дзяжурыць супрацоўнік ДАІ. Яму «пашанцавала», бо міліцыянер стаяў да яго спінай, правяраў дакументы ў кіроўцы. А праз некалькі дзесяткаў метраў бачым, што мужчына ідзе па раздзяляльнай паласе, быццам, па тратуары. Спыняем і яго. Аказваецца, ён сам — аўтааматар, значыць, правілы павінен ведаць лепш за звычайных пешаходаў. Надоўга запомню маладую віцябчанку, якая літаральна уцякала ад спецмашыны, разлічваючы схавацца недзе ў дварах.

Праграма «мінус 100» па змяншэнню на адпаведную лічбу колькасці ахвяр ДТЗ, дзякуючы маштабнай рэкламнай кампаніі, вядома ўсім. Некаторыя, чамусьці, з усмешкай адносяцца да такой назвы. Ну, кожны думае ў меру сваёй...

Шэсць абласцей у краіне ды Мінск, калі 100 падзяліць на 7, атрымаецца што ў кожным рэгіёне загінулых на дарозе павінна быць на 14—15 чалавек менш. Калі праграма не выконваецца, хто вінаваты? Даішнікі? Але ж падчас рэйду асабіста зразумеў, што з такой звычкай пераходзіць дарогу мы самі можам мінус перавесці ў плюс. На жаль.

Пешахода-парушальніка можна альбо папярэдзіць, альбо аштрафаваць: зараз за парушэнне трэба будзе заплаціць 15,5 тысячы беларускіх рублёў. Столькі ж заплаціць і пешаход, калі ў вячэрні ці начны час ідзе па краі праезнай часткі без ліхтара альбо спецыяльных элементаў, што адбіваюць святло. Напэўна, пакаранне вельмі мяккае. Мне часта даводзілася раней уступаць у спрэчкі з высокімі чынамі наконт мяккасці пакарання наогул.

Як часта мы любім гаварыць: вось у Еўропе... Штрафы за парушэнні на дарогах там такія, што прасцей выконваць правілы. Калі б у нас пешаходаў штрафавалі тысяч на 100, мо і адразу меней было б парушальнікаў? А тыя ж флікеры. Нават беларускаму беспрацоўнаму па кішэні набыць іх на ўсю сям'ю, і каштаваць гэта будзе мегаполіс ней, чым заплаціць аднаразовы штраф.

Чамусьці ўладальнікі коней «забываюць», што і гужавы транспарт трэба зрабіць бачным у цемры. Паводле даных на сярэдзіну верасня, на Віцебшчыне зарэгістравана ўжо восем наездаў на гужавы транспарт. Спецыяльны камплект абыдзецца да 10 тысяч беларускіх рублёў. Інспектары падчас адпаведнай акцыі самі наклейвалі спецыяльныя элементы на павозкі, каб коні заўсёды былі бачныя на дарозе (на фота). Ідэй цікавых у даішнікаў Віцебшчыны шмат. Той жа верталёт можна выкарыстоўваць для прафілактычных мэтаў.

Начальнік управлення ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама Мікалай Юнцэвіч канстатаваў: «Пешаходы — лідары сярод тых, хто пацярпеў на дарогах. Каля паловы ўсіх здарэнняў адбываюцца з іх удзелам, а часта і па іх віне. Дзіцячы траўматызм — гэта вялікая бяда. Паводле статыстыкі, найбольшая колькасць ДТЗ з удзелам дзяцей і па іх віне адбываецца ў летні перыяд, цёмны час сутак, у выхадныя дні. Выходзіць, што менавіта падчас «бацькоўскіх» дзён дзеці аказваюцца безнагляднымі. Гэта значыць, што ў настаўнікаў школ, выхавальнікаў дзіцячых садкоў адчуванне адказнасці значна мацнейшае, чым у бацькоў. Віцебскія супрацоўнікі ДАІ, дарэчы, першымі ў краіне адкрылі ліцэйскі клас ДАІ. Многія былыя ліцэісты потым звязваюць сваё жыццё са службай у праваахоўных органах. Падчас спецыяльнай падрыхтоўкі вучацца кіраваць аўто з магчымасцю атрымаць правы адразу пасля дасягнення 18 — гадовага ўзросту.

Як паведамілі «Звяздзе» ў групе агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама, за восем месяцаў гэтага года ў Прыдзвінскім краі да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў дарожнага руху прыцягнуты 4450 пешаходаў.

Парушальнікаў лавіў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Во даюць!

Як Сяўко і Джэсі наводзяць парадак на вуліцы

Уявіце сабе акуратна апранутага дворніка, які ідзе па вуліцы з венікам і шуфлікам, а за ім важна шпацыруе са смеццевым вядром у зубах пародзісты сабака. Пры гэтым жывёліна не звяртае ніякай увагі на тых, хто спрабуе да яе дакрануцца. Гэты незвычайны дуэт можна ўбачыць на вуліцы Кляцкова ў Гродне. Апошнім часам дворніку Сяўко і яго незвычайнай памочніцы ўдзялялі шмат увагі, нават тэлебачанне пра іх сюжэт здымала. Але ні Леаніду Валяр'янавічу, ні прыгажуні Джэсі зорная хвароба не пагражае — працуюць, як і раней.

Фота Міхаіла ІСАЧАНКІ.

Здавалася б, нічога асаблівага — чалавек выйшаў на вуліцу з сабакам. Але, згадзіцеся, не кожны дзень убачыш пародзістага сабаку, які старанна дапамагае свайму гаспадару прыбіраць вуліцы.

— Да нас Джэсі трапіла выпадкова, — расказвае Леанід Валяр'янавіч. — Сем гадоў таму сяброўка дачкі знайшла на вуліцы маленькага сабачку, але не змагла пакінуць сабе. Дачка, доўга не думаючы, шчаня купіла. Спачатку мы з жонкай былі супраць такога суседства, а потым — пашкадавалі, сталі гадаваць. Вучыць Джэсі давялося многаму.

Праз некаторы час дачка пакінула бацькоўскі дом, але сабаку з сабою ўзяць не змагла. З той пары сваім гаспадаром Джэсі лічыць Леаніда Валяр'янавіча. Адразу яна насіла з магазіна сумкі з прадуктамі, а аднойчы, калі гаспадар працаваў, схапіла венік і... панесла... Спачатку Сяўко дзівіўся з незвычайных паводзінаў сваёй чатырохногай сяброўкі, а потым прывык. І цяпер ніводны працоўны дзень не абыходзіцца без яе дапамогі.

Джэсі — незвычайны сабака. Яго лёгка прывучыць да новага, ён ахвотна выконвае ўсе загады свайго гаспадара, праўда, дома заставацца адзін не любіць. Калі бачыць, што Леанід Валяр'янавіч збіраецца некуды ісці, то гатовы пакінуць нават любімую ежу, каб толькі быць побач з ім.

Некалькі гадоў таму сабака мог загінуць. Джэсі нарадзіла 18 шчанят і так схуднела, што, здавалася, хутка памрэ... Перажывалі не толькі гаспадары, але і суседзі. На шчасце, усё абышлося. У другі раз нарадзілася 17 шчанят, потым — яшчэ 14. Малых забіраюць вельмі хутка. І не дзіва, бо ўбачыўшы Джэсі, абавязкова хочацца завесці сабе такога ж сябра.

Леанід Валяр'янавіч часта ходзіць з ёй у краму, але Джэсі туды ўваход забаронены і таму гаспадар вымушаны пакідаць яе на вуліцы. Прывязваць жывёліну не трэба — будзе вельмі моцна гаўкаць. Дастаткова паказаць месца, і яна не зрушыцца, пакуль не падыдзе гаспадар. Аднойчы дачка Сяўко пакінула яе каля дзвярэй крамы, а сама пайшла купляць усё, што патрэбна. І забыла... Джэсі давялося чакаць гаспадыню больш за гадзіну, але з месца яна нават не кранулася — сядзела на прыступках пад дажджом там, дзе яе пакінулі.

І сама Джэсі можа схадзіць у ларок. Толькі вось прадаўцы ніяк не прывыкнуць да такой незвычайнай з'явы. Да таго ж, сабака — не з маленькіх, спалохацца можна. Хоць у сапраўднасці Джэсі нікога ніколі не пакрыўдзіла. Нават унукаў гаспадару гадаваць дапамагала.

Надзея Пушкарова, суседка Сяўко па пад'ездзе, гаворыць, што ўсе ўжо прывыклі да дворніка і яго сабакі:

— Бывае, выцягваеш каляску з пад'езда, дык Леанід Валяр'янавіч абавязкова дапаможа, і сабака заўсёды з ім. Джэсі то вядро нясе, то венік, то шуфлік падносіць. Яшчэ, бывае, і прадукты носіць. А працуюць яны выдатна — ніхто лепш за Сяўко і Джэсі двор не прыбярэ.

Дзіўна бачыць, як вуліцу прыбіраюць дворнік з сабакам, які ва ўсім стараецца дапамагчы гаспадару. Людзі ідуць міма, усміхаюцца, спрабуюць пагладзіць Джэсі. Толькі чамусьці смецця ад гэтай увагі менш не становіцца — прыйшлі, паглядзелі, падзівіліся і... кінулі паперку на зямлю. Няўжо нікому не становіцца сорамна, што за ім парадак наводзіць сабака? Гэта нібы папрок чалавеку за яго бездказнасць і няздольнасць прыбраць нават за сабою...

— Леанід Валяр'янавіч працуе ў нас са снежня мінулага года,— расказвае начальнік ЖЭС № 17 Алег Пруднікаў. — Да сваёй працы ставіцца вельмі адказна, на яго ўчастку заўжды парадак. Дапамагае яму сабака, і мы да яго прывыклі.. Дарэчы, многія жыхары трымаюць сабак, і паглядзеўшы, як працуе наш дворнік з Джэсі, стараюцца не смеціць.

Алена СКРЭБЕЦ.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

аўта аматар

Аўтаадказчык

**ДЗІЦЯЧАЕ

ЗОЛАТА ПАЭТА

У гэта цяжка паверыць, і ўсё ж факт: 10 кастрычніка паэту Леаніду Дранько-Майсюку спаўняецца 50.

«Як гэта недарэчна — калі паэту больш за 40 гадоў!» — прамовіў Леанід Васільевіч у час адной з даўніх нашых гутарак.

Тое інтэрв'ю запомнілася — і вось ужо чую ад калег (і не толькі): «Дык жа ці здолеў Дранько-Майсюк ласкава і канчаткова развітацца з паэзіяй?»

Ці здолеў?..

Неяк так атрымалася, што лейтматыў узроставай мяжы і ўвогуле ўзрост паэта (у самым шырокім сэнсе) у нашых гутарках набываў... статус яшчэ аднаго лірычнага героя — гэткага своеасаблівага «паэтычнага кілера». І з гадамі ён атрымліваў усё больш і больш спецыфічных характарыстык, яго вобраз вымалёўваўся больш ярка і нават мудрагеліста. Дый характар яго змяняўся, развіваўся, інтрыгаваў... Ну, чым не дэтэктыў?!

Вось што гаварыў паэт да сарака:

— Мусіць, меў рацыю Дастаеўскі, калі ў адным з раманаў напісаў: як гэта недарэчна — калі мужчына жыве больш за 40 гадоў. Пісьменнік не меў на ўвазе менавіта паэтаў, ён гаварыў увогуле, аднак... Калі набліжаецца гэтая ўзроставая мяжа, той рамантызм, які яшчэ прысутнічае ў душы, пачынае ўраўнаважвацца абачлівасцю. І гэтая абачлівасць не тое што з кожным годам, а з кожным месяцам, з кожным тыднем усё менш і менш робіць цябе паэтам — і нібыта схіляе да думкі: трэба мяняць жанр. Можна пісаць мемуары, прозу, лісты і г.д. Калі тонкія лірычныя струны пераходзяць у басовыя (незаўважна для цябе!), дык, мусіць, трэба ласкава развітацца з паэзіяй... Да 40 гадоў паэты (калі яны Паэты) пішуць лепшыя свае творы. А далей ужо пачынаецца не спеў, а крык...

Але жыццёвы вір няспынны, як вечны рухавік. Потым, калі паэту стукнула 40, мы зноў гутарылі. А «паэтычны кілер»... не, ён яшчэ не паспеў націснуць на курок.

І ўсё ж цікава было: Дранько-Майсюк па-ранейшаму пераканаць, што паэту не можа быць больш за 40?

— Некалі я так прамовіў, думаючы пра сябе, пра свой узрост, — а шмат хто з калег пакрыўдзіўся... Шкада, што ніхто з уяўных і адкрытых апанентаў не зразумеў: калі я казаў пра «ўзрост паэта», гаворка ішла толькі пра мяне самога. Гэта я сябе не мог уявіць у такой паэтычна-узроставай якасці!

— Дык вы развітваецеся з паэзіяй?

— Гэта не развітанне, а своеасаблівая падрыхтоўка да нейкага новага жыцця — магчыма, нават жыцця творчага. Бо што такое 40 гадоў у маім разуменні? 40 гадоў — гэта дзяцінства старасці, 50 — гэта юнацтва старасці, 60 — маладосць старасці, 70 — сталасць старасці, 80 — старасць старасці...

На гэты раз я не задавала пытанне пра «паэтычнага кілера». І зусім не таму, што ўжо пайшоў бы «перабор». Проста днямі прачытала апавяданне Леаніда Дранько-Майсюка «Анёлак і я». Паэзія ў прозе — мабыць, менавіта так можна сказаць пра гэты твор.

«Зрэшты, шмат што залежыць ад лёсу. О, гэты лёс — пантэон безназоўных багоў, якіх іншы раз не ўлагодзіш нават самай шчодрай ахвярай!».

...А нядаўна Леанід Васільевіч завітаў у рэдакцыю з новымі вершамі. Чытайце — і ўсё стане зразумела.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

МІФАЛАГІЧНЫЯ ВЕРШЫ

ляля



Фота Алы ТКАЧЭНКА.

Багіня Ляля, вясны багіня,
Цяпла багіня і гаспадыня,
Не маладзіца —
яшчэ дзяўчына,
Не дакранайся —
глядзі вачыма!

Куды пагляне —
Там сонца ўстане;
Як засмяецца —
Ручай прачнецца;
А скажа слова —
Пяе дуброва;
А пацалуе —
Душа танцуе...

Багіня Ляля, вясны багіня
На Нёмне,
Прыпяці і на Гарыні
Вяночкі дорыць,
частуе мёдам...
Красуня гэта
з-пад Вільні родам!

На Ганну гляне,
І добра Ганне.
Васіль у Ганны
Такі старанны.
Е грошы, дровы,
Быкі, каровы,
Зацірка ў місцы,
Дзіця ў калысцы...

Багіня Ляля, вясны багіня
Каханым шчодра пасцель раскіне
На поўнач ад Менска, на поўдзень ад Менска
І ад Беластока і аж да Смаленска!
30 сакавіка — 23 кастрычніка 2006

жыжаль

Нехта маніць, хлусіць —
Я ж вам не маню:
Тут, на Беларусі,
Жыжаль — бог агню.

Блішча, залацее,
Свеціць, а яшчэ
Добрае ён грэе,
Кепскае пячэ.

Пагарэўшы нішкам,
З долу рвецца ўвыш —
Жыжаль, Жыжа, Жыжка!
Неспакойны Жыж!

Не малы бажышка,
Не такі й стары ж —
Жыжаль, Жыжа, Жыжка!
Памяркоўны Жыж...
16 траўня — 28 кастрычніка 2006

пярун

За маланкаю маланка,
А за громам — большы гром...
Бліскавіца па-над ганкам,
Навальніца за сялом.

Скрозь такая сінізна —
Гэта фарба Перуна!
І з дубовае грады
Долу градам жалуды!

Яры тур за хмарай страшна
Рогам крышыць камяні,
Грукат доўжыцца працяжна,
Іскры сыплюцца, агні...

Зачыняйце вокны, дзверы,
Добра думайце пра лёс,
Бо ляцяць ужо сякеры
Перуновыя з нябёс.

Калі знойдзеце сякеру,
То Пярун вам дасць тады,
Не шкадуючы, без меры,
Моц на доўгія гады.
31 кастрычніка 2006

вялес

Кажа мужыкам Вялес:
«Не пускайце, мужыкі,
Вы кароў сваіх у лес,
Там іх паядуць ваўкі!
Не пускайце ж і быкоў,
І авечак, бараноў,
І ягнятак, і цялят,
І кабыл, і жарабят,
Коней, парасят, валоў
Не пускайце ў цёмны лес!..»
Гэтак просіць мужыкоў
Клапатлівы бог Вялес.

Не паслухалі яго —
Бога слаўнага таго,
Адпусцілі ў лес адных,
Не шкадуючы, сваіх
І каровак, і быкоў,
І авечак, бараноў,
І ягнятак, і цялят,
І кабыл, і жарабят,
Коней, парасят, валоў
Адпусцілі да ваўкоў,
І паелі іх ваўкі,
Бо дурныя мужыкі!

Я скажу вам без прынукі,
Калі маеце каня,
Ці якое там ягня,
То з Вялесавай навукі
Карыстайцеся штодня.
21 траўня — 31 кастрычніка 2006

дох

На дзвюх, на трох, на чатырох?!.
Відаць, ніхто не ведае,
На колькіх лапах скача Дох,
Як ходзіць ён, як бегае...

Глядзіць, напужаны, з кута,
Ці робіць міну важную,
І ці падобны на ката,
Ці на сабаку страшнага?..

А мо не лапы — капыты
Ён конскія падкідвае,
З кустоў зразаючы лісты
Хвастом, як вострай брытваю?..

Не ведае, напэўна, й Бог,
Заўважу тут дарэчы я,
Ці мае пысу гэты Дох,
Ці морду чалавечую?..

Аброс карою ці луской,
Ці шкураю сабакавай?
Жыве ў рацэ ці над ракой,
Ці ў пушчы ваўкалакавай?..

Мо тое гэтак?.. Мо не так?..
Пытанне за пытаннейкам...
Ды выкажу, нібы няўзнак,
Такое меркаваннейка:

Калі з рагамі галава,
Калі карона з рэшата,
Тады ягоны дом — дрыгва,
Што знікла не дарэшты тут.

Ён чорт і, пэўна, смерць сама!
І землякі як здорава
«Ах, Доха на цябе няма!» —
Гавораць так пра ворага.

А вораг той не божы грак,
Таму з душой адкрытаю
Ля Турава гавораць так
І ў Гарадку Давыдавым.
8 лістапада 2006

ДУГА, ЯКАЯ АБ'ЯДНОЎВАЕ ДЗЕСЯЦЬ КРАІН

Вёска Цюпішкі можа зацікавіць турыстаў. Тут, у адным з пунктаў геадэзічнай Дугі Струвэ, самай высокай кропцы Ашмянскага раёна (311 метраў над узроўнем Балтыйскага мора) уражыста адкрыты памятны знак.

Пад кіраўніцтвам выдатнага расійскага астранома, геадэзіста і матэматыка, заснавальніка і першага дырэктара Пулкаўскай абсерваторыі Георга Вільгельма (Васіля Якаўлевіча) Струвэ было праведзена першае дакладнае вымярэнне вялікага сегмента дугі зямнога меридыяна, што дазволіла вызначыць памер і форму нашай планеты. Дакладнасць разлікаў, якія былі зроблены больш чым 150 гадоў таму, пацверджана сучаснай спадарожнікавай праверкай. Дуга Струвэ мае працягласць 2820 кіламетраў і перасякае з поўначы на поўдзень дзесяць еўрапейскіх краін — Нарвегію, Швецыю, Фінляндыю, Расію, Эстонію, Латвію, Літву, Беларусь, Украіну і Малдову. Першапачаткова дуга складалася з 258 геадэзічных пунктаў, якія былі па-рознаму маркіраваныя на мясцовасці: паглыбленні ў скалах, жалезныя крыжы, піраміды з камення, закладзеныя ў зямлю каменныя кубы альбо спецыяльна ўстаноўленыя абеліскі. Аднак далёка не ўсе апорныя кропкі гэтай сеткі вучоным зацікаўленых краін удалося выявіць у ходзе пошукава-геадэзічных работ. Таму ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ўключаны 34 найбольш ацалелыя пункты, пяць з якіх, у тым ліку ў Цюпішках, знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны. А ўвогуле ў Беларусі на сёння знойдзены 21 пункт геадэзічнай Дугі Струвэ.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Тэлесеткі

Сняданак і караоке

У гэтым сезоне канал СТБ прадстаўляе два новыя твары. Зрэшты, персоны гэтыя гледачам даўно і добра вядомыя, проста менавіта на гэтым канале яны сталі новымі вядучымі.

Так, спявачка Вольга Плотнікава будзе ладзіць тэлегледачам «Вялікі сняданак», прычым фармат праграмы зменены, зараз вядучы ў ёй толькі адзін, а змест — больш «жаночы»: дыеты і элегантныя манеры, сакрэты спакушэння і прывабнасці. «Прапанову СТБ я прыняла практычна адразу — мне вельмі падабаецца, што праграма арыентаваная не толькі на жанчын, але і на ўсю сям'ю. А што можа быць у жыцці дараджэйшым за сям'ю і дзяцей? Тым больш, не так даўно я і сама стала мамай. Акрамя таго, у нас вельмі цікавыя госці — спецыялісты ў розных сферах, у якіх ёсць магчымасць многаму навучыцца», — падзялілася Вольга Плотнікава. Да апошняга моманту яна вельмі хвалявалася, баялася забыцца тэкст — але толькі камеры ўключыліся, як усё атрымалася быццам само сабой. У выніку праграма атрымала новы выгляд — не проста забаўка, а глянцавы тэлечасопіс з абавязковымі атрыбутамі жыцця «зорак» — гардэроб, сямейныя альбомы, рэцэпты поспеху. І разам з тым — хатняя атмасфера, гаворка за кубкам чаю, пакуль у суседнім пакоі гуляюць дзеці... Убачыць абноўлены «Вялікі сняданак» можна ўжо ў гэту нядзелю.

Спявачка, тэлевядучая і ўладальніца ўласнага святочнага бюро Ларыса Грыбалёва выбрала для сябе больш прывычны імідж — музычна-забаўляльнае шоў, названае «Прачніся і спявай». Здымкі першых двух выпускаў адбыліся днямі ў адным са сталічных клубаў. Удзельніцы прыпадтрымцы беларускіх артыстаў Іллі Міцько і Сашы Нэма выконвалі пад караоке песні розных жанраў — народныя, дзіцячыя, з кінафільмаў, з беларускай класікі і з музычнай спадчыны мінулых гадоў... Дарэчы, вядомая песня «Прачніся і спявай» таксама загучала па-новаму — яе спецыяльна для застаўкі праграмы запісаў добры дзесятак папулярных выканаўцаў. Цяпер кожная суботняя раніца на СТБ будзе напаўняцца пазітывам і пачынацца менавіта пад гэтым дэвізам — «Прачніся і спявай!».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Запрашаем да ўдзелу

«Coruc Chess Tournament» аб'явіў конкурс складання эцюдаў з пяццю грашовымі прызамі: 750, 500, 250, 150, 100 еўра. Астатнія лаўрэаты конкурсу будуць узнагароджаныя кніжнымі прызамі. Суддзя конкурсу — Йоахім Афек. Творы (не болей трох ад аўтара) дасылайце да 1 лістапада 2007 года на адрас: Harold von der Heijden, Michel de Klerkstraat 28, 7425 DG Deventer, Nederland. Вынікі будуць падведзены ў студзені 2008 года і атрымаюць іх усе ўдзельнікі.

ШАХМАТЫ

Юбілейны конкурс «Яўгену Дзвізаву — 70»

(Працяг. Пачатак у папярэднім шахматным выпуску)

№ 5. І. БОНДАР (Беларусь). «Звязда», Беларусь, 2007. Юбілей «Я. Дзвізаву — 70». 4 прыз.

Ход чорных. Нічыя (5+5).

1. ... Лg6+ 2. Крh1 Лg1+! 3. Кр:g1 С:a7+ 4. b6! С:b6+ 5. Лe3! С:e3+ 6. Крh2 Сb1! 7. Лa5+ Са7 8. Лa3! Кb4 9. Кb3 Сb8+ 10. Крg1 Са7+ 11. Крh2 — пазіцыйная нічыя.

№ 6. Б. СІДАРАЎ, Э. КУДЗЕЛІЧ (Расія). «Звязда», Беларусь, 2007. Юбілей «Я. Дзвізаву — 70». 5 прыз.

Ход чорных. Нічыя. (6+7).

1. ... Ке4! 2. Л:e4 g2 3. С:g2+ fg 4. Лf7+! Kf2+ 5. Л:f2+ Кр:f2 6. Kd3+ С:d3 7. Лg4 g1Ф 8. Л:g1 Cf5+ 9. Лg4 Се6 — пат са звязкай туры; 7. ... Cf1 8. Л:g2+ Крf3 — рэха-пат.

№ 7. Л. ТАПКО (Украіна). «Звязда», Беларусь, 2007. Юбілей «Я. Дзвізаву — 70». 6 прыз.

Нічыя. (4+5).

1. fe Лe3+ 2. Крf2 Лf3+ 3. Кре1 Лe3+ 4. Крf2 Лe2+ 5. Крf1 Л:d6 6. Л:d1 Лde6 7. e8Ф! Л:e8 8. Лd2! Л:d2 і пат.

№ 8. В. КАНДРАЦЬЕЎ (Расія). «Звязда», Беларусь, 2007. Юбілей «Я. Дзвізаву» — 70». 7 прыз.

Выйгрыш (4+5).

1. Kd3+ Крf1 2. Cg1! (2. Kd1+? Кре2 3.Kf3 g1Ф 4. Kf4+ Крf1 5. C:g1 C:f3+ і нічыя) Кр:g1 3. Kd2 h4 (3. ... Кph2 4. Kf3+ Крh3 5. Крf5 ~~ 6. Kf4x) 4. Крf4 h3 5. Кре3 h2 6. Ke4 Кр f1 7. K:g3+ Крg1 8. Ke4 Крf1 9. Kd2+ Крg1 10. Kf3+ Крf1 11. K:h2+ Крg1 12. Kf3+ Крf1 13. Kd2+ Крg1 14. Крf4 Крh2 15. Kf3+ Крh3 16. Kf2x.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.27	18.25	10.58
Віцебск —	7.18	18.13	10.55
Магілёў —	7.17	18.15	10.58
Гомель —	7.12	18.14	11.02
Гродна —	7.42	18.41	10.59
Брэст —	7.41	18.53	11.12

Месяц

Маладзік

Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Дзмітрыя, Ігната, Марка, Пятра;*

К. *Марыны, Паўліны, Францішка.*

Надвор'е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+11 — +13 °C	МАСКВА	+1 — +3 °C
ВІЛЬНЮС	+6 — +8 °C	РЫГА	+7 — +9 °C
КІЕЎ	+13 — +15 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+4 — +6 °C

Без ападкаў

10 кастрычніка

Дзве даты

732 год — 30-тысячнае войска пад камандаваннем каралеўскага мажардома Карла Мартэла (дзеда Карла Вялікага) у шматдзённай бітве паміж Турам і Пуацье атрымала верх над арабскім войскам эміра Абдарахмана аль-Гафікі. У ходзе бітвы мусульманскі палкаводзец загінуў, а ягонае войска не змагло стрымаць націск праціўніка і рассыпалася. Тая перамога стала паваротным пунктам у еўрапейскай гісторыі: удалося спыніць арабаў, якія да пачатку VIII стагоддзя захапілі амаль увесь Пірэнейскі паўвостраў і пачалі экспансію ва ўнутраныя вобласці цяперашняй Францыі — сарацыны ўжо выходзілі на старую рымскую дарогу, што вяла да Арлеана і Парыжа. Фактычна так было выратавана заходнееўрапейскае хрысціянства. Карл Мартэла па мянушцы «Молат» з таго часу лічыцца бацькам рыцарства.

1907 год — у Вільні заснавана выдавецтва «Наша ніва». Выдавала мастацкую, навукова-папулярную і сельскагаспадарчую літаратуру, календары. Выдала некалькі зборнікаў мастацкіх твораў, надрукаваных у газеце «Наша ніва», а таксама пераклады на беларускую мову аповесці Эж Ажэшка, брашуры «Як багацеюць чэшскія сяляне» Маліноўскага, «Зямельная справа ў Новай Зеландыі» Тройцы, «Беларускі каляндар-кнігу» (1910—1913 гг.), у 1912 годзе выдавала газету «Саха».

Цытата дня:

«Няхай твая мэта будзе большай за твае магчымасці: тады твая сённяшняя справа будзе лепшай за ўчарашнюю, а заўтрашняя — лепшай за сённяшнюю».

Амін Фарыс Рэйхані (1876—1940), ліванскі пісьменнік.

УСМІХНЁМСЯ!

Круціцца дзяўчына перад люстэркам і сама сабе кажа:

— Вой, хутчэй бы замуж выйсці, так надакучыла прыбірацца ды прыхарошвацца....

☺

На экзамене. Экзаменатар:

— Дык вы ж нічога не ведаеце!

Студэнт:

— Ну, давядзецца тры стаўіць.

☺

Навіны касманаўтыкі: як паведамлялася раней, арбітальная станцыя «Планета» ўпала ў зададзеным раёне. Зададзены раён удакладняецца.

☺

Рабіновіч нервова ходзіць перад сваім домам, пазіраючы на гадзіннік. Тлумачыць суседу:

— Хвалююся за Сару.

— А што з ёй?

— З ёй мой аўтамабіль...

На конкурс апавяданняў

Гісторый, падобных на гэту, у памяці народа — незлічона. Ці не кожны, жывучы на свеце, мае яе наўме. Але вялікая загадка: яны, гэтыя павучальныя гісторыі, ніколі і нікога не вучаць. Паўтараюцца і паўтараюцца і ў часе, і ў людзях. І ці не таму, што яны адметныя праўдай, адзінай і адвечнай.

Віктар КАЗЬКО.

Аліна ЛАТЫШ

ЦЫГАНКА ГАДАЛА...

Не збірайце сабе скарбаў на зямлі, дзе моль і іржа есць... А збірайце сабе скарбы на небе...

Ніхто не бачыў, каб Яніна сядзела калі склаўшы рукі. І ў будныя дні, і ў святы яна шчыравала каля хаты, на агародзе, у хляве. У поўдзень з даёнкай бегла на поле, каб падаіць трох кароў — менш не трымала. Падоіць, вылье малако ў бітон малаказборшчыку — і бягом дадому. Адна спраўлялася з сенам. Праўда, касіць наймала гаспадароў з мужчын. Сушыла, варочала. Вечарам, ноччу посцілкамі зносіла ў хлеў. Да цемры складала капешкі. Цямнее, а на лузе па-ранейшаму мітусіцца яе постаць у чорным. Многія, шкадуючы яе, раілі:

— І навошта табе столькі жывёлы? Любіш малако — трымай адну карову. Дзе грошы дзенеш? Навошта табе адной так пеклаваць?

Яніна толькі зіркала на дарадчыц з-пад навіслых броваў, захінала пад хустку пасмы валасоў і, аддыхаўшыся, мовіла:

— А мне цыганка ў маладосці гадала. Сказала, што я пражыву сто гадоў. Што калі буду шмат працаваць, стану багатай. І перааду ў вялікі горад.

— Калі ж табе ўжо ў горад пераязджаць? За 70 перакуліла. Можа, ужо хопіць збіраць багацце?

— А ты не лічы маё багацце, — агрызалася Яніна. — Я сама як-небудзь гэта зраблю. Цыганка памыліцца не магла...

І Яніна зноў бралася за працу. А думкамі вярталася ў маладосць...

Было гэта яшчэ пры Польшчы, у канцы 30-х. Яніна толькі ўбіралася ў дзеўку. У канцы верасня ішла разам з дзяўчатамі на фэст у касцёл. І раптам усе яны спынілі ся, уражаныя: ля рэчкі размясціўся цыганскі табар. Стаялі тры кібіткі, пасвіліся коні. На двух вогнішчах штосьці варылася ў кацялках. Цыганяткі голымі поўзалі па траве. Дзяўчаты здрыгануліся: канец верасня, усе яны ў жакетках і хустках. Няўжо малым не холадна?

Да іх наблізілася маладзіца з дзіцем на руках:

— Хочаце, пагадаю? Усю праўду раскажу, не пашкадуеце. Магу на картах, магу на руцэ...

Дзяўчаты кінуліся наўцёкі. А Яніна засталася, ногі як прыраслі да зямлі. І было цікава. У кішэні жаке ў горадзе? Напэўна, у яе будзе шмат прыгожага адзення. Як у дачок пісара, з якімі яна вучылася ў адным класе і якія часта пакеплівалі з яе адзінай просценькай сукеначкі. Ёй і яе сёстрам сукенкі шылі толькі раз на год — перад Вялікаднем. Калі загразняцца, маці



кеткі ляжалі грошы, маці дала ў касцёл на ахвяру. Яніна дастала іх і працягнула маладзіцы:

— Вось усё, што я маю...

Цыганка схавала грошы ў кішэню, потым паглядзела на Янініну далонь, зазірнула ў вочы:

— А ты смелая. Шчаслівая будзеш. Праўда, мужа не бачу. Але калі папрацуеш шмат, станеш багатай. І жыць пераедзеш у вялікі горад...

Яніна як на крылах бегла да касцёла. Дзяўчаты былі ўжо там. Скубанула за рукаў адну сяброўку, другую — далі па грошу ёй на ахвяру. Але ні малітваў, ні казання ў гэты дзень яна не чула. Ледзь дачакалася канца службы. У галаве адна думка — «Стану багатай...».

Галоўным багаццем у іхняй вёсцы была зямля. Янінін бацька быў, хутчэй, бедным. Праўда, без хлеба не сядзелі. Бацька наймаўся да заможных то малаціць, то сажалкі капаць, то дровы нарыхтоўваць. Так і перабіваліся. Добра што дзяцей у сям'і не шмат: Яніна і дзве малодшыя сястры. А якое ж багацмыла іх пасля абеду, калі дочкі прыходзілі са школы. Вешала нанач каля шчытка, каб да раніцы высахлі. Раніцай папрасуе — і зноў дочкі фарсяць у іх.

Ежа ў багатых таксама іншая. Не так, як у іх хаце: бульба з салёнымі агуркамі ці булён на вячэру. А ў школу на абед — лустачка хлеба...

Бацькі і сёстры, калі даведаліся пра гаданне, толькі паўсміхаліся: «Багацейка...»

Вайна прамінула іх сям'ю: бацька быў стары, на фронт яго не забралі. Хутка пасля вайны малодшая сястра выйшла замуж за ўдаўца, які прыязджаў у камандзіроўку з горада, пасля вяселля стала гараджанкай. Яніна разам з сярэдняй сястрой працавалі ў калгасе, даглядалі бацькоў. Потым аплакалі і пахавалі іх. За бацькамі хутка пайшла і сярэдняя сястра, яна з дзяцінства была хваравітай.

І Яніна засталася адна. Раз на год, звычайна летам, тыдні на два прыязджала сястра з горада. Дапамагала па гаспадарцы: палола градам, сушыла сена. Бывалі на канікулах пляменнікі. Але ад іх звычайна было больш пустак, чым карысці. І хоць яна вельмі любіла сястру і яе дзяцей, вальней адчувала сябе адна. Прывыкла да адзіноты. У вёсцы многа было такіх, як яна, векавух, яны хоць зрэдку хадзілі то ў кіно, то ў касцёл ці царкву. Яна ж у будні і ў святы ведала толькі адно: праца.

Часта, асабліва пад старасць, гледзячы на пляменнікаў, яна думала пра тое, што і ў яе маглі быць свае дзеці. Але ўжо позна пра гэта думаць. Што з воза ўпала, тое прапала. Ды і як гэта? Дзіця без мужа? На яе б пальцамі паказвалі не толькі ў вёсцы, але і ў мястэчку. Бацькі з хаты выгналі б, каб нарадзіла бахура.

Ды і як з дзіцем станеш багатай? Яму ж і адзення вунь колькі трэба было б, і ежа добрая, і ласункі кожны дзень купляй. Сама яна абыходзілася малаком, бульбай ды хлебам. Летам і восенню агуркі ды памідоры дапаўнялі ёе няхітры харч. І не было асабліва часу, каб вывярваць штосьці сабе. Увесь час імкнулася зарабіць якую капейчыну. У нядзелю зранку бегла ў мястэчка з маслам, смятанай, яйкамі, усё на продаж.

Ці мылася яна калі? Можа, толькі ў вялікія святы, калі ўспамінала бацькоўскія наказы, што грэх у такі дзень працаваць. Летам твар яе быў чорны, можа, ад загару. А вось чаму зімой не сыходзіла з яго чарната?

Аднойчы ў яе жыцці з'явіўся мужчына. Стары халасцяк з іхняй вёскі, старэйшы за яе гадоў на пятнаццаць. На вайну яго не ўзялі па хваробе, жыў адзін пасля смерці маці. Яму даўно патрэбна была гаспадыня. Пачаў прыходзіць па нядзелях. Пасядзіць, падымціць махоркай, пагаманіць пра тое-сёе — і пайшоў дахаты. А ў наступную нядзелю прыходзіць зноў. Яніна і прывыкаць ужо стала да такога ўхажора, падумала ўжо, што, можа, і спатрэбіліся б яго рукі ў гаспадарцы: ці сена накасіць, ці плот адрамантаваць, ці кароў папасвіць. Думала пра яго як пра работніка — якая там любоў? Дзяцей ужо ўсё роўна не будзе — ёй 50 мінула.

Ды ўсё парушыў сам кавалер. Прыйшоў аднойчы на моцным падпітку. На стол паставіў бутэльку самаробнага віна. І ўрачыста абвясціў:

— Ну, Янінка, рашыўся, так і быць, ажанюся з табой. Здаём твае кароў, цялят парэжам — і будзем жыць спакойна. Колькі нам тут засталося? — і зацягнуў сваю любімую песню: — «Когда б имел златые горы...»

Яніна ўскіпела. Аж сэрца ходырам захадзіла і рукі затрэсліся. Не такія залатыя горы яна чакала.

— Разявіўся на маё дабро? Каровы мае табе замінаюць? А ну вон адсюль разам са сваім пойлам! Жаніх знайшоўся! — і калі ён пераступіў парог, кінула яму ўслед бутэльку віна...

Пад тую сваю 71-ю восень прыслабела, стала хутка стамляцца, з'явілася задышка. Каб палегчыць сябе, здала адну карову.

***

У пачатку зімы суседка, праходзячы каля яе дома, здзівілася: у такой ашчаднай, нават скупой Яніны днём гарыць святло. Зразумела бяду толькі раніцай наступнага дня, калі пачула роў някормленай і нядоенай жывёлы з суседчынага хлява. Святло ў хаце гарэла па-ранейшаму. Пабеглі з мужам — дзверы знутры зашчэплены, ніхто не адгукаецца. Выклікалі міліцыю.

Калі міліцыянеры прыехалі і ўзламалі дзверы, на падлозе ўбачылі мёртвую Яніну. На яе было страшна глянуць: твар абгрызлі галодныя каты. Вочы, шырока адкрытыя, з дакорам глядзелі ўверх, у неба: «Чаму ж мяне падманулі?».

Знайшлі канверт з адрасам сястры, далі тэлеграму. Яна прыехала адна, без пляменнікаў. Пасля жалобнага стала сястра разам з суседкай стала разбіраць шафы. На падлогу вытрасалі кавалкі шоўку, ручнікі, бялізну, паліто, футры. Большасць рэчаў была ўжо ў такім стане, што толькі кідай у агонь. Іншае, больш-менш прыдатнае, сястра складала ў мяшкі, каб пасля забраць сабе ў горад.

Праз некалькі дзён знайшліся купцы на кароў, на мэблю і на хату. Сястра паехала, паабяцаўшы суседцы вярнуцца на машыне па багацце — мяшкамі з анучамі. Прайшоў год — суседка напісала ў горад пісьмо. Адказу не было. Можа, захварэла, таксама ж немаладая. Напісала другое — зноў маўчанне. Перабрала мяшкі, горшае выкінула на вясновае вогнішча разам з іншым смеццем. А лепшае і да гэтага часу ляжыць...

г. Пастравы.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.517 Індэкс 63850. Зак. № 5522. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12